# Грамадазнаўства



11
клас

# Станаўленне інфармацыйнай цывілізацыі

## Грамадскае развіццё

### Прагрэс

- Навукова-тэхнічны
  - Эвалюцыйны
  - Рэвалюцыйны → Навукова-тэхнічная рэвалюцыя
- Духоўна-маральны → Гуманізм

### Рэгрэс

## Падыходы да развіцця

### Фармацыйны

### Стадыяльны

### Цывілізацыйны

### Тэхналагічны

- Даіндустрыяльная хваля
- Індустрыяльная хваля
- Постіндустрыяльная хваля

## Цывілізацыя

### Этап развіцця → Інфармацыйнае грамадства

### Асобнае грамадства

- Культура
- Традыцыі
- Рэлігія

## Інфармацыйнае грамадства

- Лічбавая эканоміка
- Электронная дэмакратыя
- Сеткавая камунікацыя
- Віртуальны вольны час

### Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі

- Палітычныя сувязі
- Эканамічныя сувязі
- Сацыяльныя сувязі
- Культурныя сувязі

## Глабалізацыя → Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі

# Беларусь у сусветным супольніцтве

## Краіны свету

- Геаграфічнае становішча
- Прыродна-кліматычныя асаблівасці
- Узровень эканамічнага развіцця
- Палітычнае развіццё
- Культура і традыцыі

### Індэкс чалавечага развіцця ААН

- Вельмі высокі
- Высокі
- Сярэдні
- Нізкі

### Міграцыйная мабільнасць

## Устойлівае развіццё

Эканамічнае

Сацыяльнае

Экалагічнае

### 5P

- People — Людзі
- Prosperity — Росквіт
- Peace — Мір
- Partnership — Партнёрства
- Planet — Планета

### 17 мэт

## Геапалітыка і нацыянальныя інтарэсы

- Незалежнасць і суверэнітэт
- Устойлівае развіццё
- Высокі ўзровень і якасць жыцця
- Інфармацыйныя тэхналогіі

### Шматпалярнасць свету

## Міжнародныя адносіны

### Шматвектарнасць знешняй палітыкі

### Міжнароднае права

Гуманітарнае права

### Міжнароднае супрацоўніцтва

- Палітычнае
- Эканамічнае
- Дыпламатыя

- Міжнародныя арганізацыі
  - Арганізацыя Аб’яднаных Нацый
- Міждзяржаўныя аб’яднанні

# Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь

## Канстытуцыйнае права

**Канстытуцыя**

- Асноўны Закон
- Вышэйшая юрыдычная сіла
- 15 сакавіка 1994 г.



## Выбарчае права

- Усеагульнае
- Свабоднае
- Прамое/ускоснае
- Роўнае
- Тайнае галасаванне

**Выбары і рэферэндумы**

## Сямейнае права

**Правы мужа і жонкі**

**Правы бацькоў і дзяцей**



## Грамадзянскае права

**Здзелка і дагавор**

**Фізічная і юрыдычная асоба**

**Праваздольнасць і дзеяздольнасць**

## Адміністрацыйнае права

**Адміністрацыйнае правапарушэнне** → Спагнанне



## Працоўнае права

**Правы работніка і наймальніка**

**Працоўны дагавор**

- Бестэрміновы
- Тэрміновы (кантракт)

## Органы законнасці і правапарадку

- Суды
- Пракуратура
- Органы ўнутраных спраў
- Органы дзяржаўнай бяспекі
- Пагранічныя і мытныя органы
- Следчы камітэт
- Органы юстыцыі

## Крымінальнае права

**Злачынствы**

Пакаранне

**Прэзумпцыя невінаватасці**

# Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы

## Сацыяльная палітыка

**Дэмаграфічная**
- Нараджальнасць і смяротнасць
- Працягласць жыцця
- Міграцыя

**Маладзёжная**
- Рэалізацыя патэнцыялу моладзі
- Падтрымка маладых людзей

**Нацыянальная**
- Нацыянальная згода і ўзаемапавага

**Канфесійная**
- Свабода сумлення і веравызнання
- Верацярпімасць

**Гендарная**
- Дасягненне роўнасці мужчын і жанчын
- Гендарны баланс

## Інавацыйнае развіццё

**Інавацыі**
- Паляпшальныя
- Радыкальныя

**Нацыянальная інавацыйная сістэма**

Высокія тэхналогіі

## Развіццё рэгіёнаў

**Раўнамернае развіццё**

**Інфраструктура**

**Гісторыка-культурная спадчына**

## Культура
- Музеі
- Тэатры
- Кінематограф
- Фестывалі
- Сусветная спадчына ЮНЕСКА

## Ахова здароўя
- Прафілактыка
- Лячэнне
- Рэабілітацыя

## Спорт і турызм
- Спорт найвышэйшых дасягненняў
- Фізічная культура

**Здаровы лад жыцця**

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам
для павышанага ўзроўню)

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2021

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 3(075.3=161.3)
ББК 60я721
Г76

**Аўтары:** В. І. Чупрыс (§ 16), С. А. Балашэнка (§§ 11—12), Н. П. Дзенісюк (§§ 1—5), С. А. Калінін (§§ 11—12), Т. М. Кісялёва (§§ 11—12), М. П. Караткевіч (§ 14), Т. М. Міхалёва (§§ 6—10), Т. М. Петачэнка (§ 15), В. Я. Пабярэжная (§§ 19—20, §§ 22—23), У. В. Падкапаеў (§ 21), А. А. Салей (§ 13), А. В. Шыдлоўскі (§§ 17—18)

**Метадычны апарат:** А. А. Палейка, Н. В. Кушнер, І. П. Бернат

Пераклад з рускай мовы Т. В. Басалыгі, Г. М. Федаровіч

**Рэцэнзенты:** метадычнае аб'яднанне настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства Глускага раёна Магілёўскай вобласці (дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія г. п. Глуска», настаўнік грамадазнаўства кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» *С. Я. Сяргееў*); кандыдат палітычных навук, дацэнт кафедры міжнародных адносін, дэкан факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дацэнт *А. А. Дастанка*; выкладчык вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі філіяла «Мінскі радыётэхнічны каледж» установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» *В. С. Саўчанка*; кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі ўніверсітэцкай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» *Д. Р. Дабрародні*

Электронны дадатак размешчаны на рэсурсе http://profil.adu.by

**Успамінаем вывучанае**

**Рашаем задачу, разбіраем сітуацыю**

**Персона ў навуцы**

**Ідэі для міні-праектаў**

**Абмяркоўваем і дыскутуем**

**Пытанні і заданні**

**Пошук**

ISBN 978-985-599-415-3

© Басалыга Т. В., Федаровіч Г. М., пераклад на беларускую мову, 2021
© Афармленне. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2021

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Уводзіны

## Устойлівае развіццё — ідэал прагрэсу XXI стагоддзя

У 11 класе вы будзеце вывучаць сучасную цывілізацыю, асновы права, знешнюю і ўнутраную палітыку Рэспублікі Беларусь.

Сучаснае чалавецтва валодае вялікім аб'ёмам ведаў, гістарычным вопытам, уражальнымі тэхнічнымі дасягненнямі, але пры гэтым стаіць перад тварам шматлікіх глабальных праблем, ад вырашэння якіх залежыць не толькі прагрэс чалавецтва, але і яго выжыванне. Праблемы дэмаграфіі, голад і галеча, непісьменнасць, беспрацоўе, гонка ўзбраенняў, забруджванне навакольнага асяроддзя і змяншэнне прыродных рэсурсаў, супярэчнасці паміж багатымі і беднымі краінамі, тэрарызм...

У 2015 г. дзяржавы — члены ААН прынялі Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 г. Ён змяшчае 17 Мэт устойлівага развіцця, накіраваных на ліквідацыю галечы, захаванне рэсурсаў планеты і забеспячэнне дабрабыту для ўсіх. Мэты ўстойлівага развіцця — гэта стратэгія ўсяго чалавецтва, накіраваная на тое, каб будучаму пакаленню перадаць планету ў добрым стане і сфарміраваць умовы для развіцця грамадства, эканомікі і экалогіі.

Аптымістычна настроеныя мысліцелі XX ст. у вырашэнні глабальных праблем чалавечай цывілізацыі ўскладалі вялікія надзеі на інтэлект, навуку, тэхніку і тэхналогіі. Аднак, як паказала гісторыя, розум і веды самі па сабе не з'яўляюцца ні дабром, ні злом. Усё залежыць ад таго, якой мэце яны служаць. Толькі дзякуючы маральнай дабрачыннасці розум становіцца крыніцай дабра.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Усё больш сучасных мысліцеляў сыходзяцца ў меркаванні, што прадухіліць дэградацыю чалавецтва можна толькі дзякуючы яго маральнаму ўдасканаленню, пераадоленню эгаізму, эгацэнтрызму, спажывецкага стаўлення да прыроды. Чалавек, калі ён хоча своечасова і адэкватна рэагаваць на новыя выпрабаванні, павінен пастаянна паляпшаць свае разумовыя, фізічныя здольнасці і маральныя якасці.

Устойлівае развіццё сучаснай цывілізацыі немагчыма без узмацнення ўзаемаразумення паміж людзьмі. Калі чалавецтва сапраўды імкнецца вырашыць глабальныя праблемы, для гэтага неабходны пастаянны дыялог людзей розных культур, светапоглядаў, рэлігій, маральных традыцый.

Выступаючы ў 2015 г. на саміце ААН па ўстойлівым развіцці, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка адзначыў: «Толькі ўзаемаразуменне і адказнасць, усведамленне разнастайнасці сусветнага супольніцтва, аднаўленне даверу дапамогуць усім нам аб’яднацца, гарантаваць мір і бяспеку, знайсці эфектыўныя адказы на глабальныя выклікі і пагрозы».

Для таго каб такі сусветны парадак стаў рэальнасцю, неабходны намаганні не толькі прафесійных палітыкаў, але і мільёнаў радавых грамадзян, якія ўсведамляюць агульную адказнасць за лёс чалавецтва, за будучыню сваіх краін, народаў. Дзейнічаючы разрознена, гэтыя складаныя задачы не вырашыць.

Рэспубліка Беларусь прымае актыўны ўдзел у распрацоўцы Парадку-2030 і ўзяла на сябе абавязацельствы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

За гады суверэнітэту наша краіна дасягнула поспехаў у розных галінах. Яна з’яўляецца паўнапраўным суб’ектам сусветнага супольніцтва, праводзячы шматвектарную міралюбную знешнюю палітыку. У краіне паспяхова развіваюцца традыцыйныя галіны эканомікі, такія як машынабудаванне, хімічная прамысловасць, сельская гаспадарка, і фарміруюцца новыя — атамная, біяхімічная, касмічная. Сёння на арбіце паспяхова працуюць беларускія



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

спадарожнікі, у тым ліку створаныя студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.



Разгледзьце ў галерэі Язэпа Драздовіча фантастычныя пейзажы Месяца, Сатурна, Марса, якія былі створаны ў 30—40-я гг. XX ст. Якія ідэі геніяльнага беларускага мастака сёння сталі рэальнасцю?

Народ Беларусі можа ганарыцца дасягненнямі ў галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту. Наша краіна стабільна займае высокія месцы ў рэйтынгу Індэкса чалавечага развіцця. Сёння Беларусь — сучасная краіна, дзе камфортна і бяспечна жыць.

Пры гэтым заўсёды трэба памятаць: нельга спыняцца ў сваім развіцці, будучыня не ўзнікне сама па сабе. Яе трэба будаваць нам, тут і зараз, у супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні з сусветным супольніцтвам. Адказнасць за лёс краіны ляжыць на кожным з нас.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Як працаваць з вучэбным дапаможнікам?

Як і ў 10 класе, у дадзеным дапаможніку шырока выкарыстоўваюцца візуальныя матэрыялы, прапануюцца разнастайныя заданні на пошук і праверку інфармацыі з розных крыніц, абмеркаванне праблемных пытанняў, рашэнне практычных задач і жыццёвых сітуацый, выкананне міні-праектаў і даследаванняў.

Да кожнага з чатырох раздзелаў вучэбнага дапаможніка прапануецца ўступная схема, у якой адлюстраваны асноўныя пытанні да тэм, што вывучаюцца. Абавязковыя для засваення паняцці, якія першы раз тлумачацца ў тэксце параграфаў, вылучаны **тлустым шрыфтам**. Пасля кожнага параграфа прапануюцца пытанні і заданні для самакантролю, акрамя таго, у тэксце параграфа вы знойдзеце шмат пытанняў і заданняў на разуменне і інтэрпрэтацыю інфармацыі, якая ў ім змешчана. У канцы кожнага раздзела знаходзяцца матэрыялы для ўрокаў абагульнення, у якіх прадстаўлены пытанні і заданні для паўтарэння, сістэматызацыі і абагульнення ведаў па вывучаным матэрыяле раздзела і падрыхтоўкі да кантролю ведаў па ім. Таксама ў матэрыялах для ўрокаў абагульнення прапануюцца тэмы для эсэ.

У параграфах вучэбнага дапаможніка вы сустрэнеце розныя рубрыкі. Для актуалізацыі ведаў па тэме, што вывучаецца, у рубрыцы «Успамінаем вывучанае» прапануюцца пытанні не толькі па грамадазнаўстве, але і па гісторыі, геаграфіі, літаратуры і іншых вучэбных прадметах. У рубрыцы «Персона ў навуцы» звяртаецца ўвага на ідэі і працы вучоных, якія ўнеслі істотны ўклад у развіццё навук аб грамадстве: увялі новыя навуковыя паняцці, стварылі навуковыя тэорыі і школы. Матэрыялы дадзенай рубрыкі будуць карысныя пры рабоце з заданнямі ў параграфе, выбары тэмы для напісання эсэ, падрыхтоўцы паведамленняў. Выконваючы заданні рубрыкі «Пошук», вы навучыцеся шукаць і правяраць дакладнасць інфармацыі па тэме заняткаў са сродкаў масавай інфармацыі, этычна і бяспечна яе выкарыстоўваць. Рубрыка «Абмяркоўваем і дыскутуем» утрымлівае актуальныя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дыскусійныя тэмы і праблемныя пытанні, а ў рубрыцы «Рашаем задачу, разбіраем сітуацыю» прапануюцца для разгляду вучэбныя і практычныя задачы, жыццёвыя сітуацыі. Для развіцця ўменняў праектавання і работы ў камандзе ў дапаможніку прапануюцца ідэі міні-праектаў, якія можна выконваць як у групах, так і індывідуальна. У дапаможніку вы таксама сустрэнеце заданні з QR-кодамі, для якіх патрабуецца смартфон ці планшэт для адкрыцця спасылак і прагляду кантэнту. Звяртаем увагу, што пошукавыя заданні, работа з QR-кодамі і выкананне міні-праектаў з'яўляюцца заданнямі на выбар, якія робяць працэс навучання больш займальным і практыкаарыентаваным.

Для тых, хто вывучае грамадазнаўства на павышаным узроўні, створаны электронны дадатак на рэсурсе http://profil.adu.by. Пераход па спасылцы на матэрыялы павышанага ўзроўню ў вучэбным дапаможніку абазначаны спецыяльным сімвалам ⬆, а таксама QR-кодам для работы з электронным дадаткам са смартфона.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# I Станаўленне інфармацыйнай цывілізацыі

## 1 Што такое?

- Прагрэс
- Цывілізацыя
- Глабалізацыя

## 2 Як развіваецца?

- Цывілізацыя
- Тэхніка і тэхналогія
- Інфармацыйнае грамадства

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Традыцыйнае і індустрыяльнае грамадства
- Гуманізм і гуманнасць
- Постіндустрыяльнае і інфармацыйнае грамадства

## 4 Як узаемазвязаны?

- НТР і прагрэс
- Тэхніка і гуманізм
- Глабалізацыя і суверэнітэт

## 5 Якія вылучаюцца?

- Цывілізацыі
- Стадыі развіцця грамадства
- Выклікі і пагрозы для чалавецтва

## ? Думай глабальна, дзейнічай лакальна?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 1. Прагрэс і рэгрэс у сацыяльным развіцці

## Асноўны крытэрый прагрэсу — гуманізм?






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Грамадскі прагрэс і яго крытэрыі.** Чалавечае грамадства як складанаарганізаваная сістэма, здольная да самаразвіцця, характарызуецца вялікай разнастайнасцю сацыяльных структур і сістэм, а таксама выключнай дынамічнасцю і альтэрнатыўнасцю развіцця. У навуцы важнае месца займае праблема накіраванасці змен, якія адбываюцца ў грамадстве, ідэя прагрэсіўнага развіцця грамадства.

**Прагрэс** (ад лац. *progressus* — рух наперад) — паступальны рух да лепшага, больш складанага, дасканалага, ад ніжэйшых ступеняў да вышэйшых. Грамадскі прагрэс — гэта пераход ад менш дасканалых форм чалавечай дзейнасці да больш дасканалых. Паступальнае развіццё азначае не толькі колькасныя, але і якасныя змены, з'яўленне новых спосабаў арганізацыі грамадскага жыцця для дасягнення ўсеагульнага дабрабыту і росквіту. Напрыклад, прагрэсіўным змяненнем з'яўляецца адмена сістэмы грамадскіх стасункаў, пры якіх дапускаецца знаходжанне чалавека (раба, прыгоннага) ва ўласнасці ў іншага чалавека (гаспадара, рабаўладальніка, уладара) ці дзяржавы.

Амерыканскі сацыёлаг Роберт Нісбет у сваім даследаванні «Прагрэс. Гісторыя ідэі» (1980) вызначае прагрэс як ідэю пра тое, як «чалавецтва павольна, паступова і доўга выпаўзала з першапачатковых умоў страху, адсутнасці культуры, невуцтва, падымаючыся да больш высокага ўзроўню развіцця». ■

Усялякі прагрэс прадугледжвае змяненне, развіццё, але не ўсялякае развіццё з'яўляецца прагрэсам. **Рэгрэс** (ад лац. *regressus* — вяртанне, рух назад) — пераход ад больш высокіх форм развіцця да ніжэйшых, рух назад, дэградацыя, змены да горшага.

Бесперапыннае ўдасканаленне і рух у напрамку сацыяльнага прагрэсу з'яўляецца ўніверсальным законам чалавецтва. Аднак гэта не значыць, што ў гэтым руху не бывае рэгрэсу, адкатаў назад.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рэгрэс часта носіць лакальны характар. Не ўсе краіны і рэгіёны развіваюцца раўнамерна, аднымі і тымі ж тэмпамі. Ёсць краіны, дзе дзесяцігоддзямі назіраюцца рэгрэсіўныя працэсы. Як правіла, у такіх краінах ідзе жорсткая барацьба за рэсурсы і ўладу, дзейнічаюць тэрарыстычныя арганізацыі, вядуцца грамадзянскія войны.

У розных краінах у залежнасці ад канкрэтных палітычных абставін, сацыяльна-эканамічных умоў, культурных традыцый па-рознаму (эвалюцыйным або рэвалюцыйным шляхам) ажыццяўляюцца неабходныя для грамадства пераўтварэнні.

З дапамогай прыкладаў растлумачце, як гістарычныя падзеі ілюструюць супярэчлівасць і нераўнамернасць грамадскага прагрэсу. Правядзіце міні-даследаванне прагрэсіўнасці развіцця грамадства на прыкладзе падзей аднаго года з гісторыі XXI ст. ■

Пры вывучэнні сацыяльных працэсаў часта ўзнікае праблема іх ацэнкі як прагрэсіўных ці рэгрэсіўных, што звязана з пытаннем аб крытэрыях сацыяльнага прагрэсу. У розныя гістарычныя эпохі вучоныя, якія вывучалі грамадскае развіццё, прапаноўвалі такія крытэрыі, як павышэнне ўзроўню асветы, культуры, маральнасці, павелічэнне ступені свабоды асобы ў грамадстве, развіццё прадукцыйных сіл, тэхнікі, эканамічны рост. Яны не страцілі свайго значэння і сёння. Аднак асэнсаванне трагічных падзей XX ст. і глабальных, жыццёва важных для ўсяго чалавецтва праблем у XXI ст. ставіць пытанне аб новых крытэрыях сацыяльнага прагрэсу. Сёння вучоныя асабліва вылучаюць праблему суадносін навукова-тэхнічнага і духоўна-маральнага прагрэсу.

Пачатак тэхнічнага прагрэсу адносіцца да з'яўлення каменных прылад працы. *Тэхніка* (ад грэч. *τεχνικός* — мастацтва, майстэрства, уменне) — гэта ўся сукупнасць сродкаў, з дапамогай якіх чалавек уздзейнічае на прадмет працы ў працэсе



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вытворчай дзейнасці. Тэхніка з’явілася раней за навуку, што рабіла прагрэс тэхнічным, пакуль ён грунтаваўся на эмпірычным вопыце людзей. З’яўленне навукі як сферы адмысловай дзейнасці, накіраванай на пазнанне свету, робіць прагрэс навукова-тэхнічным.

Як узаемазвязана прамысловая рэвалюцыя ў краінах Захаду ў канцы XVIII — XIX ст. з вынаходкамі і навуковымі адкрыццямі таго часу? ■

**Навукова-тэхнічны прагрэс (НТП)** — гэта працэс паступальнага ўзаемазвязанага развіцця навукі, тэхнікі, вытворчасці і сферы спажывання. Станоўчая ацэнка перспектыў навукова-тэхнічнага прагрэсу і яго ролі ў развіцці чалавецтва характэрная для так званых экатэхналагічных аптымістаў, песімісты ж, наадварот, падкрэсліваюць супярэчлівасць экалагічных, сацыяльных, палітычных, антрапалагічных наступстваў развіцця навукі і тэхнікі.












Правообладатель Адукацыя і выхаванне

En L'An 2000 («У 2000 годзе») — створаная французскімі мастакамі ў пачатку XX ст. серыя з некалькіх дзясяткаў паштовак пра тое, якім бачыцца будучыня чалавецтва праз стагоддзе.

Які пункт гледжання на ролю навукова-тэхнічнага прагрэсу ў грамадстве адлюстроўваюць дадзеныя ілюстрацыі? Наколькі рэалізаваліся прагнозы іх аўтараў? ■

**НТП мае дзве формы: *эвалюцыйную* і *рэвалюцыйную*. Эвалюцыйная форма НТП азначае ўдасканаленне тэхнікі, тэхналогіі, вытворчасці на базе адных і тых жа навукова-тэхнічных прынцыпаў. *Тэхналогія* — сукупнасць метадаў апрацоўкі, змянення ўласцівасцей зыходнага матэрыялу ў працэсе вытворчасці прадукцыі. Тэхналогіямі таксама называюцца аперацыі па здабычы, транспарціроўцы, захоўванні прадукцыі. Гэтыя аперацыі з'яўляюцца найважнейшай часткай агульнага вытворчага працэсу.**

**Рэвалюцыйная форма НТП азначае скачок, хуткі пераход да якасна новых навукова-тэхнічных прынцыпаў развіцця вытворчасці. Гэта і ёсць *навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР)* — глыбінны паварот у гісторыі чалавецтва, які звязаны з шырокім выкарыстаннем навукі і тэхнікі ў вытворчасці.**

**НТР пачалася пасля Другой сусветнай вайны ў развітых краінах. Яна азначае радыкальнае пераўтварэнне вытворчых сіл, усёй тэхналогіі грамадскай вытворчасці, арганізацыі і кіравання. Гэта сусветны працэс.**

### Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (сяр. XX ст.)

| Прычыны | Прыметы |
|---|---|
| • Поспехі прыродазнаўства (тэорыя адноснасці, квантавая механіка, кібернетыка, авалоданне атамнай энергіяй і інш.)<br>• Рост фінансавання навукі, павелічэнне колькасці даследчых устаноў | • Вядучай формай чалавечай дзейнасці становіцца навуковая праца<br>• Навуковыя адкрыцці пераўтвараюць вытворчасць, медыцыну, транспарт, сувязь і іншыя сферы<br>• Змяняецца роля чалавека ў працэсе вытворчасці і кіравання |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя кардынальна змяняе наш свет, адкрывае новыя магчымасці перад чалавецтвам. Разам з тым яна выявіла сур'ёзныя супярэчнасці, якія неабходна вырашаць.

**Выклікі і пагрозы для чалавецтва.** Навукова-тэхнічная рэвалюцыя акрамя велізарнай перавагі прынесла і глабальныя праблемы. Па-першае, гэта праблема выжывання ва ўмовах бесперапыннага ўдасканалення зброі масавага знішчэння. Па-другое, гэта экалагічны крызіс, які нарастае ў глабальных маштабах.

Беларуска-расійскі філосаф Вячаслаў Сцёпін называў тэхнагенным грамадства і шлях развіцця, у аснове якіх ляжыць паскораны навукова-тэхналагічны прагрэс, што вызначае эканамічны рост і змяненне чалавечых камунікацый. Гэты шлях даў чалавецтву мноства дасягненняў, але ён спарадзіў глабальныя крызісы — экалагічны і антрапалагічны, далейшае абвастрэнне якіх можа прывесці да дэградацыі біясферы і нават да сцэнарыя знішчэння чалавецтва. ■

Ад вырашэння сучасных экалагічных праблем залежыць лёс чалавецтва. Ад сучаснага грамадства патрабуецца асэнсаванне таго факта, што дзеля атрымання прыбыткаў, узбагачэння нельга парушаць прыродную раўнавагу, законы прыроды. НТР дае магчымасці забяспечыць эканамічны рост пры разумным узаемадзеянні чалавека з прыродай.

Чалавек — гэта частка прыроды, але разам з тым чалавек — гэта прадпрымальная істота, якая сваімі дзеяннямі пераўтварае прыроду, у тым ліку прыроду самога сябе. Развіццё тэхнікі і тэхналогій прывяло да небывалага камфорту, наяўнасці вольнага часу, павелічэння працягласці жыцця. Адваротным бокам гэтых даброт з'яўляецца павышэнне патрабаванняў да адукацыйнага і інтэлектуальнага ўзроўню чалавека. Працэс тэхналагізацыі чалавека выяўляецца ў залежнасці чалавечага існавання ад тэхнічных сродкаў і вынікаў іх функцыянавання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Сусветны дзень без аўтамабіля** адзначаецца 22 верасня ў многіх краінах свету. Аўтамабілістам і матацыклістам прапануецца хаця б на дзень адмовіцца ад выкарыстання траспартных сродкаў, якія спажываюць паліва; у некаторых гарадах і краінах адбываюцца спецыяльна арганізаваныя мерапрыемствы.



**Гадзіна Зямлі** — штогадовая міжнародная падзея, якая праводзіцца Сусветным фондам дзікай прыроды (WWF) у апошнюю суботу сакавіка. Прыватных асоб і арганізацыі заклікаюць выключыць святло на адну гадзіну, каб прыцягнуць увагу да праблемы змянення клімату, светлавога забруджвання і іншых экалагічных пытанняў.

Правядзіце эксперымент «Дзень без тэхнікі» — на дзень адмоўцеся ад выкарыстання мабільнай сувязі, камп'ютарнай і бытавой тэхнікі, аўтамабільнага транспарту. Ці магчыма зрабіць гэта назаўсёды ў сучасных умовах? Чаму сёння ёсць людзі, якія адмаўляюцца ад тэхнічных даброт цывілізацыі? ■

Улада тэхнікі праяўляецца не толькі ў тым, што чалавек у сваім паўсядзённым жыцці і вытворчасці ўжо не можа абысціся без дапамогі тэхнічных прылад, але і ў тым, што тэхніка ўкараняецца ў кіраванне грамадствам. Тэхнічныя сістэмы канструююцца, выпрацоўваюцца і кіруюцца людзьмі і забяспечваюць дасягненне тых або іншых сацыяльна значных мэт. Энергетычныя, ядзерныя,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**інфраструктурныя, транспартныя, касмічныя аварыі і катастрофы выклікаюцца разузгадненнем узаемадзеяння элементаў складаных сістэм, у стварэнні і функцыянаванні якіх задзейнічаны як людзі, так і тыя або іншыя элементы своранных імі тэхналогій.**

Ці згодныя вы з тым, што па меры развіцця тэхнікі ўсё большая роля пачынае належаць чалавечаму фактару? Абгрунтуйце сваё меркаванне. ■



Правядзіце пошук па малюнках. Вызначце назву работы беларускага мастака Аляксандра Кішчанкі, якая сёння знаходзіцца ў штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. Якой значнай для Беларусі і ўсяго свету падзеі прысвечана гэта работа? ■

**Навукова-тэхнічны прагрэс цесна звязаны з духоўна-маральным развіццём чалавека. Сучасны стан навукі, тэхнікі, сістэм узбраення востра ставіць перад людзьмі праблему асабістай адказнасці за рашэнні і дзеянні. Сёння неабходна крытычная ацэнка тых сацыяльных фактараў, умоў і абставін, якія вядуць да антыгуманнага выкарыстання вынікаў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Вельмі важны таксама пошук тэндэнцый і сіл, здольных супрацьстаяць дэгуманізацыі навукі і тэхнікі, грамадства наогул.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Гуманізм як мера грамадскага прагрэсу.** **Гуманізм** (ад лац. *humanus* — чалавечы, *humanitas* — чалавечнасць) — сістэма поглядаў, згодна з якой прызнаецца каштоўнасць чалавека як асобы, яго права на свабоду, шчасце і развіццё.

Гуманізм як сістэма поглядаў фарміраваўся на працягу стагоддзяў. Гуманізм зараджаецца ў элінаў, у Старажытнай Грэцыі, дзе чалавек абвяшчаецца «мерай усіх рэчаў». У эпоху Адраджэння гуманізм упершыню выступіў як цэласная сістэма поглядаў і шырокая плынь грамадскай думкі. Гуманісты, арыентуючыся на элінаў, спрабавалі адрадзіць антычны ідэал чалавечай адукацыі і паводзінаў, дабрачыннасці.



Каго з адметных дзеячаў эпохі Адраджэння ў Беларусі вы пазналі на партрэтах? Якія гуманістычныя ідэі беларускіх мысліцеляў вам вядомы? ■

Гуманізм розным чынам заяўляў пра сябе ў наступныя стагоддзі. XX стагоддзе лічыцца вяршыняй развіцця філасофіі гуманізму, агульначалавечых каштоўнасцей і правоў чалавека. Але менавіта XX стагоддзе, век трыумфу чалавечага розуму, навукі і тэхнікі, атама і космасу, прынесла чалавецтву найбольшыя разбурэнні — мільёны загінуўшых у сусветных войнах і таталітарных рэжымах, маштабныя тэхнагенныя катастрофы і экалагічныя бедствы...



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Ці ўсвядоміла чалавецтва ўрокі сусветных войнаў? Як не дапусціць адраджэння фашызму ў XXI ст.?**




Ці можна сказаць, што беларускі мемарыяльны комплекс «Ола» сімвалізуе гуманістычную катастрофу XX ст.? Абгрунтуйце сваё меркаванне. Выкарыстоўвайце памятку па рабоце з фота помніка. ■

Даведайцеся, калі былі прыняты Першы, Другі і Трэці гуманістычныя маніфесты. Коратка сфармулюйце дэвіз кожнага з іх. ■

Сёння можна сказаць, што гуманізм — гэта сістэма поглядаў і культурна-гістарычная традыцыя, якія зарадзіліся ў старажытнагрэчаскай цывілізацыі, развіваліся ў наступныя стагоддзі і захаваліся ў сучаснай культуры як агульначалавечая аснова. Натуральнасць гуманізму тлумачыцца натуральнасцю тых



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**чалавечых якасцей, якія яго спараджаюць і на якія ён абапіраецца. Галоўная сярод іх — чалавечнасць, гуманнасць.**



Большасць людзей арыентуюцца на гуманістычныя каштоўнасці.

Дабрачынная актыўнасць насельніцтва адлюстроўвае ўзровень гуманнасці грамадства. Беларусы ўмеюць суперажываць, ім уласціва імкненне дапамагчы бліжняму. Кожны пяты грамадзянін нашай краіны ахвярує на дабрачыннасць.

Абмяркуйце наступныя пытанні:

- Навошта займацца дабрачыннасцю?
- Каму трэба дапамагаць?
- Як можна дапамагаць?
- Што я магу зрабіць? ■

**Сёння ідэі гуманізму прымаюць і практыкуюць многія людзі, тым самым ператвараючы гуманізм у праграму сацыяльных змен, у маральную сілу, у шырокі і міжнародны культурны рух. Праблемы, якія стаяць перад чалавецтвам, надзвычай сур'ёзныя. Гуманісты лічаць, што гэтыя праблемы могуць быць вырашаны з дапамогай розуму і крытычнага мыслення, волі да кампрамісу, згоды і супрацоўніцтва.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Канкрэтызуйце прыкладамі праявы прагрэсу і рэгрэсу ў сучасным свеце.
2. Лічыцца, што кожная наступная ступець развіцця грамадства з'яўляецца больш прагрэсіўнай: яна пашырае кола правоў і свабод асобы, цягне за сабой развіццё яе патрэб і ўдасканаленне яе здольнасцей. Параўнайце ў гэтых адносінах статус раба і прыгоннага, прыгоннага і наёмнага рабочага ў XIX ст.
3. Якія доказы можна прывесці пры станоўчай ацэнцы перспектыў навукова-тэхнічнага прагрэсу і яго ролі ў развіцці чалавецтва, а якія — пры адмоўнай? Ахарактарызуйце два падыходы да ацэнкі ролі НТР: экатэхналагічны песімізм і экатэхналагічны аптымізм. Чаму аднабаковую ацэнку ролі НТР у развіцці чалавецтва сёння крытыкуюць не толькі вучоныя, але і шырокія пласты грамадскасці?
4. Як суадносяцца паміж сабой паняцці «гуманнасць» і «гуманізм»? ■

Выканайце міні-праект «Вярнуцца да жыцця: Чарнобыль праз дзесяцігоддзі». Ажыццявіце пошук інфармацыі ў інтэрнэце па запыце «Чарнобыль» (на розных мовах), выкарыстоўвайце розныя пошукавыя сістэмы. Параўнайце вынікі. Што і як абмяркоўваецца сёння, больш чым праз 35 гадоў пасля тэхнагеннай катастрофы? Што пра гэта думаюць у Беларусі? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 2. Ступені грамадскага развіцця






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Асноўныя падыходы да разгляду гісторыі грамадства.** У навуцы існуюць чатыры асноўныя падыходы да перыядызацыі гістарычнага працэсу: *фармацыйны*, *стадыяльны*, *тэхналагічны* і *цывілізацыйны*.

Першыя тры падыходы разглядаюць сусветную гісторыю як адзіны працэс паступальнага развіцця чалавецтва ад ніжэйшых ступеняў да вышэйшых. Гісторыя падзяляецца на пэўныя стадыі (ступені, этапы) у залежнасці ад узроўню развіцця вытворчых сіл, тэхнікі, тэхналогій, эканомікі.

Станоўчым момантам дадзеных падыходаў з'яўляецца магчымасць убачыць агульныя заканамернасці ў гістарычным развіцці розных народаў, паказаць гісторыю чалавечага грамадства як адзіны працэс, прапанаваць агульную перыядызацыю гісторыі. Разам з тым у працэсе вылучэння этапаў у развіцці грамадства многія працэсы разглядаюцца спрошчана (у першую чаргу тыя, якія тычацца духоўнага жыцця грамадства, развіцця культуры), недастаткова ўвагі надаецца адметнасцям развіцця розных грамадстваў і народаў.

Паняцце «цывілізацыя» можа разглядацца і як пэўная ступень у развіцці грамадства, і як супольнасць людзей, аб'яднаных шэрагам прымет. Пры цывілізацыйным падыходзе развіццё чалавецтва разглядаецца як гісторыя многіх цывілізацый з іх асаблівай культурай, традыцыямі, рэлігіяй, укладам жыцця. У аснове падыходу ляжыць ідэя ўнікальнасці сацыяльных з'яў, своеасаблівасці шляхоў, пройдзеных асобнымі народамі (ці лакальнымі цывілізацыямі), якія існавалі ў розны час і ў розных рэгіёнах планеты, і адначасова суіснуюць у цяперашні час.

У межах фармацыйнага, стадыяльнага і тэхналагічнага падыходаў да гісторыі разгледзім ідэі К. Маркса, У. Ростаў, Д. Бэла і Э. Тофлера.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Фармацыйны падыход.** Фармацыйны падыход да перыядызацыі гісторыі ўзнік у другой палове XIX ст. у межах марксізму.

Нямецкі філосаф Карл Маркс у другой палове XIX ст. сфармуляваў ідэю пра тое, што гістарычны працэс разгортваецца як паслядоўная і заканамерная змена грамадска-эканамічных фармацый (фармацыйны падыход). Кожная грамадска-эканамічная фармацыя характарызуецца пэўнай ступенню развіцця вытворчых сіл (якія ўключаюць сродкі вытворчасці і рабочую сілу) і адпаведным гэтай ступені тыпам эканамічных вытворчых стасункаў. ■

На аснове ідэй К. Маркса гісторыкі вылучылі пяць асноўных фармацый:

- *першабытна-абшчынная* (сумесная праца ў межах абшчыны, грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці, ураўняльнае размеркаванне прадуктаў, адсутнасць грамадскіх класаў);
- *рабаўладальніцкая* (узнікненне прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, рабская праца, існаванне класаў рабаўладальнікаў і рабоў);
- *феадальная* (панаванне натуральнай гаспадаркі, падахвочванне да працы шляхам асабістай залежнасці, існаванне класаў феадалаў — уласнікаў зямлі і залежных сялян, якія працуюць на зямлі);
- *капіталістычная* (развіццё таварнай гаспадаркі, асноўны механізм падахвочвання да працы — эканамічны прымус, існаванне класаў буржуазіі (уласнікаў сродкаў вытворчасці) і пралетарыяту (наёмных рабочых));
- *камуністычная* (існаванне грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, размеркаванне даброт не па працы, а паводле патрэб. Гэтая фармацыя павінна ўзнікнуць у будучыні).

У XX ст. тэорыя грамадска-эканамічных фармацый актыўна распрацоўвалася ў СССР і сацыялістычных краінах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Стадыяльны падыход.** У 1960-х гг. была сфармулявана *тэорыя стадый эканамічнага росту*.

Амерыканскі вучоны Уолт Ростаў у працы «Стадыі эканамічнага росту. Некамуністычны маніфест» (1960) прапанаваў улічваць эканамічныя крытэрыі (тэхналагічныя новаўвядзенні, хуткасць эканамічнага росту, змяненні ў структуры вытворчасці) і на іх падставе вылучыў пяць стадый развіцця грамадства. ■

У канцэпцыі У. Ростаў вылучаюцца наступныя стадыі:
- *традыцыйнае грамадства* (запаволенае развіццё, нізкі ўзровень вытворчасці працы, перавага сельскай гаспадаркі ў эканоміцы, іерархічная сацыяльная структура, улада належыць буйным зямельным уласнікам);
- *пераходнае грамадства* (зараджэнне прадпрымальніцтва і капіталістычных стасункаў, фарміраванне цэнтралізаваных дзяржаў, рост нацыянальнай самасвядомасці);
- *стадыя ўзлёту* (прамысловая рэвалюцыя, пачатак індустрыялізацыі, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя рэформы);
- *стадыя сталасці* (тэхнічны прагрэс, урбанізацыя, завяршэнне індустрыялізацыі, павышэнне долі кваліфікаванай працы);
- *эра высокага ўзроўню масавага спажывання* (высокі ўзровень спажывання тавараў працяглага карыстання і паслуг, стварэнне сістэмы сацыяльнага забеспячэння, станаўленне «грамадства ўсеагульнага дабрабыту»).

У 1971 г. У. Ростаў дадаў шостую стадыю росту — стадыю «пошуку якасці жыцця» (якаснае паляпшэнне жыццёвых умоў чалавека, пашырэнне сферы паслуг у галіне медыцыны, вольнага часу, падарожжаў і да т. п.).

У чым падабенства і адрозненне фармацыйнага падыходу і тэорыі стадый эканамічнага росту? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Тэхналагічны падыход.** У цяперашні час шырокае распаўсюджанне атрымаў *тэхналагічны падыход*, які дазваляе вылучыць розныя тыпы грамадства ў залежнасці ад узроўню развіцця тэхнікі і тэхналогій.

Прадстаўнік тэхналагічнага падыходу, аўтар працы «Трэцяя хваля» (1980), амерыканскі сацыёлаг Элвін Тофлер лічыў, што ў развіцці чалавецтва можна вылучыць тры стадыі — «хвалі», непасрэдна звязаныя з тэхніка-тэхналагічным развіццём. Гэтыя «хвалі» ствараюць асаблівыя тыпы грамадства. ■

Першая хваля звязана з аграрнай рэвалюцыяй, у выніку якой на змену грамадству паляўнічых і збіральнікаў прыйшло грамадства земляробаў і жывёлаводаў, адбыўся пераход ад прысвойвальнай гаспадаркі да вытворчай.

Другая хваля абумоўлена пераходам ад ручной працы да машыннай вытворчасці ў выніку прамысловай рэвалюцыі, якая прывяла да фарміравання індустрыяльнага грамадства.

Станаўленне постіндустрыяльнага грамадства з'яўляецца вынікам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР).



Выкарыстоўваючы метафару хваль, Э. Тофлер падкрэслівае, што ўзнікненне новага тыпу грамадства — гэта не аднаразовая падзея, а працяглы працэс зараджэння, экспансіі і згасання. Сёння першая хваля, павольна і няўхільна абышоўшы ўвесь свет, практычна вычарпала сваю сілу. Трэцяя хваля толькі паскарае свой разбег і сутыкаецца з другой хваляй, якая пачала адыходзіць назад.

Прапануйце сваю ідэю вокладкі кнігі Э. Тофлера «Трэцяя хваля», каб матываваць маладых людзей прачытаць яе сёння. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Даіндустрыяльная стадыя (традыцыйнае грамадства), у адпаведнасці з тэхналагічным падыходам, характарызуецца ручной працай і прымітыўнай тэхнікай, высокай удзельнай вагой сельскай гаспадаркі ў грамадскай вытворчасці, нязначнымі памерамі вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва, павольным тэхнічным прагрэсам.

У сацыяльнай сферы даіндустрыяльнае грамадства вылучае жорсткая іерархічная сацыяльная структура з нізкай сацыяльнай мабільнасцю. Традыцыйнае грамадства — гэта аграрны свет з панаваннем вёскі і ўстойлівага ладу жыцця, які мала змяняецца на працягу многіх пакаленняў. Вызначальную ролю маюць уласнікі зямлі, духавенства, армія. Да гэтай стадыі тэхналагічнага развіцця адносяць усю гісторыю чалавецтва ажно да Новага часу. На працягу XVII–XIX стст. у Заходняй Еўропе здзяйсняўся пераход ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага грамадства.

Прыгадайце, чаму працэс пераходу ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага назвалі мадэрнізацыяй. ■

*Індустрыяльнае грамадства* характарызуецца вызначальнай роляй прамысловасці ў сістэме гаспадарчай дзейнасці, панаваннем машыннай вытворчасці, масавай таварнай вытворчасцю, тэхналагічным падзелам працы, высокай канцэнтрацыяй вытворчасці і рабочай сілы. У эканамічнай сферы адбываецца шырокае развіццё таварна-грашовых адносін, у гаспадарчай дзейнасці дамінуе строгі эканамічны разлік. Прамысловае прадпрыемства, прадпрымальніцкая дзейнасць адасабляюцца ад дамашняй гаспадаркі. Сацыяльная сфера вылучаецца высокім узроўнем гарызантальнай і вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці. Адбываецца *ўрбанізацыя* — гарады займаюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вызначальнае становішча ў жыцці грамадства. Такім чынам, асновай развіцця індустрыяльнага грамадства становіцца машынная вытворчасць, навукова-тэхнічны прагрэс, які падмацоўваецца духам прадпрымальніцтва, рыначнай канкурэнцыяй і рацыянальнасцю дзеянняў.

На змену індустрыяльнаму грамадству ў другой палове XX ст. прыходзіць грамадства постіндустрыяльнае.

Тэрмін «постіндустрыяльнае грамадства» атрымаў шырокае распаўсюджанне ў выніку з'яўлення навуковых прац амерыканскага сацыёлага Дэніэла Бэла, у прыватнасці, кнігі «Будучае постіндустрыяльнае грамадства» (1973). ■

У постіндустрыяльным грамадстве эканоміку, заснаваную на вытворчасці тавараў, змяняе эканоміка паслуг (транспарт, сувязь, гандаль, крэдытна-фінансавая сфера, страхавая дзейнасць, бытавыя, сацыяльныя, дзелавыя паслугі). Гэта не азначае зніжэння ролі прамысловай вытворчасці, яна застаецца асновай рэальнай эканомікі. Адбываецца толькі ўзрастанне долі паслуг у працэнтных суадносінах. Ідзе скарачэнне колькасці працаўнікоў, занятых у матэрыяльнай вытворчасці — не толькі сельскагаспадарчай, але і прамысловай. Прымяняюцца рэсурсазберагальныя тэхналогіі, якія забяспечваюць павышэнне прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі. Вызначальнае месца ў працэсе вытворчасці займаюць спецыялісты, тэхнікі, менеджары. Рэзка ўзрастае грамадскае значэнне навуковых ведаў. Значна павялічваюцца капіталаўкладанні ў галіны, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс і навукаёмістую вытворчасць. З'яўляюцца комплексныя навукова-вытворчыя аб'яднанні, якія злучаюць навуку, вытворчаць, адукацыю, абслугоўванне.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Чаму пры пераходзе да постіндустрыяльнага грамадства адбываецца так званая рэвалюцыя менеджараў: роля кіраўнікоў карпарацый робіцца больш значнай, чым роля іх уласнікаў?

Як вы думаеце, ці адпавядае інфаграфіка «Эфектыўны менеджар» сваёй назве? ■

У сацыяльнай структуры грамадства адбываюцца істотныя змены, звязаныя з фарміраваннем сярэдняга класа, які з'яўляецца галоўнай вытворчай сілай грамадства і асноўнай сацыяльнай базай грамадзянскай супольнасці. Пад уплывам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі складваецца новы тып працаўніка. Гэта высокакваліфікаваны спецыяліст, арыентаваны на пастаяннае павышэнне сваіх прафесійных ведаў і ўменняў. У постіндустрыяльным грамадстве ўзмоцнена развіваецца індустрыя дабрабыту, накіраваная на задавальненне разнастайных патрэб людзей. Усё больш сродкаў выдаткоўваецца на развіццё адукацыі, аховы здароўя, траспарту, сферы вольнага часу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Пералічыце крытэрыі вылучэння стадый у развіцці грамадства.
2. Складзіце і запоўніце параўнальную табліцу «Тры “хвалі” развіцця грамадства», адказаўшы на наступныя пытанні:
   - Якія тэхналогіі пакладзены ў аснову «хвалі»?
   - Якая галіна эканомікі з'яўляецца асноўнай?
   - Што сабой уяўляе сацыяльная структура грамадства?
   - Што з'яўляецца галоўнай каштоўнасцю грамадства?
   - Якія храналагічныя межы перыяду?
3. Як вы разумееце словы Э. Тофлера аб тым, што ў цяперашні час у свеце адначасова суіснуюць тры «хвалі»? На якой «хвалі» знаходзіцца сучаснае беларускае грамадства? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
4. Чаму чалавек традыцыйнага грамадства ўспрымаў час як чараду паўтаральных падзей («кола часу»), а чалавек індустрыяльнага грамадства — як прагрэс («страла часу»)? Сімвалам якога гістарычнага тыпу грамадства можна лічыць Кнігу рэкордаў Гінэса? ■

Выканайце міні-праект «ХХ стагоддзе: ад лучыны да інтэрнэту». Падрыхтуйце візуалізацыю (плакат, інфаграфіку, стужку часу) змен за 100 гадоў якой-небудзь рэчы ці сацыяльнай з'явы. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 3. Цывілізацыя як культурна-гістарычны працэс

## Выжыванне ці самавыяўленне, рэлігія ці навука?




Сусветны даследчы праект вывучэння каштоўнасцей і светапогляду людзей (WVS) рэалізуецца з 1981 г. у больш чым 90 краінах свету. На падставе вынікаў сацапытання складаецца так званая карта каштоўнасцей — дыяграма Інглхарта — Вельцэля. Вертыкальная вось адлюстроўвае баланс каштоўнасцей: «традыцыйныя» (важнасць рэлігіі, сям'і, улады, традыцый) і «свецка-рацыянальныя» (важнасць навукі, законаў, правоў чалавека). Гарызантальная вось — баланс каштоўнасцей «выжывання» (фізічная і эканамічная бяспека) і «самавыяўлення» (свабода, самарэалізацыя, талерантнасць). ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце цывілізацыі.** Паняцце «цывілізацыя» паходзіць ад лацінскага *civilis*, што азначае «грамадзянскі, дзяржаўны». У розных навуковых канцэпцыях існуюць розныя падыходы да дадзенага паняцця. Паняцце «цывілізацыя» мае два асноўныя значэнні: як асобнае грамадства і як стадыя развіцця чалавецтва.

У XX ст. паняцце «цывілізацыя» стала звязвацца ў першую чаргу з *«лакальнымі»* цывілізацыямі, а не са ступенню ў развіцці грамадства. У аснову цывілізацыйнага падыходу былі пакладзены тры асноўныя палажэнні:

- у чалавецтва няма гісторыі як адзінага сусветна-гістарычнага працэсу, а ёсць гісторыя асобных краін і народаў, цывілізацый;
- не эканамічныя фактары вызначаюць развіццё грамадства, а духоўныя і культурныя;
- не агульныя, а адметныя рысы ў развіцці краін і народаў, іх самабытнасць і непадабенства маюць галоўнае значэнне для гісторыі.

**Цывілізацыі** — гэта ўстойлівыя цэласныя культурна-гістарычныя супольнасці, якія вылучаюцца агульнасцю духоўных каштоўнасцей і культурных традыцый, падабенствам сацыяльна-палітычнага і матэрыяльна-вытворчага развіцця, асаблівасцямі ладу жыцця і пэўным тыпам асобы, агульнымі этнічнымі прыметамі і пэўнымі геаграфічнымі рамкамі.

**Цывілізацыйны падыход да вывучэння грамадства.** Найбольш маштабныя канцэпцыі цывілізацыйнага развіцця стварылі такія вучоныя, як М. Данілеўскі, О. Шпенглер, А. Тойнбі, С. Хантынгтан. Усе яны выступалі з пазіцыяй крытыкі канцэпцыі адзінай сусветнай гісторыі.

У рабоце «Расія і Еўропа» (1869) вядомы расійскі прыродазнавец і філасаф Мікалай Данілеўскі паслядоўна адстойваў пункт гледжання, згодна з якім не існуе гісторыі як адзінага сусветна-гістарычнага працэсу, а ёсць толькі гісторыя асобных «культурна-гістарычных тыпаў» (цывілізацый). ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Культурна-гістарычныя тыпы развіваюцца падобна да жывых арганізмаў, знаходзяцца ў барацьбе адзін з адным і са знешнім асяроддзем, выцясняюць адзін аднаго на працягу гісторыі. Вучоны вылучаў такія культурна-гістарычныя тыпы, як егіпецкі, кітайскі, індыйскі, іранскі, яўрэйскі, грэчаскі, рымскі, рамана-германскі і іншыя, усяго дванаццаць.

Нямецкі філосаф Освальд Шпенглер у працы «Заняпад Еўропы» (1918) разглядаў гістарычны працэс як чараду культур, якія змяняюць адна адну.

Сапраўднымі творцамі сусветнай гісторыі, на думку О. Шпенглера, з'яўляюцца культуры, якія дасягнулі найвышэйшага росквіту і пад'ёму. Да іх ён адносіў восем вялікіх культур: егіпецкую, вавілонскую, індыйскую, кітайскую, мексіканскую, антычную, заходнееўрапейскую, арабскую.



*Апалон Бельведэрскі*



*Э. Дэлакруа. Доктар Фаўст*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Чаму Шпенглер называў антычную культуру «апалонаўскай», а заходнееўрапейскую — «фаўстаўскай»? Хто такі Апалон, а хто такі Фаўст?

Якія падзеі адбываліся ў свеце падчас выхаду працы Шпенглера «Заняпад Еўропы»? Як вы лічыце, ці паўплывалі яны на погляды вучонага? ■

**Культуры, як жывыя арганізмы, маюць свой лёс і перажываюць стадыі зараджэння, росквіту, старасці і заняпаду. Цывілізацыя, на думку О. Шпенглера, — гэта заключная стадыя ў развіцці культуры, на якой адбываецца яе выраджэнне, заняпад і «амярцвенне», яна ператвараецца ў «масавую культуру», знікае духоўнасць і творчасць. Грамадства дасягае вялікіх поспехаў у навуцы і тэхніцы, пераважае рацыяналізм і атэізм, а мастацтва, літаратура, духоўнае жыццё прыходзяць у заняпад.**

Англійскі гісторык Арнольд Тойнбі ў сваёй 12-томнай працы «Спасціжэнне гісторыі» (1934—1961) пісаў, што гісторыя ўяўляе сабой сукупнасць параўнальна своеасаблівых і замкнёных цывілізацый. Цывілізацыя існуе ў пэўнай прасторы і часе, і аснову яе складае рэлігія, хоць параметры тэхналагічнага развіцця таксама маюць значэнне. ■

**У аснове тэорыі А. Тойнбі ляжыць ідэя ўзнікнення і развіцця цывілізацый як адказу на выклікі свайго часу. Выклікі пастаянна кідае народам прыроднае і сацыяльнае асяроддзе (змяненне клімату, землетрасенні ці паводкі, войны, пагрозы заваявання і да т. п.).**

**Стадыі ўзнікнення і росту цывілізацыі характарызуюцца тым, што творчая меншасць (эліта грамадства — прарокі, мысліцелі, палітыкі, жрацы, палкаводцы, архітэктары і інш.) паспяхова знаходзіць адказы на выклікі часу. Страта творчай меншасцю дадзенай здольнасці прыводзіць цывілізацыю да стадыі надлому і распаду. У гісторыі чалавецтва А. Тойнбі вылучаў**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**21 цывілізацыю і лічыў, што ў XX ст. засталіся існаваць толькі 10 цывілізацый.**

Амерыканскі вучоны Сэмюэл Хантынгтан у працы «Сутыкненне цывілізацый і пераўтварэнне сусветнага парадку» (1996) разглядае цывілізацыю як шырокамаштабную культурную супольнасць, у якой магчыма вызначыць шэраг агульных рыс (мову, гісторыю, рэлігію, звычаі, інстытуты), а таксама адпаведную самаідэнтыфікацыю людзей. ■

С. Хантынгтан следам за англійскім гісторыкам А. Тойнбі адводзіць рэлігійнаму пачатку галоўную ролю ў якасці крытэрыю прыналежнасці да той ці іншай цывілізацыі.

Цывілізацыі не падобныя па сваёй гісторыі, культуры, мове, традыцыях і, што самае важнае, рэлігіі. Людзі розных цывілізацый па-рознаму глядзяць на адносіны паміж Богам і чалавекам, індывідам і групай, грамадзянінам і дзяржавай, бацькамі і дзецьмі, мужам і жонкай, маюць розныя ўяўленні пра значнасць правоў і абавязкаў, свабоды і прымусу, роўнасці і іерархіі. Гэтыя адрозненні складваліся стагоддзямі. Яны не знікнуць у найбліжэйшай будучыні і могуць прывесці да небяспечных канфліктаў, сутыкненняў па лініі цывілізацыйных разломаў (зоны патэнцыяльных канфліктаў на мяжы цывілізацый з рознымі рэлігіямі, каштоўнасцямі і культурамі).

Асаблівасць цывілізацыйнага падыходу заключаецца ў тым, што ён разглядае цывілізацыі, якія суіснуюць адна з адной у кожны момант часу, а не ідуць паслядоўна адна за адной. Акрамя дадзенага палажэння, важнай рысай адзначанага падыходу з’яўляецца прызнанне таго, што працэсы, якія адбываліся ў адной цывілізацыі, не абавязкова павінны паўтарыцца ў іншых цывілізацыях.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне











Якія выявы вы выбераце для ілюстрацыі класіфікацыі цывілізацый М. Данілеўскага, О. Шпенглера, А. Тойнбі? Чаму? Якія выявы можна выкарыстаць для ілюстрацыі канцэпцыі сутыкнення цывілізацый С. Хантынгтана? Абгрунтуйце сваё меркаванне. ■

**Станаўленне цывілізацыйнай ідэнтычнасці Беларусі адбывалася ў працэсе доўгага гістарычнага шляху беларускага народа ў пошуку адказаў на пытынні: «Хто мы такія? Адкуль прыйшлі? Куды ідзём?» Для таго каб адказаць на гэтыя пытанні, неабходна ведаць тое, што нас аб'ядноўвае: нашы каштоўнасці, традыцыі, гісторыю.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Як у сучаснасці праяўляюцца традыцыі продкаў?**

Вызначце, які традыцыйны арнамент актыўна выкарыстоўваецца ў сімволіцы розных устаноў і арганізацый (дзяржаўных і недзяржаўных, бізнесу і некамерцыйных структур) у Беларусі. Якія народныя і хрысціянскія каштоўнасці транслірue дадзены арнамент? ■

Цывілізацыйная ідэнтычнасць Беларусі фарміравалася пад уплывам розных фактараў. Геаграфічнае становішча Беларусі на перакрыжаванні еўрапейскіх дарог, клімат і ландшафт, асаблівасці этнакультурнага развіцця і станаўлення дзяржаўнасці, канфесійная разнастайнасць і мірнае суіснаванне розных рэлігій вызначаюць спецыфіку цывілізацыйнага існавання беларусаў.

Якія прыметы можна вылучыць як унікальныя, характэрныя толькі для Беларусі? Ці згодны вы з ацэнкай цывілізацыйнай прыналежнасці Беларусі, якую выказаў беларускі філосаф Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі) у сваім эсэ «Адвечным шляхам» (1921):

«Ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога з'яўляецца асноўнаю адзнакаю гісторыі беларускага народу»?

Абгрунтуйце сваё меркаванне. ■

**Характэрныя рысы сучаснай цывілізацыі.** Грамадства, якое існуе ў цяперашні час, называюць па-рознаму — сучасным грамадствам і сучаснай цывілізацыяй, постіндустрыяльным і інфармацыйным грамадствам. Ахарактарызаваць яго няпроста — у абліччы сучаснага свету прадстаўлена амаль ці не ўся гісторыя чалавецтва. Па сённяшні дзень існуюць плямёны, якія жывуць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

так, як жылі людзі ў раннія перыяды гісторыі. У той жа час ёсць значная група краін, якія знаходзяцца на найвышэйшым узроўні развіцця вытворчасці, сферы паслуг, сацыяльнай абароны чалавека. Развіццё сучаснага свету адбываецца вельмі нераўнамерна і супярэчліва, але адной з тэндэнцый з'яўляецца паступовае збліжэнне каштоўнасцей людзей.

Карта каштоўнасцей WVS (гл. інфаграфіку на с. 30) паказвае, дзе знаходзяцца супольнасці ў вымярэннях «традыцыйных» і «свецка-рацыянальных» каштоўнасцей, а таксама каштоўнасцей «выжывання» і «самавыяўлення». Групы краін адлюстроўваюць іх агульныя каштоўнасці, а не геаграфічную блізкасць. Вызначце месца Беларусі на карце каштоўнасцей. Што вас здзівіла, засмуціла і ўзрадавала ў каштоўнасных перавагах беларусаў? ■

Сучаснае чалавецтва — гэта разнастайнасць цывілізацый з характэрнымі для іх формамі культурнага, палітычнага, сацыяльнага жыцця, эканамічнымі ўкладамі. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць усіх краін свету на сучасным этапе настолькі высокая, што можна гаварыць пра сучасную цывілізацыю як пра асаблівую цэласнасць. Насычанасць і шматпланавасць гаспадарчых, палітычных, інфармацыйных сувязей сучаснага свету вядзе да размывання сацыяльна-культурных межаў лакальных цывілізацый.

Чалавецтва пад уплывам аб'ектыўных глабальных працэсаў рухаецца ад характэрнай для мінулага раз'яднанасці лакальных цывілізацый да больш цеснага цывілізацыйнага адзінства. Нараджаецца шмат у чым адзіная сусветная цывілізацыя, бо фарміруецца новае, глабальнае тэхніка-эканамічнае і культурнае асяроддзе, ідзе працэс збліжэння, нават уніфікацыі інфармацыйнага, тэхналагічнага жыцця розных рэгіёнаў Зямлі — інфармацыйная цывілізацыя.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Чым адрозніваецца цывілізацыя як стадыя ў развіцці грамадства ад цывілізацыі як культурна-гістарычнага тыпу?
2. Запоўніце табліцу «Цывілізацыйны падыход да вывучэння грамадства».

| Філосаф | Назва працы | Характарыстыка падыходу | Назва цывілізацый |
|---|---|---|---|
| **М. Данілеўскі** | | | |
| **О. Шпенглер** | | | |
| **А. Тойнбі** | | | |
| **С. Хантынгтан** | | | |

3. Дакажыце, што цывілізацыйны падыход да вывучэння грамадства дапускае шматварыянтнасць гістарычнага развіцця. ■

Выканайце міні-праект «Зорка ідэнтычнасці». Выберыце з пералічаных характарыстык восем «праменяў», якія вы як асоба-«зорка» «выпраменьваеце» ў грамадства: імя, пол, узрост, раса, этнічная прыналежнасць, сямейная роля, адукацыя, мова, грамадзянства, праца/вучоба, веравызнанне, хобі. Чаму вы іх выбралі? Параўнайце свае «зоркі» з «зоркамі» сваіх бацькоў, аднакласнікаў, сяброў з розных краін. Чаго ў нас больш — падабенства ці адрозненняў? Што нас аб’ядноўвае? Стварыце плакат «Зоркі ідэнтычнасці». ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 4. Гарызонты інфармацыйнага грамадства

## Галоўная каштоўнасць грамадства — інфармацыя?






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Асноўныя характарыстыкі інфармацыйнага грамадства.

Тэрмін «інфармацыйнае грамадства» стаў шырока выкарыстоўвацца ў працах японскіх вучоных Юдзіра Хаясі і Ёнэдзі Масуды ў 1960—1970-я гг. За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў інфармацыйнае грамадства набыло якасныя прыметы і яго ўзнікненне стала рэальнасцю, што знайшло адлюстраванне і ў міжнародных дакументах. ■

У розных тэарэтычных канцэпцыях інфармацыйнае грамадства разглядаецца або як адна з разнавіднасцей постіндустрыяльнага грамадства, або як якасна новая ступень у грамадскім развіцці. Найважнейшымі крытэрыямі пераходу да інфармацыйнага грамадства з'яўляюцца:

- прыярытэтнае развіццё інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;
- рэзкае павелічэнне долі ВУП, якая ствараецца ў інфармацыйнай сферы;
- узрастанне колькасці рабочай сілы, занятай у вытворчасці інфармацыйных прадуктаў і паслуг;
- уключэнне нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ў глабальнае інфармацыйнае сеціва.

Гэтыя змяненні абумоўлены з'яўленнем мікрапрацэсараў і сеткавых камп'ютарных тэхналогій, спадарожнікавай сувязі і энергетычных рэсурсаў, неабходных для выкарыстання гэтых тэхналогій.

**Інфармацыйнае грамадства** — гэта грамадства, у якім вытворчасць і спажыванне інфармацыі з'яўляецца найважнейшым відам дзейнасці і найбольш значным рэсурсам грамадскага развіцця.

Інфармацыйнае асяроддзе (нароўні з сацыяльным і экалагічным) становіцца новым асяроддзем пасялення чалавека. Высокія тэхналогіі (high-tech) з'яўляюцца асновай развіцця вытворчых сіл грамадства.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аб якой тэндэнцыі сведчыць выкарыстанне нароўні з тэрмінам high-tech тэрміна high-hume, што значыць «высокія тэхналогіі, якія ствараюць чалавека»? ■

Інфармацыйнае грамадства — гэта не толькі новая тэхналагічная рэальнасць, але і істотныя змены ў палітычнай сферы, сацыяльных структурах, ладзе жыцця, сістэме каштоўнасцей, спосабах мыслення.

**Характэрныя рысы інфармацыйнага грамадства**

| | | |
|---|---|---|
| Змяненне структуры эканомікі | Развіццё тэлекамунікацый | Свабода доступу да інфармацыі |
| Змяненне ўкладу жыцця | Даступнасць адукацыі | Рост інфармацыйнай культуры |

У палітычнай сферы інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ствараюць магчымасці для функцыянавання *электроннай дэмакратыі*. Электронныя тэхналогіі садзейнічаюць развіццю інтэрактыўнасці (сацыяльнага ўзаемадзеяння), павышэнню ўзроўню палітычнага ўдзелу і развіцця грамадзянскага грамадства. Выкарыстанне сеткавай камунікацыі ўзмацняе адкрытасць дзейнасці палітычных інстытутаў, дэпутатаў, чыноўнікаў, садзейнічае павышэнню адказнасці ўладных органаў за прынятыя рашэнні.

Існуе і небяспека, якую можа спараджаць электронная дэмакратыя. Небяспека ўкідання недакладнай інфармацыі, якая дыскрэдытуе дзяржаўныя інстытуты, палітычныя партыі і палітычных лідараў. Выкарыстанне інтэрнэту для прапаганды палітычнага экстрэмізму, арганізацыі экстрэмісцкіх акцый і палітычных правакацый, расколу грамадства і распальвання сацыяльных канфліктаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Новыя электронныя магчымасці для камунікацыйнага ўзаемадзеяння садзейнічаюць фарміраванню электроннага ўрада. *Электронны ўрад* — гэта прымяненне інфармацыйных тэхналогій для інфармавання грамадства аб дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і аказання дзяржаўных паслуг грамадзянам і арганізацыям.**

Аператарам інфармацыйных сістэм, якія складаюць фундамент электроннага ўрада ў Рэспубліцы Беларусь, з'яўляецца Нацыянальны цэнтр электронных паслуг. На яго сайце (https://nces.by/e-government) прыводзяцца вынікі міжнародных даследаванняў у галіне электроннага ўрада.

Якая інфармацыя пра электронны ўрад у Рэспубліцы Беларусь прыведзена на сайце ў дадзены момант? ■




*Гатоўнасць Беларусі да электроннага ўрада (месца сярод 193 краін свету)*

**Пад уздзеяннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій змяняецца сацыяльная структура грамадства. Фарміраванне і ўзаемадзеянне шматлікіх сацыяльных груп усё больш звязана з сеткавай камунікацыяй. Хутка ўзнікаюць новыя прафесіі, звязаныя з высокімі тэхналогіямі. Расце інфармацыйны рынак працы. Прафесія, якасць адукацыі і сфера занятасці становяцца асноўнымі для вызначэння сацыяльнага статусу. Узрастае доля людзей, занятых інтэлектуальнай працай.**

Даведайцеся, якія ў Беларусі ёсць спецыяльнасці, звязаныя са штучным інтэлектам, выкарыстоўваючы магчымасці галасавога памочніка (Siri, Google, Аліса). Якія меркаванні экспертаў адносна магчымасцей штучнага інтэлекту перасягнуць чалавечы інтэлект? ■

**Найважнейшай сацыяльнай праблемай становіцца ўзнікненне лічбавай няроўнасці, г. зн. падзел грамадства на тых, хто валодае інфармацыйнымі тэхналогіямі, і тых, хто не валодае *(«лічбавы***



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*разрыў»)*. У інфармацыйным грамадстве адсутнасць магчымасці карыстацца інфармацыйнымі тэхналогіямі і нізкі ўзровень навыкаў сеткавай камунікацыі разглядаюцца як новы від беднасці, сацыяльна-эканамічнай адсталасці.

Інфармацыйнае грамадства змяняе сферу побыту і вольнага часу. Шырока распаўсюджваецца *«віртуальны вольны час»*. Змяняецца мадэль зносін. Сацыяльныя сеткі набываюць асаблівую папулярнасць для міжасобаснай камунікацыі. Сфера прыватнага жыцця становіцца публічнай, з дапамогай электронных сетак яе лёгка кантраляваць.

**Дзе межы прыватнасці ў сацыяльных сетках?**

Сацыяльныя сеткі — гэта не толькі тэхналагічныя платформы, але і асаблівы тып бізнесу, прыбытак якому прыносіць продаж інфармацыі рэкламадаўцам аб карыстальніках (даступных звестак з медыяпрофілю чалавека і яго псіхалагічнага партрэта, створанага на базе ўліку «клікаў» і «лайкаў»). ■




Ці ведаеце вы бягучыя настройкі канфідэнцыяльнасці вашага ўліковага запісу ў сацыяльнай сетцы? Скарыстайцеся памяткай для праверкі бяспекі ў Сеціве. ■

Сеткавае асяроддзе змяняе і свядомасць чалавека. Прымяненне інфармацыйных сацыяльных тэхналогій становіцца інструментам кіравання. Накіраванасць уздзеяння можа быць рознай. Псіхаінфармацыйныя тэхналогіі могуць прымяняцца і для маніпулявання свядомасцю, ствараюць віртуальную залежнасць, дэфармуюць працэс сацыялізацыі. Прымяненне гэтых тэхналогій можа быць вельмі небяспечным для чалавека і грамадства наогул.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Інтэрнэт як глабальная інфармацыйная сістэма.** Сутнасць інтэрнэт-камунікацыі заключаецца ў прадастаўленні карыстальнікам хуткага доступу да атрымання самай шырокай і карыснай інфармацыі, а таксама да тэхналагічных рэсурсаў, якія даюць магчымасць людзям падтрымліваць зносіны і абменьвацца інфармацыяй.

Першапачаткова інфармацыйна-камунікатыўная прастора на аснове камп'ютарнай сеткі была створана ў ЗША ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гг. Да амерыканскага праекта падключыліся заходнееўрапейскія партнёры, і праект атрымаў міжнародны характар. У 1983 г. за гэтай інфармацыйнай сеткай замацавалася назва — інтэрнэт.

У 1989 г. брытанскі вучоны Цім Бернерс-Лі распрацаваў канцэпцыю глабальнай камп'ютарнай сеткі — Сусветнай павуціны (World Wide Web) і стварыў электронныя стандарты яе працы. У пачатку 1990-х гг. сфарміраваліся асноўныя магчымасці інтэрнэту, даступныя для сучасных карыстальнікаў. ■

Пераўтварыце тэкст пра распрацоўку Сусветнай павуціны ў гіпертэкст, на прыкладзе гіперспасылак якога прадэманструйце перавагі і недахопы спажывання і стварэння інфармацыі ў інтэрнэце. ■

З дапамогай інфаграфікі і дадатковых інтэрнэт-крыніц ахарактарызуйце этапы развіцця інтэрнэту ад Web 1.0, Web 2.0, Web 3.0. ■

Інтэрнэт стаў неад'емнай часткай жыцця людзей сучаснага свету. Сусветная павуціна дае доступ да гіганцкай глабальнай інфармацыйнай прасторы, пашырае магчымасці для бізнесу, паскарае працэс прыняцця рашэнняў. Камунікацыя становіцца хуткай і глабальнай.

Але інтэрнэт стварае і шэраг праблем тэхналагічнага і сацыяльнага плана. Гэта праблемы інфармацыйнай бяспекі, барацьба



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з распаўсюджваннем шкоднага праграмнага забеспячэння, сеткавай злачыннасцю, кібератакамі ў сеткавай прасторы. Сур'ёзнай праблемай стала праблема абароны інфармацыі і канфідэнцыяльнасці электронных зносін.

У інфармацыйным грамадстве фарміруецца *«лічбавая эканоміка»*, г. зн. эканамічная вытворчасць з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій. Асноўны прадукт вытворчасці — інфармацыйныя тавары і паслугі.

Інфармацыя становіцца асноўным эканамічным рэсурсам, таму абвастраецца канкурэнцыя ў сферы інфармацыйнай эканомікі. Гэтая канкурэнцыя набывае глабальны характар. Дзяржавай-лідарам становіцца тая дзяржава, якая займае першыя пазіцыі ў галіне вытворчасці сучасных ведаў і інфармацыі. Лідарства забяспечваецца новымі навуковымі адкрыццямі ў сферы інфармацыйных інавацый, якаснымі распрацоўкамі праграмнага забеспячэння, вытворчасцю камп'ютарнага і тэлекамунікацыйнага абсталявання. Канкурэнтамі ў гэтай сферы могуць станавіцца не толькі буйныя дзяржавы і транснацыянальныя карпарацыі, але і невялікія дзяржавы і фірмы, якія здольныя прапанаваць новыя высокія тэхналогіі, забяспечыць іх рацыянальнае выкарыстанне.

У розныя гады замежныя медыя ўключалі дадзеныя ІТ-брэнды ў «Топ-5 беларускіх ІТ-прадуктаў, якія заваявалі свет».

- Што вам вядома аб гэтых ІТ-прадуктах сёння?
- Складзіце ўласны топ-5 беларускіх ІТ-прадуктаў і параўнайце яго з актуальнымі апублікаванымі рэйтынгамі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Беларусь у інфармацыйную эпоху: магчымасці і перспектывы.** Развіццё інфармацыйнага грамадства з'яўляецца адным з прыярытэтаў развіцця Рэспублікі Беларусь. У 2005 г. у Беларусі быў створаны Парк высокіх тэхналогій (ПВТ), у якім прадстаўлены не толькі беларускія кампаніі, але і кампаніі з іншых краін. Асноўнымі відамі дзейнасці з'яўляюцца вытворчасць праграмнага забеспячэння і прадастаўленне IT-паслуг. Заказчыкамі прадукцыі ПВТ з'яўляюцца фірмы амаль з 70 краін, большая частка створанага праграмнага забеспячэння ідзе на экспарт.

Знайдзіце на сайце Парку высокіх тэхналогій (http://www.park.by) актуальную статыстыку наконт колькасці кампаній-рэзідэнтаў. Якая дынаміка змянення колькасці кампаній? ■

У краіне рэалізуецца Дзяржаўная праграма развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства. Мэтай праграмы з'яўляецца ўдасканаленне ўмоў для трансфармацыі чалавечай дзейнасці пад уздзеяннем інфармацыйных тэхналогій, якія ўключаюць фарміраванне лічбавай эканомікі, развіццё інфармацыйнага грамадства і ўдасканаленне электроннага ўрада. У цяперашні час ідзе лічбавая трансфармацыя працэсаў у сістэме адукацыі.

Інфармацыйнае грамадства прад'яўляе новыя патрабаванні да чалавека. Як знайсці сваё месца і быць паспяховым у свеце, дзе лавінападобна расце аб'ём інфармацыі, хуткімі тэмпамі ідзе лічбавая трансфармацыя ўсіх сфер жыцця грамадства, укараняецца штучны інтэлект?

Футурашок (ад англ. *future shock* — боязь будучыні) — гэта стрэс і дэзарыентацыя ў людзей, якія зведалі вельмі вялікую колькасць перамен за кароткі час. Дадзены тэрмін увёў у абарот у 1965 г. Э. Тофлер. Ці можна гаварыць пра футурашок сёння? Абгрунтуйце сваё меркаванне. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ва ўмовах насычанага інфармацыйнага асяроддзя рэзка ўзрастае патрэба ў якаснай адукацыі. Прынцыпы адукацыі ў інфармацыйным грамадстве: даступнасць, адкрытасць, бесперапыннасць. Чалавек не павінен засвойваць усё большую колькасць гатовых ведаў, а павінен навучыцца арыентавацца ў нарастальных плынях інфармацыі, умець эфектыўна асвойваць новыя навыкі і тэхналогіі, хутка адаптавацца і быць гатовым да пастаянных перамен у прафесійнай дзейнасці.



Крытычнае мысленне | Уменне планаваць | Развітыя навыкі вусных зносін | Арганізацыйныя навыкі

Ахарактарызуйце ўласны ўзровень сфарміраванасці ключавых кампетэнцый, якімі сёння павінен валодаць кожны чалавек.

Дапоўніце спіс кампетэнцый. Абгрунтуйце сваё меркаванне. ■

Будаваць эканоміку ведаў і ўвасабляць канцэпцыю ІТ-краіны ў Беларусі неабходна праз змяненні ў сістэме адукацыі і падрыхтоўку кадраў для новых рэалій. Напрыклад, 1 студзеня 2021 г. створаны Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Яго дзейнасць накіравана на выяўленне і развіццё ў школьнікаў здольнасці да навукова-даследчай і вынаходніцкай дзейнасці. Навучанне праводзіцца па трох напрамках: «зялёная хімія», «рабататэхніка» і «інфармацыйныя і камп’ютарныя тэхналогіі».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Пералічыце асноўныя прыметы інфармацыйнага грамадства.
2. Запоўніце табліцу «Уплыў інфармацыйнага грамадства на асноўныя сферы жыцця грамадства». Прывядзіце прыклады і зрабіце высновы.

| Эканамічная сфера | Сацыяльная сфера | Палітычная сфера | Культурная сфера |
|---|---|---|---|
| | | | |

3. Прааналізуйце эмблему і дэвіз «Лепшы час для новых ведаў» Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту. Як яны адлюстроўваюць прынцыпы адукацыі ў інфармацыйным грамадстве? Хто з'яўляецца мэтавай аўдыторыяй дадзенага адукацыйнага праекта?
4. Правядзіце SWOT-аналіз (ад абрэвіятурнага скарачэння выразу, які ў перакладзе з англійскай мовы азначае: S — strength — моцныя бакі; W — weakness — слабыя бакі; O — opportunities — магчымасці; T — threats — цяжкасці, пагрозы) развіцця інфармацыйнага грамадства ў Беларусі. ■

| | |
|---|---|
| S | W |
| O | T |

Выканайце міні-праект «Як інтэрнэт рэчаў змяняе жыццё людзей». Запішыце відэападкаст пра тое, як тэхналогіі інтэрнэта рэчаў (ад англ. Internet of Things, скарочана IoT) выкарыстоўваюцца ў паўсядзённым жыцці. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 5. Глабалізацыя

## Глабальны свет — адзіны свет?




Прааналізуйце свае паўсядзённыя зносіны. Ці ёсць у вас сябры ў сацыяльных сетках, якія жывуць у іншых краінах, на іншых кантынентах? Чым вы цікавыя адзін для аднаго? На якой мове падтрымліваеце зносіны? Якія агульныя тэмы абмяркоўваеце? ■

**Паняцце глабалізацыі.** У другой палове XX ст. чалавецтва ўступіла ў новы этап сацыяльнай эвалюцыі. Вызначальнай тэндэнцыяй гэтага этапу з'яўляецца глабалізацыя.

**Глабалізацыя** — гэта працэс усебаковага збліжэння розных краін і станаўлення адзінай сістэмы тэхналагічных, фінансавых, эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных сувязей на аснове найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Калі зыходзіць з аб'ектыўнага характару працэсу глабалізацыі, то варта вызначыць тыя асноўныя фактары, якія абумоўліваюць працэс.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Эканамічны*. Сусветная эканоміка становіцца ўзаемазалежнай, яна інтэгруецца ў адзінае цэлае. Змяншаюцца бар'еры паміж нацыянальнымі эканомікамі пад уплывам свабоднага капіталу і новых тэхналогій. Рамкі эканамічнай дзейнасці выходзяць за нацыянальныя межы, фарміруецца адзіная эканамічная прастора.

Эканамічная глабалізацыя вядзе да ўзмацнення ролі міжнародных арганізацый, такіх як Міжнародны валютны фонд (МВФ), Сусветны банк, Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА), Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР). Некаторыя ТНК маюць бюджэт, які перавышае нацыянальныя ВУП, і аказваюць уплыў на палітычныя рашэнні і працэсы глабалізацыі.



Лагатып якой кампаніі звычайна разглядаюць як сімвал глабалізацыі? Чаму?

Якую кампанію, заснаваную яшчэ ў 1600 г., можна лічыць першай транснацыянальнай карпарацыяй? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Палітычны.* Свабода перамяшчэння людзей, тавараў, паслуг, капіталаў садзейнічае размыванню нацыянальных межаў, узрастанню палітычнага ўплыву міжнародных арганізацый і транснацыянальных карпарацый. Разам з тым сярод ста найбуйнейшых карпарацый свету няма ніводнай проста глабальнай. Пра кожную вядома, у якой краіне знаходзіцца яе штаб-кватэра, каму яна плаціць падаткі, які ўрад лічыць сваім. Нават тэхналагічны ўзровень карпарацыі цалкам адлюстроўвае ўзровень краіны прыналежнасці.

*Сацыяльны.* Нераўнамернасць развіцця краін, беднасць шэрагу рэгіёнаў планеты спараджае масавую міграцыю людзей у пошуках працы і лепшага жыцця з бедных краін у больш паспяховыя. Гэта змяняе сацыяльную структуру краін, якія прымаюць мігрантаў, уплывае на сістэму адукацыі, культуру.

*Навукова-тэхналагічны.* Фарміруецца сусветная інавацыйна-тэхналагічная сістэма з яе асноўнымі напрамкамі — тэлекамунікацыі, біятэхналогіі, інфарматыка, новыя матэрыялы і крыніцы энергіі, касмічныя тэхналогіі і да т. п. Напрыклад, для барацьбы з пандэміяй каранавіруснай інфекцыі COVID-19 усе краіны свету зацікаўлены ў падключэнні да адзінай інфармацыйнай сістэмы аб навуковых даследаваннях захворвання, мерах прафілактыкі і эфектыўных спосабах лячэння, выніках апрабацыі вакцын.



Прааналізуйце карыкатуру Джэймса Гілрэя «Каровіна воспа, або Цудоўнае дзеянне новай прышчэпкі!» (1802). Чые аргументы (праціўнікаў ці прыхільнікаў вакцынацыі) высмейваў мастак у пачатку XIX ст.? Чаму вы так думаеце? Якія адносіны да прышчэпак у XXI ст.?

Чаму ў 2019 г. Сусветная арганізацыя аховы здароўя аднесла недавер да вакцынацыі да глабальных пагроз чалавецтву? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Інфармацыйны.* Дзякуючы тэлекамунікацыям, спадарожнікавай сувязі, камп'ютарным сістэмам і інтэрнэту свет стаў «вялікай вёскай». Інфармацыя аб падзеях у свеце распаўсюджваецца імгненна. Фарміруецца свайго роду планетарная свядомасць, адбываецца дыялог розных цывілізацый. Такім чынам само жыццё абвяргае міф пра несумяшчальнасць розных культур. Свет успрымаецца як непадзельная цэласнасць, у якой суісную шмат укладаў, звычаяў, нацыянальных асаблівасцей, вектараў развіцця.

Вынікам праведзенага ў 1967 г. амерыканскім псіхолагам С. Мілгрэмам эксперыменту «Свет цесны» стала сацыялагічная тэорыя шасці поціскаў рукі, згодна з якой кожны чалавек апасродкавана знаёмы з любым іншым жыхаром планеты праз ланцужок агульных знаёмых, які ў сярэднім складаецца з пяці чалавек. Ці можна лічыць такі вынік эксперыменту праявай глабалізацыі? Які след пакінула тэорыя шасці поціскаў рукі ў літаратуры і кінематографе?

*Экалагічны.* Нарастальная эканамічная моц чалавецтва патрабуе ўсё новых прыродных рэсурсаў, якія абмежаваны, вядзе да забруджвання рэк, акіянаў, паветра, апустыньвання зямель і да т. п. Узніклыя экалагічныя праблемы патрабуюць аб'яднання намаганняў ўсяго сусветнага супольніцтва для іх вырашэння, для аднаўлення экалагічнага балансу і стварэння здаровага асяроддзя.

*Культурны.* Уздзеянне глабалізацыі на сучасную культуру праяўляецца праз узрастанне ўплыву ўніверсальных, агульных для ўсяго чалавецтва феноменаў культуры (інтэрнэт, мода, спорт, навука, адзіная арганізацыя сістэмы адукацыі і інш.), а таксама праз узмацненне аднастайнасці форм моўных зносін, шырокае распаўсюджванне адзіных стандартаў вольнага часу, ладу жыцця наогул.

Глабалізацыя — не толькі аб'ектыўны працэс, выкліканы новымі тэндэнцыямі ў эканоміцы і камунікацыйнымі тэхналогіямі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

але і адпаведная палітыка, якая служыць пэўным інтарэсам. Глабалізацыя сучаснага свету, якая паскараецца, аслабляе дзяржаўны суверэнітэт і патрабуе стварэння інстытутаў наднацыянальнага характару.

**Супярэчлівы характар глабалізацыі.** Глабалізацыя ўяўляе сабой даволі складаны і супярэчлівы працэс. Галоўнымі суб'ектамі міжнародных адносін па-ранейшаму застаюцца дзяржавы, якія выбудоўваюць сваю знешнюю палітыку на аснове нацыянальных інтарэсаў. У той жа час расце значэнне міжнародных арганізацый (урадавых і няўрадавых), узмацняецца ўплыў ТНК, ствараюцца наддзяржаўныя кіраўнічыя структуры. У выніку часта ўзнікаюць супярэчнасці паміж нацыянальнымі інтарэсамі дзяржаў і патрабаваннямі міжнародных арганізацый, прыярытэтамі нацыянальнай бяспекі і інтарэсамі транснацыянальных карпарацый.

Глабалізацыя сёння суправаджаецца іншым, процілеглым па напрамку працэсам: *рэгіяналізацыяй* эканамічнай дзейнасці. Гэта глабалізацыя ў абмежаваных маштабах, якая ахоплівае групу краін, што ствараюць аб'яднанні, у якіх адбываецца вялікая ці малая лібералізацыя гандлю, руху капіталу і людзей у рамках адпаведнай інтэграцыйнай групіроўкі (напрыклад, Еўразійскі эканамічны саюз, членам якога разам з Расіяй, Арменіяй, Кыргызстанам і Казахстанам з'яўляецца Беларусь).

У канцы XX ст. для апісання супярэчлівасці глабалізацыйных працэсаў у сучасным свеце з'явілася таксама паняцце *«глакалізацыя»* (ад англ. *glocalisation*), утворанае ад слоў «глабалізацыя» і «лакалізацыя». Пад глакалізацыяй разумеюць суіснаванне разнапланавых тэндэнцый: на фоне глабалізацыі замест чаканага знікнення рэгіянальных адрозненняў адбываецца іх захаванне і ўзмацненне. Назіраецца павелічэнне інтарэсу да лакальных асаблівасцей, гістарычных традыцый, аднаўлення дыялектаў і інш.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кіраванне глабалізацыяй на карысць усіх застаецца вялікай праблемай. У Дэкларацыі тысячагоддзя, прынятай Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый у 2000 г., адзначана: «...Мы лічым, што галоўнай задачай, якая стаіць перад намі сёння, з'яўляецца забеспячэнне таго, каб глабалізацыя стала пазітыўным фактарам для ўсіх народаў свету. Гэта звязана з тым, што, хоць глабалізацыя адкрывае шырокія магчымасці, яе дабротамі зараз карыстаюцца вельмі нераўнамерна і нераўнамерна размяркоўваюцца яе выдаткі. Мы ўсведамляем, што краіны, якія развіваюцца, і краіны з пераходнай эканомікай сутыкаюцца з асаблівымі цяжкасцямі падчас прыняцця мер у сувязі з рашэннем гэтай галоўнай задачы».

Даведайцеся з дадатковых крыніц інфармацыі пра дасягненні мэт развіцця Дэкларацыі тысячагоддзя. ■




Дэкларацыя тысячагоддзя вызначыла дух працэсу глабалізацыі як заснаваны на прынцыпах свабоды, роўнасці, салідарнасці, цярплівасці, павагі да прыроды, узаемнай адказнасці, аднак ёсць небяспека, што працэс глабалізацыі, заснаваны на групавых інтарэсах найбагацейшых краін свету (так званага «залатога мільярда»), падрывае ўстойлівы светапарадак і ўзмацняе супрацьстаянне па лініях Поўнач — Поўдзень, Захад — Усход.

Знайдзіце ў крыніцах інфармацыі розныя карты, якія адлюстроўваюць умоўны падзел свету на «багатую Поўнач» і «бедны Поўдзень». Чаму некаторыя краіны на адных картах адносяцца да Поўначы, а на другіх — да Поўдня? ■





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Антыглабалізм.** Рэакцыяй на супярэчлівы характар глабалізацыі з'яўляецца ўзнікненне новых грамадскіх рухаў, у прыватнасці, антыглабалізму. *Антыглабалізм* — гэта грамадскі і палітычны рух, накіраваны супраць глабалізацыі ў яе сучаснай форме, якая прыносіць прыбытак глабальным транснацыянальным карпарацыям і грунтуецца на дамінаванні ЗША.

Супраціўленне глабалізацыі праяўляецца як на ўзроўні дзяржаў, так і на ўзроўні грамадскіх рухаў. Часцей за ўсё антыглабалістамі асуджаюцца негатыўныя сацыяльна-эканамічныя наступствы глабалізацыі і дэкларуюцца патрабаванні правядзення палітыкі «сацыяльна адказнай глабалізацыі». Лічыцца, што працэс глабалізацыі павінен быць звязаны з распаўсюджваннем прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці. Прыхільнікі антыглабалізму адзначаюць, што глабалізацыя паглыбляе экалагічныя праблемы, дазваляе ТНК пазбягаць кантролю і атрымліваць звышпрыбыткі за кошт эксплуатацыі найбяднейшых краін і народаў, раскрадання іх прыродных і іншых рэсурсаў.

Антыглабалісты выкарыстоўваюць тактыку прамога палітычнага ціску, прыцягваюць да сябе ўвагу СМІ, разлічваюць на маральную падтрымку грамадства. Большасць антыглабалісцкіх лідараў адмаўляюцца ўзаемадзейнічаць з сусветнымі фінансавымі інстытутамі і транснацыянальнымі карпарацыямі, сцвярджаючы, што інакш будуць садзейнічаць умацаванню пазіцыі апошніх.

Антыглабалісты прапануюць лакалізацыю вытворчасці для згортвання пераразвітога сусветнага падзелу працы; выступаюць за выраўноўванне аплаты працы работнікаў падобнай кваліфікацыі ва ўсіх краінах свету; рэалізацыю міжнародных стандартаў сацыяльнай абароны і аховы працы і міжнародную экспертызу нацыянальных заканадаўстваў у галіне працы; дэмакратычнае вырашэнне праблем міграцыі працоўнай сілы; выпрацоўку міжнародных нарматываў, якія абмяжоўваюць дзейнасць ТНК; спісанне пазык краін, што развіваюцца; увядзенне падаткаў на біржавыя спекуляцыі і да т. п.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Антыглабалісцкія арганізацыі і рухі вельмі неаднародныя, маюць мноства розных напрамкаў і плыняў. Дэманстрацыі антыглабалістаў у апошнія гады прымеркаваны, як правіла, да пасяджэнняў Сусветнага банка, СГА, МВФ, іншых міжнародных арганізацый, самітаў «Вялікай сямёркі» (G7) і «Вялікай дваццаткі» (G20). У гэтых арганізацыях антыглабалісты бачаць асноўных правадыроў палітыкі глабалізацыі, адказных за яе негатыўныя наступствы.

1. Пералічыце і канкрэтызуйце прыкладамі фактары глабалізацыі.
2. Складзіце пары супрацьлеглых наступстваў глабалізацыі, вызначце сферу жыцця грамадства і запоўніце табліцу «Наступствы глабалізацыі».

| Сфера жыцця грамадства | Наступствы глабалізацыі | |
|---|---|---|
| | пазітыўныя | негатыўныя |
| | | |

Наступствы глабалізацыі:

- Створана адзіная сусветная прастора, у межах якой бесперашкодна перамяшчаюцца людзі, эканамічныя рэсурсы, свабодна распаўсюджваюцца ідэі, веды.
- Паглыбленне міжнароднага падзелу працы забяспечвае рост яго прадукцыйнасці і садзейнічае зніжэнню сабекошту выробленай прадукцыі.
- Павышаецца ўзровень жыцця насельніцтва тых краін, якія ўзначалілі працэсы глабалізацыі, што адбываюцца ў сучасным свеце.
- Адбываецца збліжэнне сістэм нацыянальнага заканадаўства, а таксама культур розных краін, народаў.
- Узрастае нераўнамернасць эканамічнага развіцця і звязаная з гэтым небяспека дэградацыі эканомікі цэлых краін і рэгіёнаў, якія не змаглі знайсці сваё месца ў сістэме міжнароднага падзелу працы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- Культурная ўніверсалізацыя, пад якой разумеюць распаўсюджванне каштоўнасцей заходняй цывілізацыі на ўсе іншыя народы, нярэдка спараджае зваротную рэакцыю: рост ксенафобіі, нацыяналізму і рэлігійнага фундаменталізму.
- Масавыя і шмат у чым стыхійныя міграцыйныя працэсы, якія выкліканы разрывам ва ўмовах жыцця насельніцтва развітых і адсталых ў развіцці краін, прыводзяць да нарастання этнакультурнай напружанасці і нават варожасці ў развітых краінах.

3. Ці магчыма назваць працэс глабалізацыі сучаснага свету прагрэсіўным? Абгрунтуйце сваё меркаванне. ■

Выканайце міні-праект «Уплыў глабалізацыі на паўсядзённае жыццё», апісаўшы свае адзенне, харчаванне, гаджаты, падарожжы і да т. п. Вынікі прадстаўце ў выглядзе падборкі фотаздымкаў з каментарыямі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Станаўленне інфармацыйнай цывілізацыі»

1. Дайце азначэнне наступным паняццям: *глабалізацыя, гуманізм, інфармацыйнае грамадства, навукова-тэхнічны прагрэс, прагрэс, рэгрэс, цывілізацыя*.
2. З апорай на дадатковую літаратуру і матэрыялы СМІ ахарактарызуйце ролю і месца Беларусі ў цывілізацыйным працэсе.
3. Запоўніце параўнальную табліцу «Падыходы да вывучэння грамадства».

| Параметры | Сутнасць падыходу (погляд на гістарычны працэс) | Асноўныя паняцці, якія характарызуюць падыход | Аўтары і назвы канцэпцый |
|---|---|---|---|
| Фармацыйны | | | |
| Стадыяльны | | | |
| Тэхналагічны | | | |
| Цывілізацыйны | | | |

4. Як узаемазвязаны паняцці *прагрэс*, *гуманізм* і *глабалізацыя*? Выберыце форму прадстаўлення адказу (схема, інфаграфіка, эсэ, плакат, табліца, прэзентацыя і інш.).
5. Складзіце аблокі паняццяў, якія характарызуюць тэхнічны і духоўна-маральны прагрэс на розных этапах гістарычнага развіцця чалавецтва. Сфармулюйце асноўныя крытэрыі прагрэсу.
6. Прачытайце ўрывак з інтэрв'ю В. Сцёпіна газеце «СБ. Беларусь сёння» на Першым беларускім філасофскім кангрэсе (2017 г.). Напішыце на падставе дадзенага фрагмента інтэрв'ю нататкі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**для маладзёжнага выдання аб трансгуманізме як праяве антрапалагічнага крызісу.**

«Адной з праяў антрапалагічнага крызісу з’яўляюцца паскораныя мутацыі генетычнага кода чалавека, выкліканыя забруджваннем навакольнага асяроддзя. Узнікаюць мутацыі, якія разбураюць геном чалавека. Ёсць вялікія дасягненні медыцыны, якія адкрываюць шляхі да іх змянення. Шмат што можа даць генетычная інжынерыя. Але тут адкрываецца новая небяспека. Небяспека пачаць маніпуляцыю з генетычным кодам чалавека і рыхтаваць новага чалавека замест старога, які недасканалы. Ёсць цэлы напрамак абазначаны як трансгуманізм. Гэта выхад за межы гуманізму. Ён ставіць задачу сканструяваць новую думаючую істоту, якая ўжо і чалавекам не будзе. Гэта будзе постчалавек, які выйдзе на прасторы сусвету заваёўваць свет, а наша планіда складаецца ў тым, каб даць імпульс гэтаму развіццю. Па сутнасці праграма трансгуманізму — гэта шлях да знішчэння чалавека. У гэтым небяспека сучасных тэхналогій, калі мы не паставім іх пад гуманістычны кантроль. Патрэбна сацыяльна-гуманітарная экспертыза. Калі гэтага не рабіць, калі не выбіраць тыя напрамкі развіцця, якія адпавядаюць ідэалу захаваць біясферу, жыццё на Зямлі, захаваць чалавека як частку гэтай біясферы, магчымы самыя катастрафічныя сцэнарыі». ■

**7. Планету Зямля фарміруюць чатыры асноўныя сферычныя абалонкі: літасфера, гідрасфера, біясфера і атмасфера. У XX ст. з’явіліся канцэпцыі пра вылучэнні сфер, звязаных з дзейнасцю людзей. Расійскі вучоны Уладзімір Іванавіч Вярнадскі (1863—1945) стаў адным з заснавальнікаў вучэння аб наасферы. Наасфера (ад ст.-грэч. *νοῦς* — розум, *σφαῖρα* — шар; даслоўна — «сфера розуму») — сфера ўзаемадзеяння грамадства і прыроды, у межах якой разумная чалавечая дзейнасць становіцца вызначальным фактарам развіцця.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для развіцця наасферы характэрна:

- засяленне чалавекам усёй планеты;
- пераўтварэнне сродкаў сувязі і абмену паміж рознымі краінамі;
- узмацненне сувязей (у тым ліку палітычных) паміж дзяржавамі;
- перавага геалагічнай ролі чалавека над іншымі геалагічнымі працэсамі, якія працякаюць у біясферы;
- пашырэнне межаў біясферы і выхаду ў космас;
- адкрыццё новых крыніц энергіі;
- роўнасць людзей усіх рас і рэлігій;
- павелічэнне ролі народных мас у вырашэнні пытанняў і ўнутранай палітыкі;
- свабода навуковай думкі і навуковага пошуку ад ціску рэлігійных, філасофскіх і палітычных пабудоў і стварэнне ў грамадскім і дзяржаўным ладзе ўмоў, спрыяльных для свабоднай навуковай думкі;
- пад’ём дабрабыту людзей, стварэнне магчымасцей не дапусціць недаядання, голаду, галечы і аслабленне ўплыву хвароб;
- разумнае пераўтварэнне першаснай прыроды Зямлі з мэтай зрабіць здольнай задавальняць усе матэрыяльныя, эстэтычныя і духоўныя патрэбы колькасна нарастаючага насельніцтва;
- выключэнне войнаў з жыцця чалавецтва.

Якім чынам фарміраванне наасферы звязана з працэсамі глабалізацыі, навукова-тэхнічным і духоўна-маральным прагрэсам?

8. Ніводнае грамадства не з’яўляецца застылым, яно або прагрэсіруе, або рэгрэсіруе. Утопія (ад грэч. «добрае месца») — адлюстраванне ідэальнага грамадскага ладу ў мінулым або ва ўяўнай будучыні. Антыўтопія — процілегласць утопіі — апісанне непажаданага грамадства, якое адштурхоўвае ці палохае; дзеянне найчасцей адбываецца ў будучыні.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Томас Мор. «Утопія», 1516 г.
(ілюстрацыя з кнігі)




Олдас Хакслі.
«О дзівосны новы свет», 1931 г.
(фрагмент сучаснай вокладкі)

Як утопіі і антыўтопіі адлюстроўваюць бачанне грамадскага развіцця? Прывядзіце прыклады сучасных літаратурных і кінематаграфічных твораў гэтых жанраў. Якія дасягненні і праблемы грамадскага развіцця там паказаны?

9. Напішыце эсэ на адну з прапанаваных тэм.
   - «Не цывілізацыі кантралююць дзеянні дзяржаў, а дзяржавы вызначаюць лёс цывілізацый».
   - «Прагрэсіўны рух будзе працягвацца сёння і ў будучыні, нягледзячы на выпадковыя адхіленні».
   - «Будучыня ўжо змяняецца, і гэтыя змены незваротныя» *(Э. Ласло)*.
   - «Заўтра заўсёды позна» *(Ф. М. Сарагоса)*.
10. Аформіце погляды філосафаў, прыхільнікаў розных падыходаў да тыпалогіі грамадстваў, у выглядзе палемікі ў сацыяльных медыя (каментарыі пад пастом у сацыяльнай сетцы, чат у месенджары і інш.).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# II Беларусь у сусветным супольніцтве

## 1 Што такое?

- Геапалітыка
- Міжнароднае гуманітарнае права
- Нацыянальныя інтарэсы

## 2 Як развіваюцца?

- Міжнародныя адносіны
- Інтэграцыйныя аб’яднанні

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Геапалітыка і дыпламатыя
- Генеральная Асамблея і Савет Бяспекі ААН

## 4 Як узаемазвязаны?

- Геапалітыка і інтэграцыя
- Інфармацыя і бяспека

## 5 Якія вылучаюцца?

- Прынцыпы знешняй палітыкі
- Пагрозы нацыянальнай бяспецы

**Свет вялікі — Беларусь адна!**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 6. Сусветнае супольніцтва у XXI стагоддзі






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Фактары разнастайнасці сучаснага свету.** Разнастайнасць сучаснага свету заключаецца ў тым, што на нашай планеце ў 2021 г. пражываюць 7,7 мільярда чалавек, якія належаць да розных расавых, моўных і этнічных груп, вызнаюць розныя рэлігіі ці прытрымліваюцца атэістычных поглядаў, вучацца і працуюць у розных краінах свету, з'яўляюцца грамадзянамі розных дзяржаў і па-рознаму ідэнтыфікуюць сваю цывілізацыйную прыналежнасць. Сёння паспяховае развіццё любога грамадства залежыць ад яго здольнасці падтрымліваць баланс паміж захаваннем уласнай культурнай самабытнасці і далучэннем да дасягненняў сусветнай цывілізацыі.

**Чалавецтву жыццёва неабходна культурная разнастайнасць?**



Як вы лічыце, што азначае рэкламны слоган турыстычнага агенцтва «Адкрый для сябе Беларусь!»? Чым можна растлумачыць нарастанне інтарэсу да нацыянальных культур і традыцый у сучасным свеце? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У разнастайным свеце важна разумець, якім чынам існуючыя ў розных краінах рэлігійныя, культурныя, сямейныя каштоўнасці трансфармуюцца ў палітычныя і эканамічныя мэты. Часткі свету — рэгіёны, краіны — акрамя геаграфічнага становішча і прыродна-кліматычных умоў, культуры, рэлігіі і традыцый адрозніваюцца палітычным ладам, узроўнем навукова-тэхнічнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**Фактары разнастайнасці сучаснага свету**

| | |
|---|---|
| Узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця | Узровень навукова-тэхнічнага развіцця |
| Прыродна-кліматычныя асаблівасці | Культурна-гістарычныя асаблівасці |
| Геаграфічныя асаблівасці | Палітычная арыентацыя |

Прывядзіце прыклады 6 краін з розных кантынентаў для пацвярджэння дзеяння фактараў разнастайнасці сучаснага свету.

**Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя сістэмы ў сучасным свеце.** Палітычная карта таксама адлюстроўвае разнастайнасць сучаснага свету, бо ўсе краіны адрозніваюцца па наступных паказчыках:

- геаграфічнае становішча;
- велічыня тэрыторыі;
- колькасць насельніцтва;
- сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва;
- форма дзяржавы.

У сучасным свеце суіснуюць розныя эканамічныя сістэмы: ёсць краіны, якія вылучаюцца высокім узроўнем развіцця эканомікі і даходы іх грамадзян стабільна высокія, а ёсць краіны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з неэфектыўнымі эканомікамі і нізкім узроўнем жыцця насельніцтва.

Большую частку краін сучаснага свету складаюць краіны, што развіваюцца, сярод якіх шмат такіх, што раней былі калоніямі эканамічна развітых еўрапейскіх дзяржаў. Для іх уласцівыя такія рысы, як шматукладная эканоміка, высокія тэмпы росту насельніцтва, пераважна сыравінная спецыялізацыя ў міжнародным падзеле працы і моцная залежнасць ад замежнага капіталу. Праблема галечы ў сучасным свеце ў той ці іншай ступені датычыцца ўсіх краін.

Для аналізу эканамічнага становішча краін выкарыстоўваюць шэраг важных крытэрыяў, якія характарызуюць дынаміку і стан сусветнай эканомікі. Узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця — найбольш распаўсюджаны крытэрый класіфікацыі краін у сусветнай гаспадарцы. Ён характарызуецца аб'ёмам ВУП/ВНП на душу насельніцтва, галіновай структурай ВУП, узроўнем і якасцю жыцця.

Паказчыкам, які абагульняе найбольш важныя з пералічаных паказчыкаў, з'яўляецца Індэкс чалавечага развіцця (ІЧР).

Індэкс чалавечага развіцця (Human Development Index) — гэта камбінаваны паказчык, створаны Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый для міжкраінавага параўнання. Распрацаваны ў 1990 г. групай эканамістаў на чале з пакістанскім вучоным Махбубам уль-Хакам. Пры падліку ІЧР улічваюцца 3 віды паказчыкаў:

- чаканая працягласць жыцця (ацэньвае даўгалецце);
- узровень граматнасці насельніцтва краіны (сярэдняя колькасць гадоў, патрачаных на адукацыю) і чаканая працягласць навучання;
- узровень жыцця, які ацэньваецца праз валавы нацыянальны даход на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці.

У залежнасці ад значэння ІЧР краіны прынята класіфікаваць па ўзроўні развіцця: вельмі высокі, высокі, сярэдні і нізкі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Карта свету па ІЧР, 2020



- 0,900 і вышэй
- 0,850–0,899
- 0,800–0,849
- 0,750–0,799
- 0,700–0,749
- 0,650–0,699
- 0,600–0,649
- 0,550–0,599
- 0,500–0,549
- 0,450–0,499
- 0,400–0,449
- ніжэй за 0,399
- няма звестак

Да краін з якім узроўнем чалавечага развіцця адносілася Беларусь у 2020 г.? У якім рэгіёне свету найбольшая колькасць краін з высокім ІЧР, у якім — найменшая? Чым гэта можна растлумачыць?

Даведайцеся пра актуальны ІЧР Беларусі і параўнайце яго з паказчыкамі суседніх краін. Якія высновы можна зрабіць?

**Міграцыйная мабільнасць і яе наступствы.** Людзі перамяшчаюцца з месца на месца з даўніх часоў. Калі адны пераязджаюць у пошуках лепшай работы, адукацыі, эканамічных даброт ці для ўз'яднання з сям'ёй, другія вымушаны ўцякаць ад канфліктаў, тэрарызму ці з прычыны праследу з-за сваёй расы, веравызнання, грамадзянства і інш. Расце колькасць тых, хто



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

змяняе месца жыхарства ў выніку змены клімату, стыхійных бедстваў ці іншых фактараў экалагічнага характару. У сучасным свеце мы назіраем перамяшчэнне людзей у беспрэцэдэнтных маштабах. **Міграцыйная мабільнасць** — перамяшчэнне індывідаў і сацыяльных груп у працэсе змены імі месца жыхарства.

Згодна з азначэннем Міжнароднай арганізацыі па міграцыі мігрантам з'яўляецца любая асоба, якая перамяшчаецца або ўжо перамясцілася цераз міжнародную мяжу ці ўнутры краіны і пакінула месца свайго звычайнага жыхарства незалежна ад:

- юрыдычнага статусу асобы;
- добраахвотнага ці нядобраахвотнага характару перамяшчэння;
- прычын перамяшчэння.

Успомніце, чым адрозніваецца эміграцыя ад іміграцыі. ■

У залежнасці ад тэрміну міграцыя можа быць часовай і сталай. Па характары волевыяўлення міграцыя можа быць вымушанай і добраахвотнай. Вымушанай называюць, напрыклад, перасяленне з гарачых кропак ці раёна стыхійнага бедства. Часта за такім перамяшчэннем ідзе вяртанне на радзіму — рэпатрыяцыя.

Зыходзячы з мэты міграцыя можа быць працоўнай, камерцыйнай (у сувязі з вядзеннем бізнесу), адукацыйнай, рэлігійнай (паломніцтва), у сувязі з утварэннем ці ўз'яднаннем сям'і, у сувязі з вядзеннем традыцыйнай гаспадаркі (качэўніцтва) і да т. п. Працоўных мігрантаў, якія выехалі на працу за мяжу, часта называюць «гастарбайтарамі» — ад нямецкіх слоў «госць» і «работнік».

Па крытэрыі законнасці міграцыя можа быць легальнай і нелегальнай. Нелегальная міграцыя звязана не толькі з асаблівымі цяжкасцямі для чалавека ў пошуках жылля, працы, усталявання сталых сацыяльных кантактаў, але і з адказнасцю за незаконнае перасячэнне мяжы і/ці парушэнне правілаў знаходжання ў краіне іміграцыі. На міжнародным і нацыянальным узроўні звяртаюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**асаблівую ўвагу на нелегальную міграцыю ўразлівых катэгорый — жанчын, дзяцей, якая часта адбываецца падманным шляхам або гвалтоўна з мэтай гандлю, прымусу да працы, прастытуцыі, і ўзмацняюць барацьбу з такой негатыўнай з'явай, як «трафік мігрантаў». Барацьба з гандлем людзьмі з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Беларусі на міжнароднай арэне.**

Выкажыце здагадку, якія з краін з'яўляюцца краінамі-донарамі і краінамі-рэцыпіентамі міграцыйных плыняў. Якія могуць быць станоўчыя і адмоўныя наступствы міграцыі для мігрантаў, для краін? Як міграцыя датычыцца Беларусі? Ці з'яўляецца наша рэспубліка краінай прызначэння, паходжання ці транзіту для міграцыі? ■

**Беспрацоўе, галеча, ваенныя канфлікты вымушаюць людзей пакідаць свае краіны і перасяляцца ў больш стабільныя дзяржавы, часам рызыкуючы ўласным жыццём. Нізкі ўзровень адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі большасці імігрантаў не дазваляе ім атрымаць працу ў высокатэхнічных сферах, садзейнічае распаўсюджванню сярод іх радыкальных поглядаў. Паміж жыхарамі развітых краін і тымі, хто прыбыў, назіраецца адрозненне ў менталітэце, звычаях, узнікаюць канфлікты.**



У горадзе Таронта (Канада) усталяваны манумент скульптара Францыска Пірэлі. Ён прысвечаны ідэям і палітыцы мультыкультуралізму, якая прадугледжвае захаванне і развіццё этнічных і культурных адметнасцей, паралельнае існаванне культур розных народаў у грамадстве.

Вызначце сімвалы, прадстаўленыя ў дадзенай скульптурнай кампазіцыі, і ідэі, якія яны адлюстроўваюць. З якімі праблемамі сутыкаецца грамадства, увасабляючы гэтыя ідэі на практыцы? Чаму палітыку мультыкультуралізму ў 2010-х гг. сталі крытыкаваць у многіх еўрапейскіх краінах? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сёння ў многіх краінах адзначаецца пад’ём расізму, ксенафобіі і антыімігранцкіх настрояў. Мігранты часта становяцца мішэнню для расісцкіх ці ксенафобных палітыкаў, якія абвінавачваюць іх у сацыяльных і эканамічных праблемах сваіх супольніцтваў. «Мігрантафобія» стала сур’ёзнай праблемай, якая перашкаджае інтэграцыі і ўзаемаразуменню і прыводзіць да адчужэння і гвалту ў адносінах да мігрантаў у многіх краінах.

1. Якія крытэрыі выкарыстоўваюцца для аналізу эканамічнага стану розных краін свету?
2. Стварыце схему «Віды міграцыі».
3. Запоўніце табліцу «Прычыны эміграцыі і іміграцыі». ■

| | | |
|---|---|---|
| **Эміграцыя** | **Што вымушае людзей з’ехаць з краіны** | |
| **Іміграцыя** | **Што матывуе людзей перасяліцца ў краіну** | |

Выканайце міні-праект «Беларусь у рэйтынгах». Распрацуйце інфаграфіку, якая будзе візуалізаваць інфармацыю пра месца Беларусі ў міжнародных рэйтынгах у розных сферах. Выкарыстайце памятку для працы з рэйтынгамі ў медыя. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 7. Устойлівае развіццё — мадэль развіцця XXI стагоддзя

## Ведаем мэты, бачым арыенціры, выбіраем прыярытэты!











Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце ўстойлівага развіцця.** Ідэя ўстойлівага развіцця ўзнікла ў выніку ўсведамлення чалавецтвам пагрозы незваротных змен у навакольным асяроддзі. Спажывецкія адносіны чалавека да прыроды, усё больш інтэнсіўнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў прывялі грамадства да мяжы экалагічнай катастрофы. Ва ўмовах нарастаючай колькасці насельніцтва Зямлі прыйшло разуменне таго факта, што прыродныя рэсурсы для эканамічнага росту абмежаваны.

**Устойлівае развіццё грамадства** — гэта задавальненне патрэб сучаснага пакалення без нанясення шкоды будучым пакаленням людзей. У сістэме «чалавек — гаспадарка — прырода» ўсё ўзаемазвязана, таму жыццёва неабходна збалансаванае развіццё сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай сфер.

25 верасня 2015 г. 193 дзяржавы — члены ААН прынялі Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 г. (Парадак-2030). Ён утрымлівае 17 Мэт устойлівага развіцця (МУР), што фарміруюць вобраз будучага свету, у якім адсутнічаюць галеча і голад, дзе людзі могуць рэалізаваць свой патэнцыял ва ўмовах роўнасці, у здаровым навакольным асяроддзі, дзе выкарыстоўваюцца рацыянальная мадэлі спажывання і вытворчасці, прымаюцца неадкладныя меры захавання планеты для ўстойлівай жыццядзейнасці сучаснага і будучага пакаленняў. Мэты і задачы ў галіне ўстойлівага развіцця комплексныя і непадзельныя, глабальныя па сваім характары і ўніверсальна прыдатныя, пры гэтым яны даюць магчымасць улічваць нацыянальныя адметнасці, магчымасці і ўзровень развіцця кожнай дзяржавы, паважаюць нацыянальныя стратэгіі і прыярытэты.

Устойлівае развіццё — гэта не толькі самастойная мэта, але і найлепшы інструмент, які мае ў сваім распараджэнні міжнароднае грамадства для папярэджвання самых розных праблем. Зараз задача стаіць у тым, каб мабілізаваць усе намаганні для дасягнення рэальных вынікаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Напрамкі ўстойлівага развіцця.** У сучасных умовах змяняецца асноўная мэта грамадскага прагрэсу ў сувязі з пераходам на новыя прынцыпы ўзаемадзеяння прыроды, грамадства і чалавека. Найвышэйшай мэтай становіцца чалавек, яго духоўнае і фізічнае здароўе ў спрыяльным і бяспечным асяроддзі. Сёння недапушчальна вялікая няроўнасць у дабрабыце розных слаёў насельніцтва, а таксама цэлых краін і народаў. Новая цывілізацыйная мадэль уключае сучаснае разуменне сацыяльнай справядлівасці, эканамічнай эфектыўнасці і экалагічнай абароненасці.

**Культ спажывання — купля дзеля куплі?**




*Меню сайта гандлёвага цэнтра*

Грамадства развітых краін свету ў цяперашні час нярэдка характарызуюць як «грамадства спажывання». Якія адметныя рысы грамадства спажывання? Ці магчыма дасягненне ўстойлівага развіцця, калі ўсе краіны на планеце паставяць сабе на мэце дасягненне высокага ўзроўню асабістага спажывання? ■

*Эканамічны напрамак* устойлівага развіцця прадугледжвае змяненне структуры спажывання і вытворчасці. Калі б усе краіны свету наблізіліся да стандартаў спажывання развітых краін на цяперашняй тэхналагічнай аснове, то гэта магло б прывесці да катастрофы. Высокі ўзровень спажывання патрабуе інтэнсіўнай эксплуатацыі прыродных рэсурсаў — нафты, газу, вугалю і да т. п.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спальванне вугалю, нафтапрадуктаў забруджвае атмасферу, выклікае парніковы эфект, парушае экалагічную раўнавагу.

Новае разуменне эканамічнага росту постіндустрыяльнай эканомікі заснавана на ўкараненні рэсурсазберагальных тэхналогій. Найважнейшае значэнне мае выкарыстанне ў прамысловасці, на транспарце, у дамашняй гаспадарцы чыстай энергіі сонца, ветру, прыліваў і адліваў і да т. п. Укараненне ў вытворчасць найноўшых дасягненняў стала асноўным напрамкам эканамічнага развіцця. Менавіта новыя навуковыя распрацоўкі і іх укараненне становяцца асновай для пераходу да рэсурсазберагальнага і энергабяспечнага тыпу гаспадаркі. Таму важная дзяржаўная падтрымка навукі, якая фарміруе інавацыйны патэнцыял структурных пераўтварэнняў у эканоміцы. Усё больш шырокае распаўсюджванне атрымлівае зялёная эканоміка, вытворчасць экалагічна чыстай прадукцыі перш за ўсё ў сельскай гаспадарцы.






Што такое электробус? Дзе знаходзіцца самы вялікі ветрапарк у Беларусі? Знайдзіце інфармацыю, якія напрамкі з'яўляюцца прыярытэтнымі для развіцця зялёнай эканомікі ў нашай краіне.

Шэраг краін прымае нормы, якія забараняюць выкарыстанне пластыку, аднаразовага посуду, поліэтыленавых пакетаў. Аднак важная і адказнасць бізнесу, саміх грамадзян. Напрыклад,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ёсць крамы, дзе пакупкі ўпакоўваюцца у шматразовыя мяшочкі ці ў прынесеную з сабой тару. Гэта дазваляе зменшыць колькасць адходаў, у першую чаргу поліэтыленавых, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе. Напэўна, вы заўважалі і кантэйнеры для збору адходаў рознага паходжання — для сарціроўкі адходаў першапачаткова на пластык, шкло, паперу і інш. Падтрымліваючы энерга- і водазберажэнне, правільную ўтылізацыю адходаў, мы падаўжаем сабе жыццё і робім яго больш якасным.






У чым «плюсы» і «мінусы» litрознай тары для пакупак у краме з пункту гледжання грашовых укладанняў вытворцы і спажыўца, экалагічных наступстваў? Якія віды ўпакоўкі з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі ў нашы дні? ■

*Сацыяльны напрамак* устойлівага развіцця ўключае комплекс мер, накіраваных на захаванне жыцця і здароўя чалавека, павышэнне дабрабыту насельніцтва. Працяглае здаровае і актыўнае жыццё грамадзян — неабходная ўмова забеспячэння ўстойлівасці развіцця любой краіны.

Захаванне здароўя насельніцтва звязана з прадухіленнем распаўсюджвання небяспечных інфекцыйных хвароб. Уздзеянне шэрагу адмоўных фактараў асяроддзя пражывання, няякаснай пітной вады, курэння выклікаюць сардэчна-сасудзістыя захворванні.

У шэрагу краін актуальнай з'яўляецца задача скарачэння дзіцячай смяротнасці, паляпшэння аховы мацярынства.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Палітыка аховы і ўзмацнення здароўя людзей у кожнай краіне павінна засноўвацца на прынцыпах, распрацаваных Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя. Гаворка ідзе аб прыярытэтным развіцці першаснай медыка-санітарнай дапамогі як асновы сістэмы аховы здароўя, аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва і да т. п.




Прааналізуйце сэрвіс талон.бай — адзіную інтэрнэт-рэгістратуру Беларусі. Якія паслугі насельніцтву прапануе дадзены сэрвіс? Якая інфармацыя ўтрымліваецца ў асабістым кабінеце карыстальніка? Як сэрвіс талон.бай характарызуе сістэму аховы здароўя нашай краіны? ■

Важнай задачай сусветнага супольніцтва з'яўляецца барацьба з галечай. Мяжа галечы вызначаецца суадносінамі даходаў і выдаткаў, неабходнымі для забеспячэння мінімальнага ўзроўню жыцця. Краіны — члены ААН дамагліся сур'ёзных поспехаў у ліквідацыі голаду і галечы. Многія краіны прынялі нацыянальныя «межы галечы» па даходах на душу насельніцтва.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі ААН, «абсалютная галеча» азначае задавальненне толькі асноўных фізіялагічных і сацыяльных патрэб. «Адносная галеча» азначае мінімальны ўзровень жыцця, а не пытанне выжывання. Мяжа «адноснай галечы», як правіла, устанаўліваецца на ўзроўні 40 ці 50 % ад сярэдняга даходу на душу насельніцтва краіны. Праблема галечы звязана з высокім узроўнем беспрацоўя ў шэрагу краін. Гэта адна з галоўных прычын сацыяльна-эканамічнай нестабільнасці, масавай міграцыі насельніцтва з бедных краін у спрыяльныя дзяржавы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дасягненне сацыяльнай стабільнасці ўключае абарону грамадства, асобы ад злачынных замахаў. У сувязі з глабалізацыяй міжнародны характар набылі такія злачынныя дзеянні, як абарот наркотыкаў, незаконная міграцыя, гандаль зброяй, легалізацыя злачынных даходаў і да т. п. У барацьбе са злачыннасцю ўзмацняецца міжнароднае супрацоўніцтва з адпаведнымі структурамі ААН, міжурадавымі арганізацыямі.

*Экалагічны напрамак* устойлівага развіцця ўключае змяненне прыярытэтаў у экалагічнай і эканамічнай палітыцы дзяржаў. Ахова навакольнага асяроддзя становіцца неад’емнай часткай развіцця, пры якім захоўваецца прыродна-рэсурсны патэнцыял як для цяперашняга, так і для будучых пакаленняў. Сёння шмат увагі надаецца павышэнню экалагічнай бяспекі гаспадарчых аб’ектаў, тэхнікі, тэхналогіі, матэрыялаў. Важнае значэнне мае фінансаванне прыродаахоўных мерапрыемстваў, узмацненне прававой адказнасці за прыродаахоўныя парушэнні.

Экалагічны аспект устойлівага развіцця прадугледжвае захаванне біялагічнай разнастайнасці, бяспечнае прымяненне высокіх тэхналогій, хімічных рэчываў. Важна пры рашэнні ўсіх сацыяльна-эканамічных праблем улічваць патрабаванні захавання жыцця і здароўя чалавека, навакольнага асяроддзя.



Выканайце міні-праект «Экалагічная ініцыятыва». Правядзіце пошук актуальнай інфармацыі аб стане экалагічнай абстаноўкі ў рэгіёне вашага пражывання па адным з кірункаў: «Водазберажэнне», «Якасць атмасфернага паветра», «Біяразнастайнасць», «Энергазберажэнне», «Абыходжанне з адходамі». Прапануйце ідэю мерапрыемства для паляпшэння экалогіі ў населеным пункце, дзе вы пражываеце. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Усе 17 Мэт устойлівага развіцця ўзаемазвязаныя і ўніверсальныя, бо галоўны падыход — «нікога не пакідаць у баку». З аднаго боку, гэта захаванне інтарэсаў кожнага, з другога — усе павінны быць прыцягнуты да рэалізацыі пастаўленых мэт.

Партнёрства і супрацоўніцтва — умовы дасягнення МУР, якія структурыруюць па пяці асноўных напрамках, так званых 5P: людзі (people), росквіт (prosperity), мір (peace), партнёрства (partnership), планета (planet). МУР — гэта стратэгія ўсяго чалавецтва, і праблематыка іх дасягнення трывала замацоўваецца ў стратэгічным нацыянальным парадку дня ўсіх дзяржаў свету.

**Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь.** У 2017 г. была прынята Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 г. (НСУР-2030), заснаваны пост Нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, створаны Савет па ўстойлівым развіцці на ўзроўні намеснікаў кіраўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання і кіраўніцтва рэгіёнаў краіны.




На аснове інфаграфікі ў пачатку параграфа зрабіце сарціроўку мэт, якія, на ваш погляд, першачарговыя і вельмі важныя для Беларусі, з дапамогай пытанняў «Гэта важна?» (так/не) і «Гэта тэрмінова?» (так/не). З дапамогай рэсурсу https://sdgs.by, прысвечанага Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі, праверце свае меркаванні. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Нацыянальная стратэгія ўключае ў сябе задачы ўстойлівага развіцця ў сферах эканомікі і экалогіі, інвестыцый і інавацый, а таксама задачы ўмацавання здароўя нацыі і дасягнення высокай якасці жыцця (за кошт развіцця патэнцыялу кожнага чалавека), стварэння працоўных месцаў, якія забяспечваюць стабільную занятасць і высокія даходы на аснове лічбавізацыі эканомікі, заахвочвання да адукацыі на працягу ўсяго жыцця, паўсюднага ўкаранення зялёных тэхналогій пры захаванні прыроды і экалагічна бяспечнага асяроддзя пражывання для сучасных і будучых пакаленняў.**

**Як моладзь удзельнічае ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця Беларусі?**




Маладзёжны пасол МУР — гэта прадстаўнік са студэнцкага асяроддзя, які абіраецца для прасоўвання Мэт устойлівага развіцця і кіруецца слоганам «Ва ўстойлівую будучыню разам». Маладзёжныя пасланы папулярызуюць Мэты ўстойлівага развіцця сярод моладзі, інфармуюць яе пра механізмы дасягнення паказчыкаў устойлівага развіцця на лакальным і нацыянальным узроўнях, дапамагаюць набываць маладым людзям веды і прафесійныя кампетэнцыі XXI стагоддзя, асвойваць ідэі і прынцыпы ўстойлівага развіцця.

Як вы лічыце, чаму конкурс коміксаў (2018 г.) для ўключэння моладзі ў парадак Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі назвалі «Супергероі для Супермэт»? На сайце «Мэты ўстойлівага развіцця ў Беларусі» http://sdgs.by даведайцеся пра новыя маладзёжныя праекты і вазьміце ўдзел. ■

**Дасягненне МУР з'яўляецца амбіцыйнай задачай, якую краіны не здольны адужаць самі, мабілізуючы толькі ўнутраныя**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

рэсурсы. Дзяржавы, міжурадавыя і няўрадавыя арганізацыі, усяго сусветнага супольніцтва ў цэлым і кожны грамадзянін паасобку могуць і павінны ўносіць уклад у забеспячэнне ўстойлівага развіцця. Супрацоўніцтва на міжнародным узроўні ў дадзеным выпадку адыгрывае важную ролю. Сёння наша краіна імкнецца да таго, каб пашыраць кантакты ў сусветным супольніцтве, пераймаць перадавы вопыт, які будзе працаваць на карысць грамадства і краіны. Нам яшчэ шмат чаго трэба зрабіць для таго, каб забяспечыць устойлівае развіццё краіны.

1. Якія сферы жыцця грамадства ў першую чаргу закранае канцэпцыя ўстойлівага развіцця?
2. Якая роля Беларусі ў рэалізацыі канцэпцыі ўстойлівага развіцця на рэгіянальным узроўні? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
3. Рэйтынг «Індэкс дасягнення глабальных Мэт устойлівага развіцця» складаецца для 156 краін свету на падставе 100 паказчыкаў, звязаных з выкананнем МУР. Даведайцеся актуальную інфармацыю пра месца Рэспублікі Беларусь у дадзеным рэйтынгу і ацаніце прасоўванне нашай краіны ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Выкарыстоўвайце памятку для працы з рэйтынгамі ў медыя. ■

Распрацуйце прынт для майкі ці сумкі, прысвечаны дасягненню Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 8. Прававыя асновы міжнародных адносін

**Міжнародны дагавор, які ўступіў у сілу, становіцца абавязковым для ўсіх яго ўдзельнікаў?**

**Крыніцы**

- Міжнародныя дагаворы
- Міжнародныя звычаі

**Прынцыпы**

- Імператыўны характар
- Маральная, палітычная і юрыдычная сіла




**Гаагскія канвенцыі і дэкларацыі (1899 г. і 1907 г.)**

Рэгулююць сродкі і метады вядзення баявых дзеянняў

**Галіны**

- Эканамічнае права
- Экалагічнае права
- Касмічнае права
- Гуманітарнае права і да т. п.

Мэта: прадухіленне ці змяншэнне людскіх пакут у час узброеных канфліктаў

**Жэнеўскія канвенцыі (1949 г.)**

Абараняюць ахвяр вайны (грамадзянскіх асоб, ваеннапалонных, параненых)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Асноўныя прынцыпы міжнароднага права.** Сучасны свет характарызуецца разнастайнасцю міжнародных адносін: палітычных, эканамічных, навукова-тэхнічных, культурных, рэлігійных і інш. Гэтыя адносіны рэгулююцца міжнародным правам. *Міжнароднае права* — сістэма міжнародна-прававых норм і прынцыпаў, якія рэгулююць адносіны паміж удзельнікамі міжнародных адносін. У залежнасці ад сферы супрацоўніцтва суб'ектаў міжнародных адносін вылучаюць розныя галіны міжнароднага права, напрыклад, міжнароднае эканамічнае права, міжнароднае экалагічнае права, міжнароднае мытнае права, міжнароднае касмічнае права, міжнароднае марское права, міжнароднае гуманітарнае права і інш.

Прынцыпы міжнароднага права валодаюць палітычнай, маральнай і юрыдычнай сілай.

### Асноўныя прынцыпы міжнароднага права

- Суверэнная роўнасць дзяржаў
- Неўмяшанне ва ўнутраныя справы дзяржаў
- Раўнапраўе і самавызначэнне народаў
- Тэрытарыяльная цэласнасць дзяржаў
- Непарушнасць дзяржаўных межаў
- Непрымяненне сілы і пагрозы сілай у міжнародных адносінах
- Мірнае вырашэнне міжнародных спрэчак
- Павага правоў чалавека і асноўных свабод
- Добрасумленнае выкананне міжнародных абавязацельстваў
- Супрацоўніцтва дзяржаў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прывядзіце гістарычныя прыклады парушэння асноўных прынцыпаў міжнароднага права ў другой палове XX ст. Чым, на ваш погляд, былі абумоўлены гэтыя парушэнні? Якімі былі іх наступствы? ■

Асноўныя прынцыпы міжнароднага права маюць імператыўны характар, г. зн. яны бясспрэчныя для ўсяго міжнароднага супольніцтва.

Прынцып *суверэннай роўнасці дзяржаў* азначае, што ўсе дзяржавы ў міжнародных адносінах маюць роўныя правы і абавязкі і з'яўляюцца раўнапраўнымі членамі сусветнага супольніцтва. Кожная дзяржава павінна паважаць суверэнітэт іншых дзяржаў. Яны маюць права самастойна вырашаць пытанні аб удзеле ў міжнародных канферэнцыях, арганізацыях і міжнародных дагаворах. Тэрытарыяльная цэласнасць і палітычная незалежнасць дзяржаў недатыкальныя, а дзяржаўныя межы могуць змяняцца толькі на падставе дамоўленасці і ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага права.

Згодна з прынцыпам *мірнага вырашэння міжнародных спрэчак, непрымянення сілы ці пагрозы сілай* дзяржавы абавязаны вырашаць супярэчнасці, якія ўзнікаюць, мірнымі сродкамі, у тым ліку праз перагаворы, пасрэдніцтва, прымірэнне, судовы разбор, і не могуць прымяняць сілу ці пагрозу сілай як фактар уплыву для вырашэння любых пытанняў. З 1945 г. любыя войны, умяшанне — у тым ліку ў імя гуманітарных мэт — былі заменены на механізм калектыўнай бяспекі, створаны і замацаваны Статутам ААН. Акрамя выпадку законнай самаабароны, у цяперашні час тая ці іншая дзяржава не можа ў аднабаковым парадку вырашаць пытанне аб здзяйсненні ваеннага ўварвання незалежна ад яго абгрунтаванняў.

У адпаведнасці з прынцыпам *неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў* дзяржавы не маюць права прама ці ўскосна ўмешвацца ва ўнутраныя ці знешнія справы іншай дзяржавы; не павінны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

праводзіць ці заахвочваць дзейнасць, накіраваную на змяненне ладу іншай дзяржавы, а таксама не павінны ўмешвацца ва ўнутраныя супярэчнасці ў іншай дзяржаве.

*Прынцып раўнапраўя і самавызначэння народаў* азначае права кожнага народа самастойна вырашаць пытанне аб форме свайго дзяржаўнага існавання, свабодна вызначаць свой палітычны статус і здзяйсняць сваё сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё. Яны могуць здзяйсняць гэта шляхам стварэння суверэннай і незалежнай дзяржавы, далучэння да іншай дзяржавы, праз усталяванне іншага палітычнага статусу, праз унутранае самавызначэнне (магчымасць быць прадстаўленым у цэнтральных органах улады, рэалізоўваць сваю ідэнтычнасць на недыскрымінацыйнай аснове).

Згодна *з прынцыпам тэрытарыяльнай цэласнасці і непарушнасці межаў дзяржаў* тэрыторыя дзяржавы з'яўляецца недатыкальнай для замахаў з боку іншых дзяржаў. Недапушчальныя ваенная акупацыя і гвалтоўныя дзеянні, накіраваныя на набыццё тэрыторыі іншай дзяржавы.

Гэтыя прынцыпы азначаюць адмаўленне наогул ад якіх-небудзь тэрытарыяльных дамаганняў: вызначаныя на мясцовасці і на карце межы павінны захоўвацца, іншыя дзяржавы абавязаны іх паважаць і вытрымліваць, у кожнай дзяржавы ёсць права абараняць свае межы, кантраляваць іх перасячэнне людзьмі, транспартнымі сродкамі.

Як, на ваш погляд, суадносяцца прынцып права народаў на самавызначэнне і прынцып тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы? ■

Прынцыпы міжнароднага права атрымалі юрыдычнае замацаванне ў шэрагу юрыдычных дакументаў: Статуце ААН, Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права (1970 г.), актах Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Прызнанне і выкананне гэтых прынцыпаў вельмі важныя для ўмацавання законнасці ў міжнародных адносінах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 8.** Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.

Рэспубліка Беларусь згодна з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх.

Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.

Міжнароднае права ствараецца не адзіным заканадаўчым органам, гэта заўсёды вынік узгаднення волі, перш за ўсё дзяржаў як першасных суб'ектаў міжнароднага права. Крыніцамі міжнароднага права з'яўляюцца міжнародныя дагаворы і міжнародныя звычаі. Абавязковымі з'яўляюцца тыя дагаворы, па якіх дзяржава прыняла на сябе абавязацельствы (напрыклад, ратыфікавала).

Успомніце, які дзяржаўны орган у Рэспубліцы Беларусь здзяйсняе ратыфікацыі міжнародных пагадненняў. ■

Міжнародныя дагаворы могуць называцца па-рознаму: пагадненні, пакты, хартыі, статуты, канвенцыі, пратаколы, мемарандумы — і нават быць у форме абмену дыпламатычнымі нотамі. На юрыдычную сілу такога дагавора гэта не аказвае ўплыву.

Сёння міжнароднае права ўдасканальваецца, здзяйсняецца пошук новых, больш дзейсных механізмаў дасягнення ўзгодненых рашэнняў, забеспячэння рэалізацыі прынятых норм, а таксама працэдур, якія задаволяць усіх пры вырашэнні міжнародных спрэчак мірнымі сродкамі.

Усё большую ролю набываюць міжнародныя міжурадавыя арганізацыі. Нягледзячы на тое што іх акты (напрыклад, дэкларацыі, рэзалюцыі) носяць, як правіла, рэкамендацыйны характар, яны значна ўплываюць на тлумачэнне і прымяненне міжнароднага права, яго развіццё.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ААН — універсальная па колькасці дзяржаў-удзельніц і ахопе вырашаемых пытанняў арганізацыя. Беларусь як краіна, якая ўнесла неацэнны ўклад у заканчэнне Другой сусветнай вайны, стала адной з 51 дзяржаў — заснавальніц дадзенай арганізацыі ў 1945 г.

**Крыніцы і функцыі міжнароднага гуманітарнага права.** Адной з галін міжнароднага права з'яўляецца **міжнароднае гуманітарнае права** — сукупнасць прынцыпаў і прававых норм, што прымяняюцца ва ўзброеных канфліктах.

Мэта міжнароднага гуманітарнага права — прадухіліць ці абмежаваць людскія пакуты падчас узброеных канфліктаў. Міжнароднае гуманітарнае права дзейнічае ў перыяд узброеных канфліктаў незалежна ад мэт бакоў канфлікту, мяркуемай «справядлівасці» ці «несправядлівасці» вядзення вайны, характару або прычыны ўзнікнення канфлікту.

**Глабальная карта канфліктаў у свеце (2021)**




Знайдзіце інфармацыю пра актуальныя ўзброеныя канфлікты ў розных пунктах свету на анлайн-рэсурсе Global Conflict Tracker. У якім рэгіёне канфліктаў больш? Чаму? Якія намаганні прыкладаюцца для іх спынення? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Міжнароднае гуманітарнае права павінна выконвацца не толькі ўрадамі і іх узброенымі сіламі, але і любымі іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у канфлікце.

## Функцыі міжнароднага гуманітарнага права

| | |
|---|---|
| Забарона метадаў і сродкаў вядзення ваенных дзеянняў, якія прычыняюць залішнія пашкоджанні і пакуты, наносяць сур'ёзную шкоду прыроднаму асяроддзю | Абарона аб'ектаў, якія не служаць непасрэдна ваенным мэтам (жылыя дамы, школы, месцы адпраўлення культу) |
| Упарадкаванне адносін паміж бакамі ўзброенага канфлікту, устанаўленне ўзаемных правоў і абавязкаў па абмежаванні прымянення сродкаў і метадаў вядзення ўзброенай барацьбы, забеспячэнне абароны ахвяр канфлікту | Абарона асоб, якія не бяруць удзел у ваенных дзеяннях (грамадзянскае насельніцтва, медыцынскі персанал), і асоб, якія перасталі браць удзел у ваенных дзеяннях (параненыя, хворыя, ваеннапалонныя) |

Функцыі міжнароднага гуманітарнага права рэалізуюцца шляхам выканання яго прынцыпаў.

*Прынцып гуманізму*. Бакі ўзброенага канфлікту пры любых абставінах павінны прымаць усе магчымыя намаганні, каб скараціць выкліканыя вайной пакуты.

*Прынцып правядзення адрознення*. Бакі ўзброенага канфлікту ў любы час павінны праводзіць адрозненне паміж грамадзянскімі асобамі і асобамі, якія ўваходзяць у склад ваенных фарміраванняў. Напады могуць быць накіраваны толькі супраць асоб, якія ўваходзяць у склад ваенных фарміраванняў, і не могуць быць накіраваны супраць грамадзянскіх асоб і аб'ектаў, калі яны не выкарыстоўваюцца праціўнікам для падтрымання ваенных намаганняў. Асобнай асабліва абароненай катэгорыяй з'яўляюцца дзеці (асобы, якія не дасягнулі 14 гадоў), іх удзел у баявых дзеяннях забаронены, але яны карыстаюцца асаблівай абаронай нават у выпадку, калі ўсё ж бяруць у іх удзел.

*Прынцып суразмернасці*. Недапушчальна прычыненне залішніх пакут і празмерных пашкоджанняў, не апраўданых ваеннай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

неабходнасцю. Забаронена прымяненне ядаў і хімічнай зброі, біялагічнай зброі, разрыўных куль, мін-пастак, асляпляльнай лазарнай зброі і інш. Ад наступстваў прымянення гэтых сродкаў вядзення вайны абаронены не толькі грамадзянскія асобы, але і асобы, якія бяруць удзел у ваенных фарміраваннях.

*Прынцып гуманных адносін.* Усім грамадзянскім асобам, асобам, якія выйшлі са строю, і асобам, якія трапілі пад уладу непрыяцеля, гарантуюцца гуманныя адносіны. Забараняецца прымяненне катаванняў і цялесных пакаранняў, прычыненне калецтва, правядзенне навуковых, медыцынскіх ці біялагічных эксперыментаў, выкарыстанне «жывых» шчытоў і інш. Асобам, якія абвінавачаны ў злачынствах, гарантуюцца справядлівы судовы разбор, павага перакананняў і рэлігійных абрадаў, павага да сямейнага жыцця. Асобам, пазбаўленым свабоды, павінны быць прадастаўлены прытулак, харчаванне, вада, адзенне і медыцынская дапамога.

**Чырвоны Крыж і Чырвоны Паўмесяц**

У 1863 г. у Жэневе быў заснаваны Міжнародны рух Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Сёння гэта глабальная гуманітарная сетка, якая аб'ядноўвае мільёны супрацоўнікаў і валанцёраў па ўсім свеце. У аснову дзейнасці руху пакладзены 7 асноўных прынцыпаў: гуманнасць, непрадузятасць, нейтральнасць, незалежнасць, добраахвотнасць, адзінства, універсальнасць.

Складнікамі руху з'яўляюцца:

- Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа (аказвае дапамогу і абарону ахвярам войнаў і канфліктаў і сочыць за выкананнем Жэнеўскіх канвенцый 1949 г.);
- Міжнародная федэрацыя таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца (аказвае дапамогу ў выпадку катастроф і надзвычайных сітуацый у мірны час);
- Нацыянальныя таварыствы Чырвонага Крыжа ці Чырвонага Паўмесяца.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Што азначае кожны з сямі прынцыпаў руху? На падставе інфармацыі з сайта https://redcross.by вызначце асноўныя напрамкі дзейнасці арганізацыі «Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа».

У 2005 г. быў заснаваны дадатковы сімвал — Чырвоны Крышталь. Як вы думаеце, з якой мэтай? Якія пытанні гэта дапаможа вырашыць? ■

Да ліку галоўных дагавораў, якія ўтвараюць міжнароднае гуманітарнае права, адносяцца: Гаагскія канвенцыі і дэкларацыі 1899 г. і 1907 г., якія рэгулююць сродкі і метады вядзення баявых дзеянняў; Жэнеўскія канвенцыі 1949 г., якія абараняюць ахвяр вайны (грамадзянскіх асоб, ваеннапалонных, параненых).

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай Жэнеўскіх канвенцый 1949 г. і іншых дагавораў у галіне міжнароднага гуманітарнага права.

**Міжнародна-прававая адказнасць.** Любое супрацьпраўнае дзеянне суб'екта міжнароднага права (дзяржава, міжнародныя арганізацыі і інш.) цягне за сабой яго міжнародна-прававую адказнасць. Вінаватыя ў здзяйсненні міжнароднага супрацьпраўнага дзеяння абавязаны: спыніць супрацьпраўнае дзеянне, даць гарантыі непаўтарэння супрацьпраўнага дзеяння і пакрыць нанесеную шкоду.

Згодна са Статутам ААН у адносінах да дзяржаў, дзеянні якіх уяўляюць пагрозу міру ці парушэнне міру, могуць прымацца на падставе рашэнняў Савета Бяспекі ААН калектыўныя санкцыі. Такія санкцыі могуць выражацца ў поўным ці частковым прыпыненні эканамічных адносін, функцыянавання камунікацый — транспарту і сувязі, у разрыве дыпламатычных адносін (арт. 41 Статута ААН), а таксама ў прымяненні ўзброенай сілы (арт. 42 Статута ААН) — у дзеяннях паветраных, марскіх і сухапутных сіл, неабходных для падтрымання ці аднаўлення міжнароднага міру і бяспекі (дэманстрацыі, блакады і іншыя аперацыі ўзброеных сіл членаў ААН).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

?

1. Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя прынцыпы міжнароднага права. Ці згодны вы з тым, што выкананне гэтых прынцыпаў усімі дзяржавамі — дастатковая ўмова для захавання міру на зямлі? Ці патрабуецца сёння карэкціроўка ці дапаўненне асноўных прынцыпаў міжнароднага права? Абгрунтуйце сваю думку.
2. У законах Ману можна прачытаць: «Няхай не забівае ні таго, хто сышоў на зямлю (калі сам застаўся на калясніцы), ні таго, хто спіць, ні таго, у каго няма кальчугі, ні таго, хто хворы ці цяжка паранены...» Праваобразам якога прынцыпу міжнароднага гуманітарнага права з'яўляецца дадзеная норма старажытнаіндыйскага закона?
3. З апорай на СМІ ахарактарызуйце ролю Рэспублікі Беларусь ва ўдасканаленні механізмаў сучаснага міжнароднага права, забеспячэнні працэдур вырашэння міждзяржаўных спрэчак мірнымі сродкамі.
4. Знайдзіце ў філвордзе назвы міжнародных дагавораў. ■

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| С | Т | А | Т | У | Т | Л |
| П | А | В | Х | С | Л | Х |
| Ф | П | А | К | Т | Б | Х |
| Ы | Р | Е | Е | А | Ь | А |
| Д | А | Г | А | В | О | Р |
| В | Т | П | Е | Н | Р | Т |
| А | А | М | П | Е | П | Ы |
| П | К | А | А | К | А | Я |
| Р | О | В | У | У | В | Ф |
| О | Л | Ы | В | Ц | Ы | А |

Выканайце міні-праект «Узброены канфлікт — у медыя». Прааналізуйце літаратурны твор (фрагмент мастацкага ці дакументальнага фільма, сюжэт праграмы навін), у якім расказваецца пра ўзброены канфлікт. Якія прынцыпы міжнароднага гуманітарнага права выконваліся (або парушаліся) у ім? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 9. Геапалітычнае становішча і нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь

## Геапалітычны поспех: максімальна выкарыстаць магчымасці ці мінімізаваць рызыкі?






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце геапалітыкі.** Геапалітыка як тэорыя складваецца на мяжы XIX—XX стст. у выніку асэнсавання і аналізу пабудовы свету ва ўмовах праціборства асноўных цэнтраў сілы, якія вядуць барацьбу за падзел сферы ўплыву. Першапачаткова сэнс геапалітыкі быў у вылучэнні на першы план прасторавага, тэрытарыяльнага пачатку. **Геапалітыка** — гэта тэорыя, якая сцвярджае залежнасць палітыкі дзяржавы ад геаграфічных фактараў (клімат, прыродныя рэсурсы, тэрыторыя, насельніцтва і інш.), або вучэнне аб геаграфічнай абумоўленасці палітычных з'яў.

У выдадзенай у 1910 г. кнізе «Вялікія дзяржавы», у якой упершыню ўводзіцца тэрмін «геапалітыка», шведскі вучоны Рудольф Чэлен імкнуўся даказаць, што малыя краіны з-за свайго геаграфічнага становішча «асуджаныя» на падпарадкаванне «вялікім дзяржавам», якія дзякуючы свайму «геаграфічнаму лёсу» абавязаны аб'яднаць іх у вялікія геаграфічныя і гаспадарчыя «комплексы». ■

Якая роля належала ідэі аб кантролі над тэрыторыяй, аб заканамернасцях размеркавання і пераразмеркавання сфер уплыву ў абгрунтаванні сусветных войнаў? ■



Герніка, Хатынь, Асвенцім, Хірасіма з'яўляюцца сусветна вядомымі сімваламі трагічных вынікаў геапалітычнай барацьбы сярэдзіны XX ст. Як вы лічыце, чаму «Герніку» П. Пікасо называюць антываенным маніфестам? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пасля Другой сусветнай вайны геапалітыка ў першапачатковым яе разуменні адышла на другі план сусветнай знешнепалітычный думкі. Ключавую ролю ў гэтым адыграў перш за ўсё навукова-тэхнічны прагрэс, бо, з аднаго боку, горы і акіяны больш не здольны абараніць ад ядзерных ракет, а з другога — сучасныя сродкі камунікацыі адкрылі нябачаныя раней перспектывы эканамічнай і палітычнай інтэграцыі.

Сучасная геапалітыка ўсё больш канцэнтруе ўвагу на ўліку не столькі геаграфічных, колькі звязаных з імі эканамічных, нацыянальных, ваенных і іншых фактараў, якія ўплываюць на расстаноўку палітычных сіл на міжнароднай арэне. Сёння ўсё большая роля надаецца ўнікальнасці экасістэм і іх значнасці для глабальных прыродных сістэм жыццезабеспячэння, блізкасці да сусветных навукова-тэхнічных і фінансавых цэнтраў, міжнародных транспартных плыняў і да т. п.

У пачатку XXI ст. геапалітычная карціна свету характарызуецца шматпалярнасцю (поліцэнтрычнасцю), г. зн. наяўнасцю шматлікіх полюсаў (цэнтраў), вакол якіх канцэнтруюцца палітычныя, ваенна-стратэгічныя, эканамічныя, культурныя інтарэсы ўдзельнікаў сусветнага працэсу. Асноўная функцыя сучаснай геапалітыкі заключаецца ў пошуку дзяржавай узаемавыгадных саюзнікаў і партнёраў, а таксама напрамкаў і рэгіёнаў распаўсюджвання свайго ўплыву.

**Геапалітычны статус Беларусі.** Рэспубліка Беларусь — дзяржава ў цэнтры Еўропы. Мяжуе на паўночным захадзе з Літвой, на поўначы — з Латвіяй і Расійскай Федэрацыяй, на паўночным усходзе і ўсходзе — з Расійскай Федэрацыяй, на поўдні — з Украінай, на захадзе — з Польшчай. Працягласць тэрыторыі краіны з поўначы на поўдзень — 560 кіламетраў, з захаду на ўсход — 650 кіламетраў. Плошча — 207,6 тыс. квадратных кіламетраў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Якое месца займае Беларусь па плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва сярод еўрапейскіх краін? Якую пазіцыю па гэтых паказчыках займае беларуская сталіца сярод сталіц еўрапейскіх дзяржаў? Складзіце інфаграфіку. ■

Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, і гэта становішча мае вялікае значэнне не толькі для яе самой, але і для іншых краін. Адзін з найбольш істотных бакоў такога становішча — транзітнасць. Праз тэрыторыю Беларусі праходзяць транспартна-камунікацыйныя калідоры, якія забяспечваюць міжнародныя сувязі Беларусі з краінамі Балтыі, Польшчай, Украінай, Расіяй. У той жа час яны звязваюць Расію з краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы, Украіну і Малдову — з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, паўночным захадам Расіі.

Праз Беларусь пракладзены ўчастак транскантынентальнай чыгуначнай магістралі, якая перасякае ўсю Еўразію ад Ціхага да Атлантычнага акіяна. Беларусь з’яўляецца таксама краінай,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

праз якую здзяйсняецца больш за 50 % паставак энерганосьбітаў па магістральных нафта- і газаправодах з Расіі ў Заходнюю Еўропу. Такое становішча з'яўляецца важным геастратэгічным рэсурсам Беларусі, але разам з тым садзейнічае абвастрэнню ў краіне праблемы нелегальнай міграцыі з афрыканскіх і азіяцкіх краін.

Яшчэ адной асаблівасцю геаграфічнага становішча Беларусі з'яўляецца *адсутнасць выхаду да мора*, у сувязі з чым узнікае неабходнасць супрацоўніцтва з краінамі Балтыйскага рэгіёна, Расіяй і Украінай з мэтай выкарыстання іх марскіх партоў.

Геапалітычнае становішча вызначае месца дзяржавы ў сістэме міжнародных адносін, уключаючы не толькі становішча ў геаграфічнай прасторы, але і функцыянальную ролю ў сістэме дзяржаў. З гэтых пазіцый сёння Беларусі належыць роля не толькі «моста» паміж Захадам і Усходам, Поўначчу і Поўднем Еўропы, але таксама «моста» паміж Еўропай і Азіяй.




Успомніце з гісторыі, што такое Вялікі шаўковы шлях. Калі ён існаваў? ■

Знайдзіце інфармацыю пра новы Шаўковы шлях — транспартую сістэму для перамяшчэння грузаў і пасажыраў па сушы з Кітая ў краіны Еўропы. Ці ёсць у Беларусі зацікаўленасць у рэалізацыі гэтага праекта? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Нацыянальныя інтарэсы і бяспека Рэспублікі Беларусь.** Пад **нацыянальнай бяспекай** разумеюць стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз.

Нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь ахопліваюць усе сферы жыццядзейнасці. Стратэгічнымі нацыянальнымі інтарэсамі з'яўляюцца:

- забеспячэнне незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, суверэнітэту, непахіснасці канстытуцыйнага ладу;
- устойлівае эканамічнае развіццё і высокая канкурэнтаздольнасць беларускай эканомікі;
- дасягненне высокага ўзроўню і якасці жыцця грамадзян.

Суб'ектамі сістэмы гарантавання нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца дзяржаўныя органы, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні, а таксама асобныя грамадзяне. Кіраўніцтва сістэмай гарантавання нацыянальнай бяспекі здзяйсняе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца канстытуцыйным органам, мэта якога — падрыхтоўка рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

## Асноўныя задачы і функцыі Савета Бяспекі

- Прагназаванне, выяўленне, аналіз і ацэнка рызык, выклікаў, пагроз нацыянальнай бяспецы, выпрацоўка мер па іх прадухіленні
- Вызначэнне дзяржаўных органаў, адказных за гарантаванне нацыянальнай бяспекі ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, ваеннай, інфармацыйнай сферах
- Распрацоўка асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі і каардынацыя дзейнасці дзяржаўных органаў у сферы гарантавання нацыянальнай бяспекі
- Унясенне прапаноў Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі
- Разгляд праектаў прававых актаў у сферы гарантавання нацыянальнай бяспекі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзейнасць дзяржаўных органаў па гарантаванні нацыянальнай бяспекі грунтуецца на Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. У якасці асноўных патэнцыяльных або рэальна існуючых пагроз нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь у Канцэпцыі разглядаюцца:

- замах на незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць, суверэнітэт і канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь;
- умяшанне звонку ва ўнутрыпалітычныя працэсы;
- спробы разбурэння нацыянальных духоўна-маральных традыцый і неаб'ектыўнага перагляду гісторыі.

Асноўныя паказчыкі нацыянальнай бяспекі:

- доля інвестыцый у асноўны капітал;
- узровень інавацыйнай актыўнасці прамысловых прадпрыемстваў;
- унутраныя затраты на навуковыя даследаванні і распрацоўкі;
- Індэкс чалавечага развіцця;
- сумарны каэфіцыент нараджальнасці;
- узровень забяспечанасці рэсурсамі аховы здароўя, адукацыі;
- узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій і тэлекамунікацый;
- забяспечанасць ваеннымі кадрамі і аснашчанасць Узброеных Сіл сучасным узбраеннем, ваеннай і спецыяльнай тэхнікай.

Сумарны каэфіцыент нараджальнасці характарызуе сярэднюю лічбу нараджэнняў у адной жанчыны ў гіпатэтычным пакаленні за ўсё яе жыццё. У свеце яна скарацілася з 4,95 нараджэння на жанчыну ў першай палове 1960-х гг. да 2,56 у 2005—2010 гг. Пры гэтым у развітых краінах да канца XX ст. яна знізілася да 1,57, што пакрываецца іміграцыяй у гэтыя краіны з менш развітых краін.

Як вы думаеце, чаму сумарны каэфіцыент нараджальнасці аднесены да асноўных паказчыкаў нацыянальнай бяспекі? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Важным складнікам нацыянальнай бяспекі краін з'яўляецца інфармацыйная бяспека. **Інфармацыйная бяспека** — стан абароненасці інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы.

Стратэгічныя задачы і прыярытэты ў галіне гарантавання інфармацыйнай бяспекі вызначаны ў Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, зацверджанай у 2019 г.

У канцэпцыі ўпершыню ўведзена паняцце «інфармацыйны суверэнітэт» як неад'емнае права Рэспублікі Беларусь самастойна вызначаць правілы ўладання, карыстання і распараджэння нацыянальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, здзяйсняць незалежную знешнюю і ўнутраную дзяржаўную інфармацыйную палітыку.

У 2018 г. на базе Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь было створана новае падраздзяленне Узброеных Сіл — рота інфармацыйных тэхналогій (IT-рота).

Даведайцеся, якія патрабаванні прад'яўляюцца да вайскоўцаў, якія служаць у IT-роце. ■




У сучасным свеце асаблівае значэнне набываюць адказныя паводзіны ўсіх удзельнікаў інфармацыйных працэсаў, выпрацоўка агульных правілаў камунікацыі ў інфармацыйнай прасторы. Усё большую занепакоенасць выклікае распаўсюджванне ў інфармацыйнай прасторы фальсіфікаванай, недакладнай інфармацыі. Зніжэнне крытычных адносін спажыўцоў інфармацыі да фэйкавых звестак разнастайных рэсурсаў, у сацыяльных сетках стварае ўмовы для наўмыснага выкарыстання дэзінфармацыі для дэстабілізацыі грамадскай свядомасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У 2014—2015 гг. для ілюстрацыі навін з зон ваенных канфліктаў СМІ розных краін часта выкарыстоўвалі дадзеную выяву, якая ў рэальнасці з'яўляецца фотакадрам са здымак вядомага фільма «Брэсцкая крэпасць» («Цэнтрал Партнёршып», «Беларусьфільм», 2010).

Правядзіце міні-даследаванне выкарыстання фотаздымкаў з айчынных і замежных кінафільмаў для стварэння фэйкавых навін. Выкарыстайце пошук па выявах і памятку для выяўлення фотафэйкаў. ■

**Інфармацыйны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь забяспечваецца ў тым ліку на аснове прынцыпу інфармацыйнага нейтралітэту — правядзення міралюбнай знешняй інфармацыйнай палітыкі, павагі агульнапрызнаных правоў любой дзяржавы ў дадзенай сферы, недапушчальнасці ўмяшання ў інфармацыйную сферу іншых дзяржаў, накіраванага на дыскрэдытацыю іх палітычных, эканамічных, сацыяльных і духоўных стандартаў і прыярытэтаў. Пры гэтым Рэспубліка Беларусь адстойвае ўласныя нацыянальныя інтарэсы ў інфармацыйнай сферы з выкарыстаннем усіх наяўных сродкаў.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што такое геапалітыка? Якім фактарам адводзіцца галоўная роля ў сучаснай геапалітыцы?
2. Правядзіце SWOT-аналіз геапалітычнага становішча Беларусі. Абрэвіятура SWOT азначае: Strength — моцны бок; Weakness — слабы бок; Opportunities — магчымасці; Threats — пагрозы. Вынікі SWOT-аналізу афарміце ў выглядзе табліцы.




3. Ахарактарызуйце нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. Якімі з іх, на ваш погляд, трэба дапоўніць пералік стратэгічных нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, прыведзеных у параграфе? Чаму? ■

Выканайце міні-праект «З варагаў у грэкі ў XXI стагоддзі». У старажытнасці па тэрыторыі Беларусі праходзіў вядомы водны шлях «з варагаў у грэкі». Ці існуюць у цяперашні час ідэі сучаснага транс’еўрапейскага камунікацыйнага калідора ці саюзу, які звязвае Поўнач і Поўдзень Еўропы? У чым іх перавагі і недахопы? Вынікі прадстаўце ў выглядзе інтэрактыўнага плаката. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін

**Міжнародны дыялог магчымы на аснове роўнасці і ўзаемнай павагі!**




**Міжнародныя арганізацыі і аб'яднанні**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце і віды міжнародных адносін. Міжнародныя адносіны** — сукупнасць палітычных, эканамічных, прававых, дыпламатычных, ваенных, культурных і іншых сувязей паміж суб'ектамі, што дзейнічаюць на сусветнай арэне.

Да суб'ектаў міжнародных адносін належаць дзяржавы, арганізацыі, аб'яднанні, грамадскія рухі, сацыяльныя групы, асобы і да т. п. Віды міжнародных адносін залежаць ад сферы ўзаемадзеяння, колькасці і характару суб'ектаў, стану міжнародных адносін.

## Віды міжнародных адносін

**Па сферах узаемадзеяння**
- Палітычныя
- Эканамічныя
- Ваенна-стратэгічныя
- Культурныя
- Ідэалагічныя
- Экалагічныя і да т. п.

**Па стане**
- Супрацоўніцтва
- Мірнае суіснаванне
- Канфлікт
- Халодная вайна
- Вайна

**Па колькасці ўдзельнікаў**
- Двухбаковыя
- Шматбаковыя

**Па складзе ўдзельнікаў**
- Міждзяржаўныя адносіны
- Міжпартыйныя адносіны
- Адносіны міжнародных арганізацый, транснацыянальных карпарацый

**Па расстаноўцы сіл**
- Шматполюсны свет
- Двухполюсны (біпалярны) свет
- Аднаполюсны свет

У сучасным разуменні міжнародныя адносіны з'яўляюцца разам са станаўленнем нацыянальных дзяржаў і ўзнікненнем ідэі нацыянальнага суверэнітэту.

**Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.** Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспубліка Беларусь выйшла на міжнародную арэну ў якасці суверэннай дзяржавы. Знешняя палітыка беларускай дзяржавы заклікана, у першую чаргу, забяспечыць абарону



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дзяржаўнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, а таксама стварыць спрыяльныя знешнепалітычныя і знешнеэканамічныя ўмовы для павышэння ўзроўню дабрабыту народа, развіцця палітычнага, эканамічнага, інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу грамадства і дзяржавы.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 18.** Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права.

Рэспубліка Беларусь ставіць за мэту зрабіць сваю тэрыторыю без'ядзернай зонай, а дзяржаву — нейтральнай.

Рэспубліка Беларусь выбудоўвае адносіны са знешнім светам з улікам сваіх нацыянальных інтарэсаў. Важным прынцыпам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца *шматвектарнасць*. Гэта значыць, што Рэспубліка Беларусь нацэлена на пабудову раўнапраўнага партнёрства па ўсіх напрамках і ва ўсіх рэгіёнах свету.

Асноўныя геапалітычныя арыенціры Беларусі — цеснае эканамічнае супрацоўніцтва і знешнепалітычнае партнёрства з Расійскай Федэрацыяй і іншымі краінамі СНД, узаемавыгадныя сувязі з Еўрапейскім саюзам, далейшае развіццё эканамічнага і іншага супрацоўніцтва з Кітаем, краінамі Блізкага і Сярэдняга Усходу, Лацінскай Амерыкай, Індыяй, Афрыкай, а таксама пошук новых эканамічных партнёраў.

Па стане на пачатак 2021 г. Беларусь мае свае дыпламатычныя прадстаўніцтвы ў 58 дзяржавах. З улікам акрэдытацыі паслоў па сумяшчальніцтве краіна прадстаўлена ў 114 са 183 дзяржаў, з якімі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны. Каардынацыю



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

знешнепалітычнай дзейнасці здзяйсняе Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

На сайце МЗС https://mfa.gov.by знайдзіце інфармацыю пра дыпламатычныя адносіны Беларусі сёння. ■

Рэспубліка Беларусь праводзіць самастойную, міралюбную знешнюю палітыку; актыўна развівае супрацоўніцтва са стратэгічнымі саюзнікамі і замежнымі партнёрамі ў розных частках зямнога шара, з'яўляецца адным з ініцыятараў і актыўнай удзельніцай рэгіянальных інтэграцыйных структур і праектаў, уносіць істотны ўклад ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі і стабільнасці. Беларусь — надзейны партнёр па стратэгічна важных пытаннях агульнаеўрапейскага і сусветнага значэння: гарантаванне ваенна-палітычнай, энергетычнай і экалагічнай бяспекі, барацьбы са злачыннасцю, наркатрафікам, нелегальнай міграцыяй.

**Удзел Беларусі ў міжнародных арганізацыях.** Важнымі суб'ектамі міжнародных адносін з'яўляюцца міжнародныя арганізацыі. Яны ствараюцца з мэтай вырашэння міжнародных эканамічных, палітычных, культурных, экалагічных і іншых праблем. Найбольш значная роля ў сістэме міжнародных адносін належыць Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).

Мэтамі ААН з'яўляюцца падтрыманне міждзяржаўнага міру і бяспекі, развіццё сяброўскіх адносін паміж нацыямі, здзяйсненне супрацоўніцтва ў вырашэнні міжнародных праблем, узгадненне дзеянняў нацый у дасягненні агульных мэт.

Структура ААН уключае 6 галоўных органаў: Генеральную Асамблею, Савет Бяспекі, Эканамічны і Сацыяльны савет, Савет па апецы, Міжнародны суд і Сакратарыят. У структуры ААН дзейнічаюць 15 спецыялізаваных устаноў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Арганізацыя Аб’яднаных Нацый (ААН)

## Генеральны сакратар

**Глава Сакратарыяту (абіраецца на 5 гадоў)**

Лідар ААН, прадстаўляе і робіць заявы ад яе асобы. Паведамляе Савету Бяспекі пра магчымыя пагрозы міру

## Сакратарыят

**Забяспечвае працу ААН**

Кіраўніцтва міратворчымі аперацыямі, пасрэдніцтва ў міжнародных спрэчках, складанне аглядаў эканамічных і сацыяльных тэндэнцый, даклады па правах чалавека і развіцці і інш.

## Міжнародны суд ААН

**15 суддзяў**

Вырашае спрэчкі і рознагалоссі. Займаецца пытаннямі тэрытарыяльных і пагранічных спрэчак, незаконнага прымянення сілы. Кансультуе Савет Бяспекі, Генасамблею і іншыя органы ААН

## Генеральная Асамблея ААН

**193 краіны**

Галоўны дарадчы, дырэктыўны і прадстаўнічы орган

## Спецыялізаваныя ўстановы

Самастойныя міжнародныя арганізацыі, створаныя ААН для рашэння спецыялізаваных задач

- **Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ)**
- **ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)**
- **Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ)**
- **Міжнародны валютны фонд (МВФ)**
- **Сусветны банк і інш.**

## Савет Бяспекі

**15 краін:**

- **5 пастаянных членаў, маюць права вета**
- **10 часовых членаў, абіраюцца на 2 гады**

Нясе галоўную адказнасць за падтрымку міжнароднага міру і бяспекі. Уводзіць міжнародныя санкцыі, накіроўвае міратворчыя сілы ААН, санкцыянуе правядзенне ваенных аперацый

## Эканамічны і Сацыяльны савет

Каардынуе супрацоўніцтва ААН і яе спецыялізаваных устаноў у эканамічнай і сацыяльнай галінах

## Савет па апецы

**1 кастрычніка 1994 г. прыпыніў дзейнасць**

Кіруе і назірае за падапечнымі тэрыторыямі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Апошнія гады вядуцца перамовы паміж членамі ААН аб рэформе Савета Бяспекі. Праекты прадугледжваюць: павелічэнне агульнай колькасці членаў, павелічэнне колькасці пастаянных членаў, абмежаванне права вета для пастаянных членаў.

Якія краіны, на ваш погляд, могуць прэтэндаваць на статус пастаянных членаў Савета Бяспекі ААН? Якім чынам рэформа Савета Бяспекі ААН можа змяніць суадносіны сіл на міжнароднай арэне? ■

**Беларусь мае вялікі, больш за 75 гадоў, вопыт работы ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. З'яўляючыся адной з заснавальніц ААН, Беларусь з 1945 г. актыўна ўдзельнічае ў вырашэнні ўсяго спектра сусветных праблем. Афіцыйныя дэлегацыі Рэспублікі Беларусь бяруць удзел у рабоце штогадовых і спецыяльных сесій Генеральнай Асамблеі ААН, а таксама ў рабоце разнастайных міжнародных форумаў, якія праходзяць пад эгідай ААН.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Беларусь з'яўляецца членам спецыялізаваных установаў ААН і іншых міжурадавых арганізацый, якія здзяйсняюць узаемадзеянне з ААН на аснове спецыяльных пагадненняў. У іх ліку: Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Міжнародная арганізацыя працы (МАЦ), Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ), Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па прамысловым развіцці (ЮНІДА), Міжнароднае агенцтва па атамнай энергетыцы (МАГАТЭ) і інш.

З 1993 г. у Беларусі працуе Праграма развіцця ААН (ПРААН) для здзяйснення праектаў тэхнічнай дапамогі Беларусі і аказання кансультацыйнага садзейнічання ў галіне рынкавых пераўтварэнняў. У Мінску адкрыта таксама Прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) для здзяйснення праграмы па абароне мацярынства і дзяцінства.

З 1992 г. Рэспубліка Беларусь здзяйсняе актыўнае супрацоўніцтва ў сферы міжнароднай бяспекі з *Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе* (АБСЕ). Пры ўступленні ў АБСЕ Беларусь далучылася да Хельсінкскага заключнага акта 1975 г.

Сярод міжнародных арганізацый на постсавецкай прасторы, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь, значная роля належыць Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). СНД створана на аснове суверэннай роўнасці ўсіх яе членаў. Месца знаходжання Выканаўчага камітэта СНД — Мінск, Міжпарламенцкай Асамблеі СНД — Санкт-Пецярбург.

Калі і кім было падпісана пагадненне аб стварэнні СНД? Колькі дзяржаў-удзельніц уваходзіць у склад Садружнасці? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Інтэграцыйнае ўзаемадзеянне краін СНД рэалізуецца, у першую чаргу, у сферы эканамічнага супрацоўніцтва, стварэння зон свабоднага гандлю, фарміравання адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы, развіцця прыгранічнага і трансгранічнага супрацоўніцтва, супрацоўніцтва ў галіне барацьбы з арганізаванай злачыннасцю, тэрарызмам. Рэспубліка Беларусь выступае за паглыбленне шматпланавага супрацоўніцтва з краінамі СНД як на двухбаковым узроўні, так і ў межах інтэграцыйных аб'яднанняў — Еўразійскага эканамічнага саюза, Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

У 1999 г. быў падпісаны Дагавор аб стварэнні *Саюзнай дзяржавы* Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У межах Саюзнай дзяржавы дзейнічаюць Вышэйшы Дзяржаўны Савет, Савет Міністраў, Пастаянны Камітэт, Парламенцкі Сход; створаны Пагранічны і Мытны камітэты, Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы.

Новыя перспектывы з пункту гледжання нацыянальных інтарэсаў дзяржаў-удзельніц адкрывае *Еўразійскі эканамічны саюз* (ЕАЭС). Ён быў створаны ў 2015 г. шляхам пераўтварэння Еўразійскай эканамічнай супольнасці (існавала ў 2000—2014 гг.). У склад ЕАЭС уваходзяць Рэспубліка Арменія, Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан, Кыргызская Рэспубліка, Расійская Федэрацыя.

ЕАЭС — важны крок наперад ва ўмацаванні еўразійскай інтэграцыі, фарміраванні агульнага рынку з насельніцтвам больш за 170 млн чалавек з высокім вытворчым, навуковым і тэхналагічным патэнцыялам. На тэрыторыі ЕАЭС дзейнічаюць аднолькавыя правілы таваразвароту, тэхнічныя стандарты. Грамадзяне краін — членаў ЕАЭС могуць перамяшчацца ўнутры Саюза без віз, вучыцца, працаваць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У межах ЕАЭС ствараюцца дадатковыя ўмовы для мадэрнізацыі і ўстойлівага развіцця беларускай эканомікі за кошт забеспячэння свабоды руху тавараў, паслуг, капіталу і працоўных рэсурсаў, рэалізацыі ўзгодненай палітыкі ў найважнейшых сектарах эканомікі, сумесных інвестыцыйных і інавацыйных праектах.



Для гарантавання бяспекі на постсавецкай прасторы ў 2003 г. была створана *Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы* (АДКБ). У яе ўваходзяць Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан. Дагавор аб калектыўнай бяспецы адлюстроўвае абарончую накіраванасць ваеннай палітыкі дзяржаў — удзельніц АДКБ. Дзяржавы — удзельніцы Дагавора не разглядаюць ніводную з дзяржаў свету ў якасці патэнцыяльнага праціўніка і выступаюць за ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з усімі краінамі.

Рэспубліка Беларусь бярэ актыўны ўдзел у дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы: палітычнай, ваеннай, ваенна-тэхнічнай, інфармацыйнай; супрацоўнічае ў галіне барацьбы з наркатрафікам, нелегальнай міграцыяй, міжнароднай арганізаванай злачыннасцю; садзейнічае наладжванню канструктыўнага ўзаемадзеяння АДКБ з іншымі міжнароднымі і рэгіянальнымі аб'яднаннямі.

**Міжнароднае супрацоўніцтва.** Пад міжнародным супрацоўніцтвам разумеюць сумесныя дзеянні суб'ектаў міжнародных адносін у сферы іх узаемных інтарэсаў, іх узаемазвязаную дзейнасць па ўзгадненні сваіх пазіцый, вырашэнні агульназначных праблем і прыняцці ўзаемапрымальных рашэнняў. Для гэтага выкарыстоўваюцца палітычныя, эканамічныя, ваенныя і прапагандысцкія сродкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У лютым 2015 г. на старонках шматлікіх сусветных медыя было апублікавана фота з сустрэчы ў беларускай сталіцы кіраўнікоў Беларусі, Расіі, Германіі, Францыі і Украіны — А. Р. Лукашэнкі, У. У. Пуціна, А. Меркель, Ф. Аланда, П. А. Парашэнкі. Вынікам міжнароднага саміту сталі Мінскія пагадненні аб урэгуляванні ўзброенага канфлікту на ўсходзе Украіны, якія ўвайшлі ў гісторыю дыпламатыі.

Даведайцеся, чаму пляцоўкай для перагавораў «нармандскай чацвёркі» быў абраны менавіта Мінск. Які статус у Мінскіх пагадненняў сёння? ■

Да *палітычных* сродкаў адносіцца дыпламатыя, якая ажыццяўляецца ў выглядзе перагавораў, візітаў, спецыяльных канферэнцый і нарад, сустрэч, падрыхтоўкі і заключэння двухбаковых і шматбаковых пагадненняў, дыпламатычнай перапіскі, удзелу ў рабоце міжнародных арганізацый.

Дыпламатыя бывае і народнай. Народная дыпламатыя азначае, што самыя розныя людзі, а не толькі дыпламаты, дапамагаюць усталёўваць сяброўскія сувязі паміж народамі. Грамадзянін краіны, знаходзячыся за межамі, сваімі паводзінамі, зносінамі, выказваннямі стварае пэўныя ўяўленні не толькі пра сябе, але і пра сваю краіну. Важнай формай народнай дыпламатыі з'яўляецца спорт.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У 2019 г. падчас правядзення II Еўрапейскіх гульняў у Мінску адбылася канферэнцыя «Спартыўная дыпламатыя: стварэнне магчымасцей праз спорт». Эксперты абмеркавалі магчымасці спартыўнай дыпламатыі па стварэнні мастоў паміж дзяржавамі, а таксама ўклад спартыўных мерапрыемстваў ва ўстойлівае развіццё.




Чаму ў сучасным свеце спорт разглядаецца як важны сродак умацавання міжнароднага аўтарытэту дзяржавы? ■

*Эканамічныя* сродкі прадугледжваюць выкарыстанне эканамічнага патэнцыялу краін для дасягнення палітычных мэт. Дзяржава, якая валодае моцнай эканомікай, фінансавай магутнасцю, займае трывалае становішча на міжнароднай арэне. Аднак нават невялікія па тэрыторыі дзяржавы з абмежаванымі прыроднымі рэсурсамі могуць адыгрываць істотную ролю на сусветнай арэне, калі іх эканоміка грунтуецца на перадавых тэхналогіях.

Да *ваенных* сродкаў прынята адносіць ваенную магутнасць дзяржавы. Ваенныя сродкі могуць выкарыстоўвацца як напрамую, так і ўскосна. Да першых адносяцца войны, інтэрвенцыі, блакады, да другіх — выпрабаванне новых відаў узбраення, вучэнні, манеўры.

Да *прапагандысцкіх* адносяць сучасныя сродкі масавай інфармацыі, прапаганды і агітацыі, якія выкарыстоўваюцца для ўмацавання аўтарытэту дзяржавы на міжнароднай арэне. З дапамогай сродкаў масавай інфармацыі і дыпламатыі ў вачах сусветнага супольніцтва фарміруецца пэўны вобраз (імідж) дзяржавы. Пазітыўны імідж дзяржавы — фактар кансалідацыі грамадства, забеспячэння падтрымкі народам унутранай і знешняй палітыкі дзяржавы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назавіце віды міжнародных адносін. Як вы лічыце, чаму Рэспубліка Беларусь паслядоўна выступае за шматполюсны сусветны лад?
2. Ахарактарызуйце месца Рэспублікі Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін. Якая роля нашай краіны ў гарантаванні палітычнай стабільнасці і бяспекі ў рэгіёне?
3. Запоўніце табліцу:

| Рэспубліка Беларусь у складзе міжнародных арганізацый | | | |
|---|---|---|---|
| Назва арганізацыі | Дата стварэння | Мэты стварэння | Члены арганізацыі |
| | | | |

4. Ахарактарызуйце асноўныя сродкі міжнароднага супрацоўніцтва. Прывядзіце прыклады іх выкарыстання ў сучаснай сусветнай палітыцы (выкарыстоўвайце матэрыялы СМІ).

Выканайце міні-праект «Запрашаем у Беларусь». Стварыце відэаролік пра Беларусь з мэтай прыцягнення ў нашу краіну замежных турыстыў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Беларусь у сусветным супольніцтве»

1. Дайце азначэнне наступным паняццям: *геапалітыка, інфармацыйная бяспека, міграцыйная мабільнасць, міжнароднае гуманітарнае права, міжнародныя адносіны, нацыянальная бяспека, устойлівае развіццё*.
2. Канкрэтызуйце плюсы і мінусы геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь прыкладамі са СМІ.
3. У якія міжнародныя арганізацыі і міждзяржаўныя аб'яднанні ўваходзіць Рэспубліка Беларусь? Якія нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы рэалізуюцца пры гэтым?
4. Ахарактарызуйце прынцыпы і напрамкі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Канкрэтызуйце прыкладамі выснову аб шматвектарнай знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь (выкарыстоўвайце матэрыялы СМІ).
5. Што такое інфармацыйная бяспека? Якім чынам распаўсюджванне недакладнай ці наўмысна скажонай інфармацыі можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам дзяржавы?
6. Апішыце ролю сродкаў масавай інфармацыі ў развіцці міжнародных адносін. Як змяняецца значэнне разнастайных сродкаў міжнароднага супрацоўніцтва ў сучасным свеце?
7. Суаднясіце фармулёўкі Мэт устойлівага развіцця са слоганамі з плакатаў па іх папулярызацыі маладзёжнымі пасламі МУР.

   Выкажыце здагадку, якім чынам дасягненне Мэт устойлівага развіцця вызначае прыярытэты знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

   **Мэты ўстойлівага развіцця:**

   - Стварэнне трывалай інфраструктуры, садзейнічанне забеспячэнню ўсёахопнай і ўстойлівай індустрыялізацыі і ўкараненню інавацый.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- Садзейнічанне няўхільнаму і ўстойліваму эканамічнаму росту, поўнай і прадукцыйнай занятасці і годнай працы для ўсіх.
- Забеспячэнне рацыянальных мадэляў спажывання і вытворчасці.
- Забеспячэнне доступу да танных, надзейных, устойлівых і сучасных крыніц энергіі для ўсіх.
- Гарантаванне адкрытасці, бяспекі, жыццястойкасці і ўстойлівасці гарадоў і населеных пунктаў.
- Зніжэнне ўзроўню няроўнасці ўнутры краін і паміж імі.
- Садзейнічанне пабудове міралюбных і адкрытых грамадстваў у інтарэсах устойлівага развіцця, забеспячэнне доступу да правасуддзя для ўсіх і стварэнне эфектыўных, падсправаздачных і заснаваных на шырокім удзеле устаноў на ўсіх узроўнях.
- Ліквідацыя галечы ва ўсіх яе формах.
- Ліквідацыя голаду, гарантаванне харчовай бяспекі і паляпшэнне харчавання, садзейнічанне ўстойліваму развіццю сельскай гаспадаркі.
- Забеспячэнне гендарнай роўнасці і пашырэнне правоў і магчымасцей усіх жанчын і дзяўчынак.
- Забеспячэнне ўсеагульнай і справядлівай якаснай адукацыі і заахвочванне да навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх.
- Забеспячэнне здаровага ладу жыцця і садзейнічанне дабрабыту для ўсіх у любым узросце.
- Прыняцце тэрміновых мер па барацьбе са змяненнем клімату і яго наступствамі.
- Абарона, аднаўленне экасістэм сушы і садзейнічанне іх рацыянальнаму выкарыстанню, рацыянальнае кіраванне лясамі, барацьба з апустыньваннем, спыненне і паварот назад дэградацыі зямель і спыненне працэсу страты біялагічнай разнастайнасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- Забеспячэнне наяўнасці і рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў і санітарыі для ўсіх.
- Захаванне і рацыянальнае выкарыстанне акіянаў, мораў і марскіх рэсурсаў у інтарэсах устойлівага развіцця.
- Умацаванне сродкаў дасягнення ўстойлівага развіцця і актывізацыя работы механізмаў глабальнага партнёрства ў інтарэсах устойлівага развіцця.

**Слоганы:** «Дастатак у кожны дом», «Аддайце іншым тое, што не выкарыстоўваеце», «Здароўе і дабрабыт: сёння, заўтра і заўсёды», «Ад ведаў да новых магчымасцей», «За свет роўных магчымасцей», «Не марнуйце дарма ваду», «Выкарыстоўваем энергію разумна», «Годныя ўмовы — высокі вынік», «Інавацыі для жыцця», «Розныя, але роўныя», «За чысціню гарадоў і вёсак», «Спажываем разумна — выпрацоўваем якасна», «Захаваем планету разам», «У вады ёсць памяць», «Абаронім прыроду — захаваем жыццё», «Скарыстайцеся сваім правам абіраць», «Умець гаварыць — навучыцца слухаць».

8. Якія тэмы з'яўляюцца актуальнымі для ААН сёння? Зайдзіце на сайт ААН у Беларусі http://un.by і прыдумайце хэштэгі для актуальных тэм парадку дня ААН.
9. У 1968 г. быў створаны Рымскі клуб — міжнародная грамадская арганізацыя, мэта якой — прыцягненне ўвагі сусветнага супольніцтва да глабальных праблем. Шэраг вучоных стварылі серыю аналітычных дакладаў пад агульнай назвай «Цяжкасці чалавецтва», у якіх перспектывы развіцця свету складаліся па камп'ютарных мадэлях. Першы даклад 1972 г. называўся «Межы росту» і змяшчаў прапанову адмовіцца ад эканамічнага росту ў свеце, прыкласці намаганні да падтрымання «нулявога росту».

   Прааналізуйце назвы дакладаў Рымскага клуба і складзіце на іх падставе спіс найбольш актуальных праблем, з якімі сутыкаецца чалавецтва.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

III

# Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь

## 1 Што такое?

- Прэзумпцыя невінаватасці
- Юрыдычная асоба
- Натарыят

## 2 Як заключаецца?

- Працоўны дагавор
- Здзелка
- Шлюб

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Публічнае і прыватнае права
- Праваздольнасць і дзеяздольнасць
- Адміністрацыйнае правапарушэнне і злачынства

## 4 Як узаемазвязаны?

- Пракуратура і законнасць
- Адвакатура і абарона
- Правапарушэнне і адміністрацыйнае спагнанне

## 5 Якія існуюць?

- Галіны права
- Прынцыпы правасуддзя
- Органы забеспячэння законнасці і парадку

**Формула прававой культуры: ведаць + паважаць + выконваць** !

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 11—12. Канстытуцыйнае і выбарчае права

## Канстытуцыя — аснова прававой сістэмы



**Найвышэйшая юрыдычная сіла** | **Устаноўчы характар**

**Прамое дзеянне** | **Стабільнасць**

**Асноўны Закон дзяржавы**

| | |
|---|---|
| **Канстытуцыя** | Права выбіраць і быць выбраным |
| **Законы (у тым ліку кодэксы), дэкрэты і ўказы** | Выбарчы кодэкс |
| **Пастановы палат Парламента** | Пастанова Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (аб прызначэнні выбараў Прэзідэнта) |
| **Нарматыўныя прававыя акты рэспубліканскіх органаў** | Пастанова Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (аб зацвярджэнні формы выбарчага бюлетэня) |
| **Нарматыўныя прававыя акты, якія прымаюцца мясцовымі органамі дзяржаўнай улады** | Рашэнне мясцовай адміністрацыі (аб утварэнні ўчастковай камісіі) |
| **Лакальныя прававыя акты** | Рашэнне ўчастковай камісіі па выбарах |

**Крымінальны кодэкс** | **Выбарчы кодэкс** | **Грамадзянскі кодэкс**

**Працоўны кодэкс** | **Кодэкс аб шлюбе і сям'і** | **Кодэкс аб культуры**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Права як сістэма норм.** *Права* ўяўляе сабой сістэму агульнаабавязковых фармальна вызначаных правіл паводзінаў (норм), якія ўстанаўліваюцца дзяржавай і забяспечваюцца шляхам дзяржаўнага прымусу.

Нормы права знаходзяцца ў пэўнай сістэме, якая складаецца з галін і інстытутаў права. *Галіна* права аб'ядноўвае нормы, што рэгулююць аднародныя грамадскія адносіны. Як правіла, базавым нарматыўным прававым актам галіны з'яўляецца *кодэкс*.

Еўрапейскай прававой традыцыі ўласцівы падзел права на *прыватнае* і *публічнае*. Публічнае права ахоплівае нормы, што выражаюць інтарэсы грамадства ў цэлым і рэгулююць уладныя адносіны. Адным з бакоў у публічным праве заўсёды выступае дзяржава, якая прадпісвае пэўныя паводзіны. Прыватнае права ўключае нормы, якія адлюстроўваюць і абараняюць інтарэсы асобных грамадзян. Як правіла, у прыватным праве бакі роўныя.

**Галіны права**

| | |
|---|---|
| Канстытуцыйнае | Крымінальнае |
| Адміністрацыйнае | Сямейнае |
| Грамадзянскае | Працоўнае |

Якія з названых галін права адносяцца да прыватнага права, а якія — да публічнага? ■

Права заўсёды мае знешняе выражэнне. У юрыспрудэнцыі такое выражэнне называецца крыніцамі (формамі) права. У кожнай дзяржаве існуе ўласная гістарычна складзеная сістэма крыніц (форм) права. У Рэспубліцы Беларусь асноўнай крыніцай права з'яўляюцца *нарматыўныя прававыя акты* — афіцыйныя дакументы ўстаноўленай формы, прынятыя (выдадзеныя)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

нарматворчым органам (службовай асобай) у межах яго (яе) кампетэнцыі ці рэферэндумам. Да іх належаць Канстытуцыя і законы Рэспублікі Беларусь, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Савета Міністраў і інш.

Нарматыўныя прававыя акты набываюць сілу з уключэннем у *Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь* і афіцыйным апублікаваннем на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь (http://www.pravo.by).




Знайдзіце на сайце інфармацыю пра колькасць апублікаваных сёння актаў. На яе аснове растлумачце неабходнасць існавання Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала Рэспублікі Беларусь як асноўнага дзяржаўнага інфармацыйнага інтэрнэт-рэсурсу ў галіне права і прававой інфармацыі. ■

**Месца Канстытуцыі ў прававой сістэме.** *Канстытуцыя* — гэта Асноўны Закон дзяржавы, які мае найвышэйшую юрыдычную сілу. Ён замацоўвае прынцыпы і нормы рэгулявання найважнейшых грамадскіх адносін (арганізацыя дзяржавы, правы, свабоды і абавязкі чалавека і грамадзяніна, статус органаў улады).

Дзеючая Канстытуцыя была прынята *15 сакавіка 1994 г.* Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь. Рэспубліканскімі рэферэндумамі 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г. у яе былі ўнесены змены і дапаўненні.

Прыгадайце значэнне паняцця «прэамбула». Прааналізуйце прэамбулу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і вызначце: ад імя каго прынята Канстытуцыя, якія мэты яе прыняцця. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




| | |
|---|---|
| **Па структуры** | **Кансалідаваная** |
| **Па форме** | **Пісьмовая** |
| **Па спосабе прыняцця** | **Парламенцкая** |
| **Па спосабе змянення** | **Жорсткая** |
| **Па часе дзеяння** | **Пастаянная** |

Вызначце, што маюць на ўвазе характарыстыкі «кансалідаваная» і «жорсткая» Канстытуцыя. Канстытуцыі якіх дзяржаў адрозніваюцца ад Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь па розных характарыстыках? Прывядзіце прыклады. ■

Канстытуцыя займае асаблівае месца ў прававой сістэме і валодае пэўнымі *юрыдычнымі ўласцівасцямі*.

Канстытуцыя валодае *ўстаноўчым характарам*, гэта значыць, што ў ёй замацоўваюцца асноўныя палажэнні, на якіх будуецца новая дзяржава, развіваюцца новыя адносіны.

Канстытуцыя з'яўляецца *асновай прававой сістэмы*. Усе нарматыўныя прававыя акты ў дзяржаве прымаюцца на аснове Канстытуцыі і дзеля развіцця яе палажэнняў. Як правіла, Канстытуцыя замацоўвае толькі агульныя нормы, якія павінны быць удакладнены ў актах заканадаўства (законах, дэкрэтах і ўказах Прэзідэнта, пастановах Савета Міністраў і г. д.).

## Норма Канстытуцыі

**Артыкул 13.** ...Дзяржава... гарантуе роўную абарону і роўныя ўмовы для развіцця ўсіх форм уласнасці...

**Артыкул 32.** ...Жанчына і мужчына па дасягненні шлюбнага ўзросту маюць права на добраахвотнай аснове ўступіць у шлюб і стварыць сям'ю. Муж і жонка раўнапраўныя ў сямейных адносінах...

**Артыкул 26.** Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказана і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу. Той, каго абвінавачваюць, не павінен даказваць сваю невінаватасць.

**Артыкул 43.** Працоўныя маюць права на адпачынак...



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У якіх галінах права канкрэтызаваны прыведзеныя нормы Канстытуцыі? Як называецца прынцып, замацаваны ў артыкуле 26 Канстытуцыі?

Канстытуцыя валодае *найвышэйшай юрыдычнай сілай*. У іерархіі нарматыўных прававых актаў Канстытуцыя займае найвышэйшае становішча, усе іншыя нарматыўныя і ненарматыўныя прававыя акты, што прымаюцца ў дзяржаве, павінны адпавядаць Асноўнаму Закону.

Канстытуцыя валодае *стабільнасцю*, якая забяспечваецца асаблівым, ускладненым парадкам яе змянення і дапаўнення. Так, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь можа быць зменена або дапоўнена Парламентам (Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь) па ініцыятыве Прэзідэнта або не менш як 150 тыс. грамадзян, што валодаюць выбарчым правам, ці на рэферэндуме.

## Заканадаўчая ініцыятыва

**Прыняцце закона могуць ініцыяваць:**

- Прэзідэнт
- Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу
- Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу
- Урад (Савет Міністраў)
- Грамадзяне, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці, не меншай за 50 тыс. чалавек

**Прыняцце закона аб змяненні ці дапаўненні Канстытуцыі могуць ініцыяваць:**

- Прэзідэнт
- Грамадзяне, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці, не меншай за 150 тыс. чалавек

Чаму, на ваш погляд, прыняцце закона аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі мае асаблівасці ў параўнанні з прыняццем іншых законаў?

Каб закон аб змяненні ці дапаўненні Канстытуцыі быў прыняты, ён павінен быць адобраны двойчы кваліфікаванай большасцю галасоў (2/3 ад поўнага складу палат Парламента). Пры гэтым рашэнне аб змяненні ці дапаўненні Канстытуцыі на рэферэндуме будзе лічыцца прынятым, калі за яго прагаласуе большасць грамадзян, унесеных у спісы для галасавання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь | |
| --- | --- |
| **Палата прадстаўнікоў** | **Савет Рэспублікі** (палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва) |
| **110 дэпутатаў** | **64 члены** |

Колькі галасоў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі неабходна, каб закон аб змяненні ці дапаўненні Канстытуцыі быў прыняты Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь? ■

Раздзелы I («Асновы Канстытуцыйнага ладу»), II («Асоба, грамадства, дзяржава»), IV («Прэзідэнт, Парламент, Урад, суд») і VIII («Дзеянне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і парадак яе змянення») Канстытуцыі могуць быць зменены толькі на рэферэндуме.

Канстытуцыя мае *прамое дзеянне*. Нормы Асноўнага Закона дзейнічаюць непасрэдна. Для іх рэалізацыі не патрабуецца выдання якіх-небудзь спецыяльных актаў. Любая прававая спрэчка можа быць вырашана на аснове Канстытуцыі.



Успомніце, што вы ведаеце аб Усебеларускім народным сходзе. Якой кампетэнцыяй ён валодае і чым ён важны для Беларусі? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце канстытуцыйнага права.** Канстытуцыя з’яўляецца асноўнай крыніцай канстытуцыйнага права, вядучай галіны права прававой сістэмы любой дзяржавы.

**Канстытуцыйнае права** — гэта галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць найважнейшыя грамадскія адносіны. Гэта адносіны, якія вызначаюць асновы арганізацыі дзяржавы і грамадства, асновы становішча чалавека ў дзяржаве, парадак дзейнасці дзяржаўных органаў. Важнасць дадзеных грамадскіх адносін вызначае асаблівае месца канстытуцыйнага права ў сістэме права. Яго нормы з’яўляюцца базавымі для іншых галін, таму канстытуцыйнае права часта характарызуюць як вядучую галіну. Напрыклад, нормы канстытуцыйнага права вызначаюць сістэму органаў выканаўчай улады, парадак іх фарміравання і паўнамоцтвы, што з’яўляецца асновай для адміністрацыйнага права. Замацоўваючы разнастайныя формы ўласнасці і правы ўласніка, канстытуцыйнае права стварае аснову для грамадзянскага права. Такую сувязь можна прасачыць і з іншымі галінамі.

**Выбарчая сістэма ў Рэспубліцы Беларусь.** Выбарчую сістэму можна разглядаць у шырокім сэнсе — як працэдуру фарміравання прадстаўнічых органаў улады, а таксама ў вузкім сэнсе — як спосаб размеркавання мандатаў паміж кандыдатамі, гэта значыць, спосаб падвядзення вынікаў выбараў. Пры вузкім разуменні вылучаюць такія віды выбарчых сістэм, як *мажарытарная*, *прапарцыянальная* і *змешаная* сістэмы.

Прыгадайце асаблівасці мажарытарнай, прапарцыянальнай і змешанай выбарчых сістэм. ■

У Рэспубліцы Беларусь прымяняецца мажарытарная сістэма адноснай і абсалютнай большасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Выбары ў Рэспубліцы Беларусь

| | |
|---|---|
| **Мясцовыя Саветы дэпутатаў**<br>**Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу** | Абраным лічыцца кандыдат у дэпутаты, які атрымаў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у галасаванні |
| **Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу** | Абраным лічыцца кандыдат, які атрымаў больш за палову галасоў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню, што прынялі ўдзел у галасаванні |
| **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** | Абраным лічыцца кандыдат, які атрымаў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у галасаванні |

Прааналізуйце заканадаўчыя нормы і вызначце, па якой сістэме праводзяцца выбары ў кожны з прадстаўленых органаў улады Рэспублікі Беларусь. ■

Для ўдзелу ў выбарчых адносінах неабходна валодаць выбарчым правам, гэта значыць, мець магчымасць выбіраць і быць выбраным. Для таго каб выбіраць, неабходна мець грамадзянства Рэспублікі Беларусь і дасягнуць на дзень выбараў узросту 18 гадоў. Для таго каб быць выбраным, трэба адпавядаць дадатковым патрабаванням.

У выбарах не могуць удзельнічаць асобы, прызнаныя судом недзеяздольнымі, і асобы, што ўтрымліваюцца па прыгаворы суда ў месцах пазбаўлення волі. У галасаванні таксама не могуць удзельнічаць асобы, у дачыненні да якіх прынята такая мера стрымання, як утрыманне пад вартай (але яны маюць магчымасць быць выбранымі).

Канстытуцыяй замацаваны шэраг *прынцыпаў выбарчага права*, што вызначаюць працэс яго рэалізацыі. Артыкул 38 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь абвяшчае: «Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права свабодна выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Выбары ў Рэспубліцы Беларусь

| | |
|---|---|
| **Усеагульныя** | • Права выбіраць маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў |
| **Свабодныя** | • Выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць<br>• Падрыхтоўка і правядзенне выбараў ладзяцца адкрыта і публічна |
| **Роўныя** | • Выбаршчыкі маюць роўную колькасць галасоў<br>• Кандыдаты, што выбіраюцца на дзяржаўныя пасады, удзельнічаюць у выбарах на роўных падставах |
| **Прамыя** | • Дэпутаты і Прэзідэнт выбіраюцца грамадзянамі непасрэдна |
| **Тайнае галасаванне** | • Кантроль за волевыяўленнем выбаршчыкаў у ходзе галасавання забараняецца |

Прааналізуйце палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, зафіксаваныя ў артыкулах 67 (выбары дэпутатаў), 81 (выбары Прэзідэнта), 91 (фарміраванне Нацыянальнага сходу), 118 (фарміраванне мясцовых Саветаў дэпутатаў). Вызначце, фарміраванне якога органа адрозніваецца ад астатніх. У чым, на ваш погляд, прычына такога адрознення? ■

*Выбарчы працэс* — гэта працэс правядзення выбараў, які складаецца з самастойных стадый. Працэдура правядзення выбараў падрабязна ўрэгулявана Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. Стадыямі выбарчага працэсу з'яўляюцца:

1) *прызначэнне даты выбараў*. Выбары Прэзідэнта прызначаюцца Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, а ўсе астатнія выбары — Прэзідэнтам;
2) *утварэнне выбарчых камісій*. Падрыхтоўку і правядзенне выбараў забяспечваюць Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (дзейнічае



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пастаянна), а таксама спецыяльна створаныя акруговыя, тэрытарыяльныя і ўчастковыя камісіі;

3) *утварэнне выбарчых акруг*, ад якіх выбіраюцца выбарныя службовыя асобы, і *ўчасткаў для галасавання*, на якіх непасрэдна праводзіцца галасаванне;
4) *складанне спіса выбаршчыкаў*, у які ўключаюцца асобы, якія валодаюць выбарчым правам і зарэгістраваны на тэрыторыі адпаведнага ўчастка для галасавання;
5) *вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў*. Кандыдаты ў Прэзідэнты могуць вылучацца толькі грамадзянамі (пры наяўнасці не менш як 100 тыс. подпісаў выбаршчыкаў), а кандыдаты ў дэпутаты — грамадзянамі, палітычнымі партыямі і працоўнымі калектывамі;
6) *перадвыбарная агітацыя* з мэтай заахвоціць грамадзян прыняць удзел у выбарах, галасаваць за таго ці іншага кандыдата;
7) *галасаванне*, якое ажыццяўляецца шляхам праставлення адзнакі ў выбарчым бюлетэні;
8) *падлік і абвяшчэнне вынікаў выбараў*, якія арганізуюцца выбарчымі камісіямі.

Знайдзіце на сайце Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (http://www.rec.gov.by) звесткі пра вынікі апошніх прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў у Рэспубліцы Беларусь. ■

**Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.** Важным элементам непасрэднай дэмакратыі з'яўляюцца рэферэндумы. *Рэферэндум* — гэта галасаванне, шляхам якога грамадзяне прымаюць рашэнні па найважнейшых пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

Рэферэндумы могуць быць некалькіх відаў:

- у залежнасці ад тэрыторыі правядзення вылучаюць *рэспубліканскія* (разглядаюцца пытанні рэспубліканскага значэння)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і *мясцовыя* (разглядаюцца пытанні, якія маюць значэнне для адпаведнай часткі тэрыторыі дзяржавы);

- па абавязковасці рашэння вылучаюць *імператыўныя* (рашэнне носіць абавязковы характар) і *кансультацыйныя* рэферэндумы;
- у залежнасці ад неабходнасці правядзення вылучаюць *абавязковыя* (калі рашэнне можа быць прынята толькі рэферэндумам) і *факультатыўныя* (калі рэферэндум з'яўляецца толькі адным з магчымых спосабаў прыняцця рашэння) рэферэндумы;
- па прадмеце вылучаюць *канстытуцыйныя* (па пытаннях змянення і дапаўнення Канстытуцыі) і *звычайныя* (па ўсіх іншых пытаннях) рэферэндумы.

**Рашэнне рэферэндуму**

| Звычайны | Канстытуцыйны |
|---|---|
| Рашэнне лічыцца прынятым рэферэндумам, калі за яго прагаласавала больш за палову грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні | Рашэнне аб прыняцці, змяненні і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць грамадзян, унесеных у спісы для галасавання |

Вызначце розніцу паміж нормамі адносна колькасці галасоў, неабходных для прыняцця рашэння звычайным і канстытуцыйным рэферэндумамі.

У спісы выбаршчыкаў на рэферэндум у краіне X унесена 1000 чалавек. Яўка склала 80 %. Колькі галасоў «за» будзе дастаткова для прыняцця рашэння, калі гэта звычайны рэферэндум, і колькі галасоў «за» неабходна для прыняцця рашэння, калі гэта канстытуцыйны рэферэндум? ■

Рэферэндумы праводзяцца шляхам усеагульнага, свабоднага, роўнага і тайнага галасавання. Лічыцца, што рэферэндум адбыўся, калі ў галасаванні прынялі ўдзел больш за палову грамадзян, унесеных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме. Рашэнні, прынятыя рэферэндумам, могуць быць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

скасаваны або зменены толькі шляхам рэферэндуму (калі іншае не будзе вызначана самім рэферэндумам).

У Рэспубліцы Беларусь рэферэндум праводзіўся тройчы — 14 мая 1995 г., 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.

1. Складзіце схему «Права» па наступным плане: а) азначэнне; б) прыметы; в) асноўныя галіны; г) асноўныя крыніцы (формы) права.
2. Складзіце схему «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь» па наступным плане: а) азначэнне Канстытуцыі; б) дата прыняцця; в) асноўныя характарыстыкі; г) юрыдычныя ўласцівасці.
3. Дайце азначэнне паняцця канстытуцыйнага права і назавіце асаблівасці канстытуцыйнага права ў сістэме права Рэспублікі Беларусь.
4. Якая са стадый выбарчага працэсу часцей за ўсё асацыіруецца з паняццем «выбары»? Раскрыйце сутнасць дадзенай стадыі.
5. Вырашыце сітуацыю: Сяргей Пятровіч жадае балаціравацца ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Яму 37 гадоў, ён грамадзянін Рэспублікі Беларусь па нараджэнні, мае вышэйшую адукацыю і ўласнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, апошнія 3 гады жыве ў Расійскай Федэрацыі. Ці можа Сяргей Пятровіч быць зарэгістраваны ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты? ■

Выканайце міні-праект «Канстытуцыі суседніх з Беларуссю дзяржаў». Стварыце інфаграфіку, у якой адлюструйце колькасць раздзелаў і артыкулаў Канстытуцыі, асновы Канстытуцыйнага ладу, прынцыпы выбарчай сістэмы. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 13. Асновы грамадзянскага права

**Роўнасць удзельнікаў адносін, недатыкальнасць уласнасці, свабода дагавора — асноўныя прынцыпы грамадзянскага права?**



**Асабістыя немаёмасныя адносіны**

Нематэрыяльныя даброты



**Сфера прымянення грамадзянскага права**

**Маёмасныя адносіны**



Матэрыяльныя даброты

**Бесперашкоднае ажыццяўленне грамадзянскіх правоў**

**Грамадзянскі кодэкс**

**Судовая абарона грамадзянскіх правоў**

**Фізічныя асобы**



У поўным аб'ёме з 18 гадоў

З нараджэння

**Суб'екты грамадзянска-прававых адносін**

**Юрыдычныя асобы**

Узнікаюць і спыняюцца адначасова



**Правадольнасць**

**Дзеяздольнасць**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце грамадзянскага права.** **Грамадзянскае права** — гэта галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць адносіны паміж грамадзянамі і арганізацыямі (юрыдычнымі асобамі), накіраваныя на задавальненне іх уласных (асабістых) патрэб і інтарэсаў.

У нацыянальнай прававой сістэме грамадзянскае права з'яўляецца асноватворнай галінай, якая рэгулюе прыватныя грамадскія адносіны. Мы сутыкаемся з грамадзянскім правам штодзень і штогадзіны. Каб хутчэй дабрацца да школы, вы садзіцеся ў аўтобус і тым самым уступаеце ў дагаворныя адносіны па перавозцы пасажыраў; прымаючы падарунак на дзень нараджэння, уступаеце ў прававыя адносіны з дарыльшчыкам (сябрам, бацькамі); капіруючы ў інтэрнэце матэрыял для рэферата без спасылак на аўтара, здзяйсняеце правапарушэнне, якое можа пацягнуць грамадзянска-прававыя санкцыі.

## Адносіны, што рэгулююцца грамадзянскім правам

| Маёмасныя | Асабістыя немаёмасныя |
|---|---|
| Адносіны, якія ўзнікаюць на падставе матэрыяльных даброт (напрыклад, пры куплі канцылярскіх тавараў, рамонце кватэры, пашыве адзення або хімчыстцы) | Адносіны, якія ўзнікаюць на падставе нематэрыяльных даброт (напрыклад, пры абароне гонару, годнасці, прафесійнай рэпутацыі або звязаныя з правам прызнавацца аўтарам мастацкага твора (права аўтарства), правам на недатыкальнасць твора) |

Вядомаму ірландскаму пісьменніку Бернарду Шоу належаць наступныя словы: «Калі ў вас ёсць яблык і ў мяне ёсць яблык і калі мы памяняемся гэтымі яблыкамі, то ў вас і ў мяне застанецца па адным яблыку. А калі ў вас ёсць ідэя і ў мяне ёсць ідэя і мы абменьваемся гэтымі ідэямі, то ў кожнага будзе дзве ідэі». Пра якія адносіны ідзе гаворка, калі разглядаць іх з пазіцыі грамадзянскага права? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Грамадзянскае права рэгулюе грамадскія адносіны, якія заснаваны на трох базавых крытэрыях:**

- **юрыдычная роўнасць удзельнікаў адносін (ніхто з удзельнікаў не можа праяўляць уладу ў адносінах да іншага);**
- **аўтаномія волі (удзельнік грамадзянскіх адносін выяўляе сваю волю свабодна і, паводле агульнага правіла, не можа быць прымушаны ўступіць у такія адносіны);**
- **маёмасная самастойнасць удзельнікаў адносін (магчымасць прымаць рашэнні і несці маёмасную адказнасць за здзейсненыя дзеянні).**

**Найбольш распаўсюджанымі нагодамі ўзнікнення грамадзянскіх адносін выступаюць здзелкі (дагаворы) як акты свабоднага волевыяўлення суб'ектаў грамадзянскага права.**

Здзелкамі прызнаюцца дзеянні грамадзян і юрыдычных асоб, накіраваныя на ўстанаўленне, змяненне або спыненне грамадзянскіх правоў і абавязкаў. Яны могуць быць як аднабаковымі (напрыклад, завяшчанне), так і шматбаковымі (напрыклад, купля-продаж).

Дагавор — дамоўленасць дзвюх ці больш асоб аб устанаўленні, змяненні або спыненні грамадзянскіх правоў і абавязкаў. Дадаткі і дапаўненні да дагавора маюць такую самую сілу, што і сам дагавор. Таму перад тым, як падпісаць дагавор, неабходна ўсё прачытаць. Паставіўшы подпіс, бакі выражаюць згоду на дзеянне ўсіх палажэнняў дагавора ў адносінах да сябе.




На аснове разнастайных грамадзянска-прававых дагавораў (напрыклад, дагавора на аказанне жыллёва-камунальных паслуг, дагавора з аператарам мабільнай сувязі, крэдытнага дагавора, дагавора на аказанне турыстычных паслуг і г. д.) вызначце асноўныя структурныя часткі грамадзянска-прававога дагавора. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Нормы грамадзянскага права, якія рэгулююць грамадзянскія адносіны, могуць утрымлівацца ў розных нарматыўных прававых актах. Асноўнай крыніцай рэгулявання выступае Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь (прынятае скарачэнне — ГК). Паводле агульнага правіла, нормы грамадзянскага права, якія ўтрымліваюцца ў іншых законах, павінны адпавядаць ГК.

**Суб'екты грамадзянска-прававых адносін.** Удзельнікамі (суб'ектамі) адносін, якія рэгулююцца грамадзянскім правам, выступаюць грамадзяне (фізічныя асобы) і юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь, а таксама Рэспубліка Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (часта выкарыстоўваецца абагульнены тэрмін — дзяржава).

*Юрыдычная асоба* — гэта арганізацыя, якая валодае адасобленай маёмасцю, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, ад свайго імя набывае і ажыццяўляе маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выступае ў судзе. Пры гэтым трэба разумець, што, нават валодаючы такімі прыметамі, не кожная арганізацыя з'яўляецца юрыдычнай асобай, а толькі тая, якую дзяржава прызнала юрыдычнай асобай. Асноўным спосабам такога прызнання выступае дзяржаўная рэгістрацыя юрыдычнай асобы, што пацвярджаецца ўключэннем у Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб (http://egr.gov.by).




На аснове Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь вызначце спецыфіку прававога становішча фізічнай асобы, якая ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць. Ці можа фізічная асоба ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка (ІП)? Праверце свае высновы з дапамогай інфармацыі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Юрыдычная асоба можа ствараецца з рознымі мэтамі, у сувязі з чым вылучаюць камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі. *Камерцыйныя арганізацыі* асноўнай мэтай дзейнасці маюць атрыманне прыбытку. Ствараецца камерцыйныя арганізацыі могуць толькі ў формах, прадугледжаных ГК. Найбольш запатрабаванымі ў практыцы з'яўляюцца такія юрыдычныя асобы, як таварыствы з абмежаванай адказнасцю і акцыянерныя таварыствы, а таксама ўнітарныя прадпрыемствы. *Некамерцыйныя арганізацыі* ствараюцца для дасягнення канкрэтных дабрачынных, культурных, адукацыйных і іншых мэт, накіраваных на дасягненне грамадскіх даброт. Яны не ставяць на мэце атрыманне прыбытку. Такімі, у прыватнасці, з'яўляюцца палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, рэлігійныя арганізацыі, спажывецкія кааператывы і інш.

Дзяржава ўдзельнічае ў адносінах, якія рэгулююцца грамадзянскім правам, нароўні з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі, а значыць, не можа праяўляць у такіх адносінах уласцівыя ёй уладныя паўнамоцтвы ў дачыненні да іншых удзельнікаў грамадзянска-прававых адносін. Як суб'ект грамадзянскага права дзяржава выступае, напрыклад, пры выкупе ёю будынкаў, пабудоў, якія знаходзяцца на зямельным участку, што вымаецца для дзяржаўных патрэб. У дзяржаўную ўласнасць перадаюцца знойдзеныя ў выглядзе скарбу матэрыяльныя каштоўнасці, прызнаныя гістарычнай, культурнай каштоўнасцю.

**Грамадзянская правяздольнасць і дзеяздольнасць.** Удзельнікі грамадзянскіх праваадносін валодаюць правяздольнасцю і дзеяздольнасцю.

**Грамадзянская правяздольнасць** — здольнасць мець грамадзянскія правы і абавязкі, у тым ліку здольнасць мець маёмасць па праву ўласнасці, атрымліваць маёмасць у спадчыну, займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, заключаць дагаворы і г. д.

У грамадзян правяздольнасць узнікае з моманту нараджэння, а спыняецца ў сувязі са смерцю асобы. Прычым у сілу закону ўсе грамадзяне валодаюць роўным аб'ёмам правяздольнасці



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

незалежна ад узросту, сацыяльнага становішча, веравызнання, нацыянальнасці. Валоданне праваздольнасцю з’яўляецца асновай для набыцця канкрэтных суб’ектыўных правоў. Так, у сілу закону кожны грамадзянін мае права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, але далёка не кожны гэта права на працягу свайго жыцця рэалізуе. Рэалізаваць права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю можна, прайшоўшы дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка або выступіўшы заснавальнікам камерцыйнай арганізацыі.

Узнікненне праваздольнасці юрыдычнай асобы звязваецца з яе дзяржаўнай рэгістрацыяй. Аб’ём праваздольнасці залежыць ад таго, камерцыйнай ці некамерцыйнай арганізацыяй з’яўляецца гэта юрыдычная асоба.

| Праваздольнасць | |
|---|---|
| **Грамадзяне** | Узнікае з моманту нараджэння, а спыняецца ў сувязі са смерцю асобы. Усе грамадзяне валодаюць роўным аб’ёмам праваздольнасці незалежна ад узросту, сацыяльнага становішча, веравызнання, нацыянальнасці |
| **Юрыдычныя асобы** | • Узнікае з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі і спыняецца ў сувязі з выключэннем з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб. Аб’ём праваздольнасці залежыць ад таго, камерцыйнай ці некамерцыйнай арганізацыяй з’яўляецца гэта юрыдычная асоба.<br>• Камерцыйныя юрыдычныя асобы надзелены здольнасцю мець любыя грамадзянскія правы і любыя абавязкі ў межах, якія не супярэчаць дзеючаму заканадаўству.<br>• Аб’ём і змест правоў і абавязкаў, якімі могуць валодаць некамерцыйныя юрыдычныя асобы, вызначаюцца канкрэтнай мэтай іх дзейнасці, указанай у статуце такой арганізацыі |

Асобнымі відамі дзейнасці грамадзянін ці юрыдычная асоба могуць займацца толькі пры атрыманні спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі). Напрыклад, аказваць юрыдычную дапамогу (юрыдычныя паслугі) грамадзянін можа толькі пры атрыманні ім адвакацкай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ліцэнзіі, юрыдычная асоба — пры атрыманні ліцэнзіі на аказанне юрыдычных паслуг.




Знайдзіце інфармацыю пра тое, які дзяржаўны орган выдае ліцэнзію на кожны від дзейнасці. ■

**Грамадзянская дзеяздольнасць** — здольнасць сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць грамадзянскія правы, ствараць для сябе грамадзянскія абавязкі і выконваць іх.

Дзеяздольнасць фізічных асоб у поўным аб'ёме, іншымі словамі, здольнасць сваімі дзеяннямі набываць любыя правы і абавязкі, узнікае ў сувязі з дасягненнем паўналецця (18-гадовага ўзросту). Грамадзянін, які не дасягнуў 18-гадовага ўзросту, у асобных выпадках таксама можа набыць дзеяздольнасць у поўным аб'ёме. Гэта адбываецца пры заключэнні шлюбу да 18-гадовага ўзросту або ў выніку працэдуры эмансіпацыі (абвяшчэння непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным).

Вызначце на аснове палажэнняў артыкула 26 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пры якіх умовах магчыма эмансіпацыя. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аб'ём дзеяздольнасці непаўналетніх залежыць ад іх узросту і адрозніваецца для непаўналетніх ва ўзросце да 14 гадоў (малалетніх) і непаўналетніх ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

## Дзеяздольнасць непаўналетніх

| Малалетнія (да 14 гадоў) | 14—18 гадоў |
|---|---|
| Самастойна ў грамадзянскім абарачэнні, паводле агульнага правіла, не ўдзельнічаюць. Здзелкі ад іх імя здзяйсняюць законныя прадстаўнікі (бацькі, усынавіцелі, апекуны). Маёмасную адказнасць за здзейсненыя малалетнім дзеянні таксама нясуць законныя прадстаўнікі | Самастойна здзяйсняюць здзелкі, але, паводле агульнага правіла, пад кантролем законных прадстаўнікоў (бацькоў, усынавіцеляў, папячыцеляў) шляхам атрымання згоды на здзяйсненне здзелкі. Нясуць самастойную маёмасную адказнасць па здзейсненых здзелках і за прынесеную шкоду |

Прыгадайце, якія здзелкі малалетнія і непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў маюць права здзяйсняць самастойна. Пацвердзіце вашы веды палажэннямі артыкулаў 25, 27 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. ■

Дзеяздольнасць юрыдычных асоб узнікае адначасова з праваздольнасцю. Паводле агульнага правіла, дзеяздольнасць юрыдычнай асобы рэалізуецца яе органамі кіравання. Напрыклад, дагавор пастаўкі, што заключаецца таварыствам з абмежаванай адказнасцю, ад імя таварыства падпісвае яго дырэктар. Юрыдычная асоба можа надаваць права выступаць ад яе імя іншым асобам — прадстаўнікам, якія дзейнічаюць на аснове даверанасці, што выдаецца органам кіравання юрыдычнай асобы (напрыклад, старшыня праўлення жыллёва-будаўнічага кааператыва выдае даверанасць члену кааператыва на прадстаўленне інтарэсаў кааператыва ў органах па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вызначце, ці можна лічыць грамадзянска-прававымі адносіны, што ўзніклі пры наступных абставінах:
   - кантралёр выявіў у трамваі пасажыра, які ехаў без білета, і прад'явіў яму патрабаванне аб выплаце штрафу за безбілетны праезд;
   - грамадзянін Х, зарэгістраваны як індывідуальны прадпрымальнік, займаўся рамонтам гадзіннікаў. Для ажыццяўлення сваёй дзейнасці заключыў дагавор арэнды памяшкання і шэраг дагавораў, па якіх набыў камплектуючыя для рамонту;
   - вучань 11 класа Y скапіраваў у інтэрнэце матэрыял і выкарыстаў яго пры падрыхтоўцы рэферата без спасылак на аўтара.

   Адказы абгрунтуйце.
2. Запоўніце параўнальную табліцу грамадзянскай праваздольнасці і дзеяздольнасці фізічных і юрыдычных асоб (момант узнікнення і спынення, змест і межы ажыццяўлення).

| Суб'екты грамадзянскага права | Грамадзянская праваздольнасць | Грамадзянская дзеяздольнасць |
|---|---|---|
| | | |

3. Хто будзе несці маёмасную адказнасць за разбітае хлопчыкамі 13 і 15 гадоў у час гульні ў футбол шкло? Адказ абгрунтуйце.
4. Вызначце, якія з пералічаных аб'ектаў непаўналетні можа атрымаць у падарунак сам: веласіпед, кватэра, машына, камп'ютар, мабільны тэлефон. Аргументуйце свой выбар прававымі нормамі, што ўтрымліваюцца ў Грамадзянскім кодэксе. ■

Выканайце міні-праект «Я — індывідуальны прадпрымальнік». З дапамогай вэб-партала АДР (http://egr.gov.by) прааналізуйце патрабаванні да грамадзяніна, які жадае заняцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, і запоўніце заяву на дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 14. Асновы сямейнага права

## Шлюб спараджае ўзаемныя правы і абавязкі мужа і жонкі?



**Умовы заключэння шлюбу**

- Дасягненне шлюбнага ўзросту (18 гадоў)
- Узаемная згода
- Адсутнасць перашкод

**Падставы для спынення шлюбу**

- Скасаванне рэгіструючым органам або судом па заяве мужа ці жонкі
- Смерць або абвяшчэнне судом памерлым мужа ці жонкі



**Мужа і жонкі**



**Бацькоў**



**Дзяцей**

### Кодэкс аб шлюбе і сям'і

**Правы і абавязкі**

**Асабістыя немаёмасныя**

- Сумеснае вырашэнне ўсіх пытанняў шлюбных і сямейных адносін
- Права на выбар прозвішча, прафесіі, месца жыхарства
- Вызначэнне імя, імя па бацьку, прозвішча, месца жыхарства дзяцей
- Выхаванне дзяцей

**Маёмасныя**

**Уласнасць мужа ці жонкі:**

- Маёмасць, якая належала да заключэння шлюбу
- Рэчы індывідуальнага карыстання (адзенне, абутак і інш.), за выключэннем каштоўнасцей і іншых прадметаў раскошы
- Маёмасць, атрыманая ў час шлюбу ў падарунак, у спадчыну, па іншых бязвыплатных здзелках

**Сумесная ўласнасць:**

- Маёмасць, нажытая сямейнай парай у перыяд шлюбу



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце сямейнага права.** **Сямейнае права** — гэта галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць асабістыя немаёмасныя і звязаныя з імі маёмасныя адносіны, якія ўзнікаюць паміж грамадзянамі (фізічнымі асобамі) на аснове шлюбу, сваяцтва, усынаўлення (удачарэння) і іншых форм уладкавання дзяцей на выхаванне ў сям'ю.

Сямейнае права рэгулюе важныя для кожнага чалавека адносіны, якія ўзнікаюць паміж членамі сям'і. Сям'я з'яўляецца найважнейшым сацыяльным інстытутам, адыгрывае асаблівую ролю ў станаўленні кожнага чалавека, забяспечваючы яго выхаванне і першасную сацыялізацыю. У сям'і чалавек засвойвае асноўныя сацыяльныя веды, маральныя перакананні, агульнапрызнаныя маральныя нормы.

## Адносіны, якія рэгулююцца сямейным правам

- Паміж членамі сям'і
- Паміж былымі членамі сям'і (напрыклад, адносіны паміж былымі мужам і жонкай з нагоды ўзаемнага ўтрымання)
- Узнікаюць у выніку прыёму на выхаванне ў сям'ю дзяцей-сірот, дзяцей, якія з розных прычын засталіся без апекі бацькоў (усынаўленне (удачарэнне), апякунская сям'я, прыёмная сям'я, дзіцячы дом сямейнага тыпу)
- Паміж бацькамі і дзецьмі, калі дзеці нарадзіліся ў бацькоў, якія не заключалі шлюбу. Дзеці, народжаныя ў шлюбе і па-за шлюбам, карыстаюцца роўнай і ўсебаковай абаронай

Варта ўлічваць, што не ўсе адносіны, якія ўзнікаюць паміж членамі сям'і, могуць быць урэгуляваны нормамі права (каханне, павага і пад.). Сямейнае права выступае рэгулятарам асобных аспектаў сямейнага жыцця, якія дапускаюць прававую рэгламентацыю, і непарыўна звязана з маральнымі прынцыпамі пабудовы ўзаемаадносін паміж блізкімі людзьмі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У адрозненне ад грамадзянскіх праваадносін, сямейныя праваадносіны характарызуюць асаблівыя падставы ўзнікнення (шлюб, блізкае сваяцтва, прыняцце дзяцей на выхаванне ў сям'ю), правы і абавязкі суб'ектаў сямейных праваадносін не адчужаюцца і не перадаюцца іншым асобам.

Асноўнай крыніцай права, якая рэгулюе сямейныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь, з'яўляецца Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і. Рэгуляванне сямейных адносін накіравана на рашэнне такіх важных задач, як умацаванне сям'і; пабудова сямейных адносін на добраахвотным шлюбным саюзе жанчыны і мужчыны, роўнасці правоў мужа і жонкі ў сям'і, узаемным каханні, павазе і ўзаемадапамозе ўсіх членаў сям'і; забеспячэнне спрыяльных умоў для развіцця і станаўлення кожнага дзіцяці.

*Шлюб* — гэта добраахвотны саюз мужчыны і жанчыны, які заключаецца на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам, накіраваны на стварэнне сям'і і спараджае для бакоў узаемныя правы і абавязкі. Такім чынам, шлюб заключаецца для стварэння сям'і. З юрыдычнага пункту погляду сям'я — гэта аб'яднанне асоб, звязаных паміж сабой маральнай і матэрыяльнай агульнасцю і падтрымкай, вядзеннем агульнай гаспадаркі, правамі і абавязкамі, якія выцякаюць са шлюбу, а таксама блізкага сваяцтва, усынаўлення.

У Рэспубліцы Беларусь прызнаецца толькі шлюб, заключаны ў органах, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану. Да іх, напрыклад, належаць аддзелы запісу актаў грамадзянскага стану (аддзелы ЗАГС) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, Дамы (Палацы) грамадзянскіх абрадаў гарадскіх выканаўчых камітэтаў. Рэлігійныя абрады, якія датычацца пытанняў шлюбу і сям'і, прававога значэння не маюць. Не спараджае юрыдычных правоў і абавязкаў мужа і жонкі сумеснае пражыванне і (ці) вядзенне агульнай гаспадаркі без рэгістрацыі заключэння шлюбу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне







Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, высветліце, у якіх значэннях ужываецца паняцце «грамадзянскі шлюб» і якое з гэтых значэнняў з'яўляецца афіцыйным, а якое — звычным, будзённым. ■

Для заключэння шлюбу патрабуецца выкананне пэўных умоў.

## Умовы заключэння шлюбу

**Узаемная згода**

**Дасягненне шлюбнага ўзросту**

Шлюбны ўзрост — 18 гадоў.
Можа быць зніжаны (але не больш чым на тры гады) у выпадках:
- цяжарнасці нявесты;
- нараджэння дзіцяці;
- набыцця непаўналетнім поўнай дзеяздольнасці

**Адсутнасць перашкод**

Не дапускаецца заключэнне шлюбу:
- калі хтосьці з пары знаходзіцца ў іншым зарэгістраваным шлюбе;
- паміж сваякамі па прамой узыходзячай або спадаючай лініі, паміж паўнароднымі і непаўнароднымі братамі і сёстрамі, паміж усынавіцелямі і ўсыноўленымі;
- калі хаця б адзін з пары прызнаны судом недзеяздольным



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мужчына і жанчына, якія бяруць шлюб, абавязаны прысутнічаць пры рэгістрацыі заключэння шлюбу. Па іх жаданні рэгістрацыя можа быць праведзена ва ўрачыстай абстаноўцы. Рэгістрацыя заключэння шлюбу праз прадстаўніка не дапускаецца.

Шлюб спыняецца ў выніку смерці або абвяшчэння ў судовым парадку памерлым мужа ці жонкі, а пры іх жыцці — у выніку скасавання шлюбу. Пры жыцці мужа і жонкі шлюб можа быць скасаваны судом або органам, які рэгіструе акты грамадзянскага стану (па ўзаемнай згодзе мужа і жонкі, якія не маюць агульных непаўналетніх дзяцей і спрэчак у дачыненні маёмасці).

**Правы і абавязкі мужа і жонкі.** Правы і абавязкі мужа і жонкі ўзнікаюць з дня рэгістрацыі заключэння шлюбу. Яны дзеляцца на асабістыя немаёмасныя і маёмасныя.

Да *асабістых немаёмасных правоў* мужа і жонкі адносяцца:

- права на сумеснае рашэнне пытанняў жыцця сям'і па згодзе абаіх на аснове роўнасці;
- права на свабодны выбар прафесіі, заняткаў і месца жыхарства;
- права на выбар прозвішча пры заключэнні шлюбу.

**Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і**

**Артыкул 21.** Пры заключэнні шлюбу муж і жонка па сваім жаданні выбіраюць прозвішча аднаго з іх у якасці агульнага прозвішча або кожны з іх захоўвае сваё дашлюбнае прозвішча.

Сямейная пара або хтосьці з яе ўдзельнікаў можа выбраць падвойнае прозвішча, якое складаецца з дашлюбных прозвішчаў мужа і жонкі. Калі падвойнае прозвішча жадаюць мець абое, па іх згодзе вызначаецца, з якога дашлюбнага прозвішча яно будзе пачынацца.

Злучэнне больш як двух прозвішчаў не дапускаецца. Калі да ўступлення ў шлюб муж і жонка ці адзін з іх мелі падвойнае прозвішча, па іх згодзе вызначаецца, з якіх частак дашлюбных прозвішчаў будзе складацца новае прозвішча.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Муж і жонка абавязаны будаваць свае адносіны ў сям'і на аснове ўзаемапавагі і ўзаемадапамогі, справядлівага размеркавання сямейных абавязкаў, садзейнічання ў рэалізацыі кожным з іх права на мацярынства (бацькоўства), фізічнае і духоўнае развіццё, атрыманне адукацыі, праяўленне сваіх здольнасцей, працу і адпачынак.

Да *маёмасных адносін* мужа і жонкі належаць адносіны з нагоды маёмасці, якая знаходзіцца ў агульнай сумеснай уласнасці, і адносіны па ўзаемным утрыманні.

Для сямейнай пары дзейнічае рэжым агульнасці маёмасці. Маёмасць, нажытая мужам і жонкай у перыяд шлюбу, незалежна ад таго, на імя каго з іх яна набыта або кім з іх унесены грашовыя сродкі, з'яўляецца іх агульнай сумеснай уласнасцю, яны маюць роўныя правы ў адносінах да гэтай маёмасці. Муж і жонка карыстаюцца роўнымі правамі на сумесна нажытую маёмасць і ў тым выпадку, калі адзін з іх у перыяд шлюбу быў заняты вядзеннем хатняй гаспадаркі, доглядам дзяцей або з іншых уважлівых прычын не меў самастойнага заробку (даходу).

Уласнасцю кожнага з сямейнай пары з'яўляецца маёмасць, якая належала кожнаму да заключэння шлюбу, а таксама атрыманая імі ў перыяд шлюбу ў падарунак (паводле дагавора дарэння) або ў спадчыну. Рэчы індывідуальнага карыстання (адзенне, абутак і г. д.), за выключэннем каштоўнасцей і іншых прадметаў раскошы, няхай і набытыя ў перыяд шлюбу за кошт агульных сродкаў мужа і жонкі, прызнаюцца маёмасцю таго з іх, хто імі карыстаўся.

Муж і жонка абавязаны матэрыяльна падтрымліваць адно аднаго. Пры адмаўленні ў такой падтрымцы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, напрыклад, калі хтосьці з сямейнай пары з'яўляецца непрацаздольным, ён можа ў судовым парадку патрабаваць прадастаўлення ўтрымання ад другога, калі той валодае неабходнымі для гэтага сродкамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асобы, якія ўступаюць у шлюб (і сямейная пара ў час шлюбу) могуць заключыць *шлюбны дагавор*, у якім могуць вызначыць свае правы і абавязкі інакш, чым прадугледжана ў заканадаўстве. Напрыклад, у шлюбным дагаворы можна вызначыць, што каштоўнасці і іншыя прадметы раскошы, набытыя ў перыяд шлюбу за кошт агульных сродкаў мужа і жонкі, прызнаюцца маёмасцю таго ўдзельніка сямейнай пары, хто імі карыстаўся; аўтамабіль, набыты ў час шлюбу, з'яўляецца ўласнасцю аднаго з іх і г. д.




Як вы лічыце, ці спрыяе шлюбны дагавор умацаванню сям'і? Прывядзіце аргументы «за» і «супраць» шлюбнага дагавора. ■

**Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.** Асаблівасцю праваадносін паміж бацькамі і дзецьмі з'яўляецца тое, што многія правы бацькоў з'яўляюцца таксама іх абавязкамі. Напрыклад, бацькі маюць права вызначыць уласнае імя свайму дзіцяці і ў той самы час абавязаны гэта зрабіць. Таксама яны маюць права і абавязаны вызначыць месца жыхарства дзіцяці, рэгістрацыю па месцы жыхарства, месцы знаходжання і грамадзянства дзіцяці (у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам). Бацькі маюць права і абавязаны выхоўваць сваіх дзяцей, ажыццяўляць іх догляд і нагляд за імі.

У сямейным заканадаўстве замацавана паняцце выхавання, пад якім разумеецца клопат пра фізічнае, духоўнае і маральнае развіццё сваіх дзяцей, пра іх здароўе, адукацыю і падрыхтоўку да самастойнага жыцця ў грамадстве.

Бацькі з'яўляюцца законнымі прадстаўнікамі сваіх непаўналетніх дзяцей і выступаюць у абарону іх правоў і законных інтарэсаў у адносінах з любымі асобамі і арганізацыямі, у тым ліку ў судах, без спецыяльных паўнамоцтваў. Бацька і маці маюць роўныя правы і абавязкі ў адносінах да сваіх дзяцей.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі хтосьці з бацькоў жыве асобна ад дзяцей, то ён не толькі мае права кантактаваць з дзецьмі, але і абавязаны прымаць удзел у іх выхаванні. Той з бацькоў, з якім жывуць дзеці, не мае права перашкаджаць другому з бацькоў кантактаваць з дзецьмі і ўдзельнічаць у іх выхаванні.

З маёмасных правоў і абавязкаў бацькоў варта вылучыць правы і абавязкі бацькоў па кіраванні справамі і маёмасцю непаўналетніх дзяцей, а таксама абавязкі бацькоў па ўтрыманні непаўналетніх дзяцей і непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якім патрэбна дапамога.

Варта звярнуць увагу на раздзельнасць маёмасці бацькоў і дзяцей. Сумеснае пражыванне бацькоў і дзяцей (паўналетніх або непаўналетніх) не цягне за сабой узнікнення агульнай сумеснай уласнасці. Дзеці могуць карыстацца маёмасцю бацькоў, але яны не набываюць права ўласнасці на яе.

У той жа час дзецям можа належаць маёмасць, напрыклад, падараваная бацькамі або іншымі асобамі, атрыманая ў спадчыну.

Непаўналетнія не валодаюць у поўным аб'ёме грамадзянскай дзеяздольнасцю, таму бацькі з улікам палажэнняў грамадзянскага заканадаўства здзяйсняюць здзелкі ад імя дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў, а таксама даюць згоду на здзяйсненне шэрагу здзелак з непаўналетнімі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Бацькі абавязаны з належным клопатам ажыццяўляць кіраванне маёмасцю дзіцяці, захоўваць памеры гэтай маёмасці, а пры магчымасці і памнажаць яе. Для здзяйснення некаторых здзелак, адным з бакоў якіх выступаюць непаўналетнія дзеці, патрабуецца таксама папярэдне атрымаць дазвол (згоду) органаў апекі і папячыцельства.

Бацькі абавязаны ўтрымліваць сваіх непаўналетніх дзяцей. Абавязак бацькоў выдзяляць утрыманне непаўналетнім дзецям згодна з агульным правілам спыняецца па дасягненні дзіцем паўналецця або ў выпадку набыцця непаўналетнімі дзецьмі поўнай дзеяздольнасці да дасягнення імі паўналецця.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі дзіця з'яўляецца непрацаздольным (напрыклад, інвалідам), абавязак бацькоў па ўтрыманні захоўваецца і пры дасягненні ім паўналецця.

Не толькі бацькі абавязаны клапаціцца пра дзяцей, але і дзеці абавязаны клапаціцца пра сваіх бацькоў і аказваць ім дапамогу. Утрыманне непрацаздольных бацькоў, якім патрэбна дапамога, з'яўляецца абавязкам іх паўналетніх працаздольных дзяцей, за выключэннем выпадкаў, калі раней бацькі ўхіляліся ад выканання бацькоўскіх абавязкаў або былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў у адносінах да гэтага дзіцяці.

1. У чым розніца паміж паняццямі «шлюб» і «сям'я»? Ці можа існаваць: шлюб без сям'і, сям'я без шлюбу?
2. Назавіце ўмовы заключэння шлюбу і падставы для спынення шлюбу.
3. Ці з'яўляецца залатое ўпрыгажэнне, набытае мужам для сваёй жонкі, асабістай уласнасцю жонкі? Ці будзе аўтамабіль, атрыманы мужам у перыяд шлюбу ў спадчыну, агульнай уласнасцю сямейнай пары?
4. На аснове аналізу прапанаванай сітуацыі растлумачце, чым адрозніваюцца паняцці «выхаванне» дзяцей, «догляд» і «нагляд» за дзецьмі.

   «Мама паставіла перад дзіцем талерку з супам, каб накарміць яго. Яна ўважліва сочыць, каб дзіця не выліла гарачы суп на сябе і не апяклося. Таксама яна вучыць дзіця самастойна есці суп лыжкай».
5. Пры дасягненні якога ўзросту спыняецца абавязак бацькоў па ўтрыманні сваіх непаўналетніх дзяцей? Ці абавязаны бацькі ўтрымліваць сваіх паўналетніх дзяцей? Ці ёсць абавязкі ў дзяцей у адносінах да бацькоў? Аргументуйце свой выбар прававымі нормамі, што ўтрымліваюцца ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і. ■

Выканайце міні-праект «Сямейная рэліквія, якая перадаецца ў спадчыну». Стварыце лонгрыд аб значнай для вашай сям'і рэчы, якая перадаецца ў спадчыну (фотаздымак, ліст, заручальны пярсцёнак і інш.). ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 15. Асновы працоўнага права

## Што важна ведаць наймальніку і работніку аб працоўным праве?




**Працоўны кодэкс**

**Працаўладкаванне**

- Прадастаўленне наймальніку пакета дакументаў
- Папярэдняе выпрабаванне (не больш за тры месяцы). Выключэнне: непаўналетнія, маладыя спецыялісты, часовыя і сезонныя рабочыя, інваліды, прыём на работу па конкурсе або перавод на іншую работу

**Умовы працы**

- Нарміраваная працягласць працоўнага тыдня (40 гадзін)
- Скарочаная працягласць працы са шкоднымі ўмовамі
- Забарона прымянення працы асоб, маладзейшых за 18 гадоў, на цяжкіх работах
- Штодзённы перапынак (не менш за 20 хвілін)
- Штотыднёвыя выхадныя дні
- Штогадовы аплачаны адпачынак (не менш за 24 дні)
- Сацыяльны адпачынак

**Спыненне працоўных адносін**

- Па пагадненні бакоў
- Па жаданні работніка
- Па ініцыятыве наймальніка
- Абставіны, якія не залежаць ад волі бакоў

**Паняцце працоўнага права.** **Працоўнае права** — гэта галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць працоўныя і звязаныя з імі адносіны, устанаўліваюць і абараняюць узаемныя правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў. Нормы працоўнага права замацоўваюць правы і абавязкі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

суб'ектаў у працэсе арганізацыі і прымянення наёмнай працы, гарантыі рэалізацыі гэтых правоў і адказнасць за невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў. Найважнейшай крыніцай працоўнага права з'яўляецца Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь (ПК).

## Прадмет працоўнага права

| Працоўныя адносіны | Адносіны, шчыльна звязаныя з працоўнымі |
|---|---|
| • Заснаваны на пагадненні паміж работнікам і наймальнікам<br>• Работнік асабістай працай за ўзнагароджанне выконвае пэўную працоўную функцыю і падпарадкоўваецца ўнутранаму працоўнаму распарадку арганізацыі<br>• Наймальнік забяспечвае ўмовы працы, прадугледжаныя працоўным заканадаўствам, пагадненнямі, калектыўным і працоўным дагаворамі | Маюць на ўвазе існаванне ў мінулым, сучаснасці або будучыні працоўных адносін:<br>• па забеспячэнні занятасці;<br>• па прафесійнай падрыхтоўцы работнікаў на вытворчасці;<br>• па кантролі і наглядзе за выкананнем заканадаўства аб працы;<br>• па разглядзе працоўных спрэчак;<br>• па дзяржаўным сацыяльным страхаванні;<br>• калектыўныя працоўныя адносіны |

**Заключэнне працоўнага дагавора.** Да заключэння працоўнага дагавора бакі атрымліваюць інфармацыю адзін пра аднаго (суразмоўніцтва, прадастаўленне дакументаў).

Рэзюмэ — дакумент, што ўтрымлівае інфармацыю пра навыкі, вопыт працы, адукацыю і іншую інфармацыю, якая звычайна патрабуецца пры разглядзе кандыдатуры чалавека для найму на працу.




Вызначце ролю рэзюмэ ў працэсе працаўладкавання. Складзіце сваё рэзюмэ. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Наступным этапам становіцца заключэнне працоўнага дагавора. **Працоўны дагавор** — пагадненне паміж работнікам і наймальнікам, у адпаведнасці з якім работнік абавязваецца выконваць пэўную працоўную функцыю і правілы ўнутранага распарадку, а наймальнік абавязваецца забяспечваць работніка абумоўленай працоўным дагаворам працай, гарантаваць належныя ўмовы працы і своечасова выплачваць заработную плату. Працоўны дагавор заключаецца ў пісьмовай форме, складаецца ў двух экзэмплярах і падпісваецца бакамі.

Працоўны дагавор можа быць заключаны на няпэўны тэрмін або на пэўны тэрмін (тэрміновы працоўны дагавор). Адной з разнавіднасцей тэрміновага дагавора з'яўляецца *кантракт*, які заключаецца на тэрмін, не меншы за адзін год і не большы за пяць гадоў.

## Дакументы, якія прад'яўляюцца пры заключэнні працоўнага дагавора

| Ва ўсіх выпадках | У пэўных выпадках |
| --- | --- |
| • Пашпарт або іншы дакумент, які засведчвае асобу<br>• Працоўная кніжка (за выключэннем тых асоб, якія ўпершыню ўладкоўваюцца на працу, і сумяшчальнікаў)<br>• Пасведчанне сацыяльнага страхавання | • Дакументы воінскага ўліку<br>• Дакумент аб адукацыі або навучанні, які пацвярджае наяўнасць права на выкананне дадзенай працы<br>• Накіраванне на працу за кошт броні<br>• Медыцынская даведка аб стане здароўя і інш. |

На аснове матэрыялаў Нацыянальнага прававога партала Рэспублікі Беларусь (http://pravo.by) назавіце, што належыць да дакументаў, якія засведчваюць асобу. ■

У працоўным дагаворы ўтрымліваюцца наступныя абавязковыя ўмовы: звесткі пра працаўніка і наймальніка; месца працы; працоўная функцыя; асноўныя правы і абавязкі работніка і наймальніка; тэрмін працоўнага дагавора (для тэрміновых працоўных дагавораў); рэжым працы і адпачынку; умовы аплаты працы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Працоўная функцыя* — праца на адной ці некалькіх пасадах служачых (прафесіях рабочых) з указаннем кваліфікацыі ў адпаведнасці са штатным раскладам, службовай (рабочай) інструкцыяй і іншымі дакументамі.

У працоўным дагаворы могуць прадугледжвацца дадатковыя ўмовы, напрыклад аб папярэднім выпрабаванні. Яно ўстанаўліваецца з мэтай праверкі адпаведнасці работніка даручанай яму працы.

**Працоўны дагавор № _____**

г. ____________________ «___» ____________ 202_ г.

______________________________________________, названае ў далейшым «Працадаўца», у асобе ______________________________________, які дзейнічае на падставе ______________________________, з аднаго боку і ______________________________________________,
*прозвішча, імя, імя па бацьку работніка*
названы ў далейшым «Работнік», з другога боку, заключылі працоўны дагавор аб наступным:

**1. Прадмет працоўнага дагавора**

1.1. У адпаведнасці з дадзеным працоўным дагаворам Работнік абавязваецца выконваць абавязкі па прафесіі, спецыяльнасці (пасадзе) ______________________________________________
*поўнае найменне прафесіі, спецыяльнасці (пасады)*
______________________________________________
*разрад, клас (катэгорыя кваліфікацыі)*
____________________ месца работы ____________________
з падпарадкаваннем ўнутранаму працоўнаму распарадку Працадаўцы, а Працадаўца абавязваецца забяспечыць Работніку неабходныя ўмовы працы, своечасовую і ў поўным аб'ёме выплату заработнай платы, неабходныя бытавыя ўмовы ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, лакальнымі нарматыўнымі актамі, калектыўным дагаворам і сапраўдным

Азнаёмцеся з працоўным дагаворам вашых бацькоў або з працоўным дагаворам з даступных крыніц інфармацыі. Вызначыце асноўныя элементы працоўнага дагавора і парадак іх выкладання. ■

**Бакі працоўнага дагавора.** Бакамі працоўнага дагавора з'яўляюцца работнік і наймальнік.

*Работнік* — фізічная асоба, якая знаходзіцца ў працоўных адносінах з наймальнікам. Заключэнне працоўнага дагавора дапускаецца з асобамі, якія дасягнулі 16 гадоў. З пісьмовай згоды аднаго з бацькоў працоўны дагавор можа быць заключаны з асобай, якая дасягнула 14 гадоў, для выканання лёгкай працы, якая не з'яўляецца шкоднай для яе здароўя і развіцця, не перашкаджае



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

атрыманню агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Асобы, маладзейшыя за 18 гадоў, прымаюцца на працу пасля папярэдняга медыцынскага агляду і ў далейшым, да дасягнення 18 гадоў, штогод праходзяць абавязковы медыцынскі агляд.



## Асноўныя правы і абавязкі работніка

| Мае права на | Абавязаны |
|---|---|
| • Працу (выбар прафесіі, роду заняткаў і работы)<br>• Здаровыя і бяспечныя ўмовы працы<br>• Абарону эканамічных і сацыяльных правоў і інтарэсаў (аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, заключэнне калектыўных дагавораў, права на забастоўку)<br>• Удзел у сходах і кіраванні арганізацыяй<br>• Своечасовую справядлівую аплату працы<br>• Штодзённы, штотыднёвы і штогадовы адпачынак<br>• Сацыяльнае страхаванне, гарантыі ў выпадку інваліднасці і страты працы<br>• Неўмяшанне ў прыватнае жыццё і павагу асабістай годнасці<br>• Судовую і іншую абарону працоўных правоў | • Добрасумленна выконваць працоўныя абавязкі<br>• Выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку<br>• Выконваць устаноўленыя патрабаванні да якасці прадукцыі, работ, паслуг<br>• Выковаць тэхніку бяспекі<br>• Беражліва ставіцца да маёмасці наймальніка, прымаць меры для прадухілення шкоды<br>• Падтрымліваць сваё працоўнае месца, абсталяванне ў спраўным стане, парадку і чысціні<br>• Выконваць іншыя абавязкі, якія вынікаюць з заканадаўства і працоўнага дагавора |

*Наймальнік* — юрыдычная або фізічная асоба, якой заканадаўствам нададзена права заключэння і спынення працоўнага дагавора з работнікам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



## Асноўныя правы і абавязкі наймальніка

| Мае права | Абавязаны |
|---|---|
| • Заключаць і скасоўваць працоўныя дагаворы з работнікамі<br>• Уступаць у калектыўныя перагаворы і заключаць калектыўныя дагаворы<br>• Заахвочваць работнікаў<br>• Патрабаваць ад работнікаў выканання ўмоў працоўнага дагавора і правіл унутранага распарадку<br>• Прыцягваць работнікаў да дысцыплінарнай і матэрыяльнай адказнасці<br>• Звяртацца ў суд для абароны сваіх правоў | • Азнаёміць работніка з даручанай працай, умовамі і аплатай працы, растлумачыць яго правы і абавязкі<br>• Азнаёміць работніка з калектыўным дагаворам і дакументамі, якія рэгламентуюць унутраны працоўны распарадак<br>• Правесці ўводны інструктаж па ахове працы<br>• Забяспечваць працоўную і вытворчую дысцыпліну<br>• Своечасова выдаваць заработную плату<br>• Забяспечваць умовы працы, прымаць меры па прафілактыцы вытворчага траўматызму, прафесійных і іншых захворванняў работнікаў<br>• Выконваць іншыя абавязкі, якія вынікаюць з заканадаўства і працоўных дагавораў |

Як суадносяцца паміж сабой: правы работніка і абавязкі наймальніка; правы наймальніка і абавязкі работніка? ■

*Працоўны час* — перыяд, на працягу якога работнік у адпаведнасці з правіламі ўнутранага працоўнага распарадку абавязаны знаходзіцца на працоўным месцы і выконваць свае працоўныя абавязкі. Да працоўнага часу належаць таксама звышурочная праца, праца ў святочныя і выхадныя дні. Поўная норма працягласці працоўнага часу ў нармальных умовах не можа перавышаць 40 гадзін на тыдзень.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У 2019 г. у Працоўны кодэкс была ўключана глава, якая рэгулюе асаблівасці працы работнікаў, што выконваюць дыстанцыйную працу. Дыстанцыйная праца — гэта праца, якую работнік выконвае па-за месцам знаходжання наймальніка з выкарыстаннем для выканання гэтай працы і ажыццяўлення ўзаемадзеяння з наймальнікам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

На работнікаў, што выконваюць дыстанцыйную працу, распаўсюджваюцца агульныя нормы працягласці працоўнага часу і часу адпачынку, устаноўленыя Працоўным кодэксам.

Якія тэндэнцыі ў развіцці грамадства прывялі да неабходнасці змянення заканадаўства аб працы? Якія перавагі і недахопы дыстанцыйнай працы для наймальніка і работніка? ■

**Для асобных катэгорый работнікаў устанаўліваецца скарочаная працягласць працоўнага часу. Працягласць штодзённай працы (змены) не можа перавышаць: для работнікаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — 4 гадзін 36 хвілін, ад 16 да 18 гадоў — 7 гадзін. Забараняецца прыцягваць работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, да начных і звышурочных работ, работ у дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні.**

***Час адпачынку*** **— перыяд, на працягу якога работнік у адпаведнасці з працоўным заканадаўствам павінен быць свабодны ад выканання працоўных абавязкаў (перапынкі на працягу працоўнага дня (не менш за 20 хвілін і не больш за 2 гадзіны), штодзённы адпачынак паміж працоўнымі днямі, выхадныя дні, працоўны адпачынак і інш.). Да часу адпачынку належаць дзяржаўныя святы і святочныя дні, устаноўленыя і абвешчаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь непрацоўнымі.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## У Рэспубліцы Беларусь

| | |
|---|---|
| **Адзначаюцца дзяржаўныя святы** | • Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка)<br>• Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі (2 красавіка)<br>• Дзень Перамогі (9 мая)<br>• Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь (другая нядзеля мая)<br>• Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) (3 ліпеня)<br>• Дзень народнага адзінства (17 верасня) |
| **Адзначаюцца святочныя дні** | **Агульнарэспубліканскія:**<br>• Новы год (1 студзеня)<br>• Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (23 лютага)<br>• Дзень жанчын (8 сакавіка)<br>• Свята працы (1 мая)<br>• Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі (7 лістапада)<br>**Рэлігійныя:**<br>• Нараджэнне Хрыстова (праваслаўнае Раство) (7 студзеня)<br>• Вялікдзень (па календары праваслаўнай і каталіцкай канфесій)<br>• Радаўніца (па календары праваслаўнай канфесіі)<br>• Дзень памяці (2 лістапада)<br>• Нараджэнне Хрыстова (каталіцкае Раство) (25 снежня) |
| **Абвяшчаюцца непрацоўнымі днямі** | • 1 студзеня — Новы год<br>• 7 студзеня — Нараджэнне Хрыстова (праваслаўнае Раство)<br>• 8 сакавіка — Дзень жанчын<br>• па календары праваслаўнай канфесіі — Радаўніца<br>• 1 мая — Свята працы<br>• 9 мая — Дзень Перамогі<br>• 3 ліпеня — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі)<br>• 7 лістапада — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі<br>• 25 снежня — Нараджэнне Хрыстова (каталіцкае Раство) |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ці азначаюць непрацоўныя дні, што ў краіне наогул ніхто не працуе? Якім чынам кампенсуецца праца ў дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні? ■

На аснове ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь» вызначце статус такіх святочных дзён, як Дзень ведаў, Дзень настаўніка, Дзень моладзі і студэнцтва, Дзень маці. ■

**Усе работнікі маюць права на працоўны адпачынак, які прадастаўляецца з захаваннем заработнай платы. Працягласць асноўнага працоўнага адпачынку не можа быць меншай за 24 каляндарныя дні. Асобным катэгорыям работнікаў прадастаўляецца адпачынак большай працягласці (напрыклад, работнікам, маладзейшым за 18 гадоў, прадастаўляецца асноўны працоўны адпачынак працягласцю 30 каляндарных дзён).**



Згодна з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, частка працоўнага адпачынку, якая перавышае 21 каляндарны дзень, па пагадненні паміж работнікам і наймальнікам можа быць заменена грашовай кампенсацыяй. Гэта значыць, што 21 дзень работнік у любым выпадку павінен знаходзіцца ў адпачынку.

З якой мэтай была ўведзена дадзеная норма? Чаму нельга ўвесь адпачынак замяніць грашовай кампенсацыяй?

З апорай на інфармацыйныя крыніцы вызначце, наколькі актуальнай для розных краін з'яўляецца праблема недастатковага адпачынку работнікаў. ■

**З мэтай стварэння спрыяльных умоў для мацярынства, догляду дзяцей, атрымання адукацыі, задавальнення сямейна-бытавых патрэб і з іншымі сацыяльнымі мэтамі работнікам прадастаўляецца *сацыяльны адпачынак*.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Заработная плата — узнагароджанне за працу, якое наймальнік абавязаны выплаціць работніку за выкананую працу ў залежнасці ад яе складанасці, колькасці, якасці, умоў працы і кваліфікацыі работніка. Мінімальны памер заработнай платы ўстанаўліваецца дзяржавай. Заканадаўства замацоўвае нормы, якія забяспечваюць недатыкальнасць заработнай платы, недапушчальнасць абмежавання яе памераў і затрымкі выплаты, свабоду абыходжання з заработнай платай.

Прыгадайце, чым адрозніваюцца пагадзінная і здзельная заработная плата. ■

*Працоўная дысцыпліна* — абвязковае для ўсіх работнікаў падпарадкаванне ўстаноўленаму працоўнаму распарадку і належнае выкананне сваіх абавязкаў. За супрацьпраўнае, вінаватае невыкананне ці неналежнае выкананне сваіх працоўных абавязкаў работнік можа быць прыцягнены да дысцыплінарнай адказнасці. Наймальнік можа прымяніць дысцыплінарныя спагнанні (заўвага, вымова, пазбаўленне цалкам ці часткова дадатковых выплат стымулюючага характару на тэрмін да 12 месяцаў, звальненне) і іншыя меры ўздзеяння (пазбаўленне прэміі, змяненне часу працоўнага адпачынку і інш.). Права выбару меры дысцыплінарнага спагнання належыць наймальніку. Пры выбары меры дысцыплінарнага спагнання павінны ўлічвацца цяжкасць дысцыплінарнай правіннасці, акалічнасці, пры якіх яна здзейснена, папярэдняя праца і паводзіны работніка на вытворчасці.

**Спыненне працоўнага дагавора.** Спыненне працоўнага дагавора магчыма толькі на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі: пагадненне бакоў; заканчэнне тэрміну дзеяння тэрміновага працоўнага дагавора; ініцыятыва работніка ці наймальніка; акалічнасці, якія не залежаць ад волі бакоў і інш.

Работнік, які заключыў працоўны дагавор на няпэўны тэрмін, мае права скасаваць яго па жаданні, папярэдзіўшы пра гэта наймальніка пісьмова за адзін месяц. Па пагадненні бакоў працоўны дагавор можа быць скасаваны да заканчэння тэрміну папярэджання. Работнік мае



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

права да заканчэння тэрміну папярэджання пісьмова адклікаць сваю заяву, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

Тэрміновы працоўны дагавор (у тым ліку кантракт) можа быць спынены работнікам толькі пры наяўнасці наступных прычын: хваробы ці інваліднасці; парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага і працоўнага дагавора; паступлення на ваенную службу па кантракце і іншых уважлівых прычын, што перашкаджаюць выкананню работы па працоўным дагаворы.

## Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка

| Невінаватыя падставы | Вінаватыя падставы |
|---|---|
| • Ліквідацыя арганізацыі, скарачэнне колькасці або штату работнікаў<br>• Неадпаведнасць работніка пасадзе або працы, якую выконвае, з-за стану здароўя<br>• Неадпаведнасць работніка занятай пасадзе або працы, якую выконвае, з-за недастатковай кваліфікацыі<br>• Няяўка на працу на працягу звыш чатырох месяцаў запар з прычыны часовай непрацаздольнасці (без уліку адпачынку па цяжарнасці і родах) | • Невыкананне без уважлівых прычын працоўных абавязкаў работнікам, які мае не знятае (не пагашанае) дысцыплінарнае спагнанне<br>• Прагул (у тым ліку адсутнасць на працы звыш трох гадзін на працягу працоўнага дня) без уважлівых прычын<br>• З'яўленне на працы ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення, а таксама распіццё спіртных напояў, ужыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных рэчываў у працоўны час або па месцы працы<br>• Здзяйсненне па месцы працы крадзяжу маёмасці наймальніка<br>• Парушэнне патрабаванняў па ахове працы, якое прывяло да калецтва або смерці іншых работнікаў і да т. п. |

Спыненне працоўнага дагавора афармляецца загадам наймальніка, што з'яўляецца падставай для разліку з работнікам і занясення запісу ў працоўную кніжку, якая выдаецца работніку ў дзень звальнення.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Складзіце схематычны працоўны дагавор аб прыёме на працу прадаўца ў магазін кветак, улічыўшы абавязковыя ўмовы працоўнага дагавора.
2. Прадавец магазіна кветак Алена сышла ў адпачынак 15 чэрвеня. Вызначце, у які дзень яна выйдзе на працу, калі вядома наступнае:
   - працягласць адпачынку Алены складае мінімум, устаноўлены заканадаўствам;
   - згодна з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя святы і святочныя дні (абвешчаныя непрацоўнымі днямі), што прыпадаюць на перыяд працоўнага адпачынку, у лік каляндарных дзён адпачынку не ўключаюцца. Калі ў перыяд адпачынку сустракаецца такі дзень, то пры падліку дзён адпачынку дадаецца яшчэ адзін дзень.
3. Сяргей чатыры месяцы таму працаўладкаваўся поварам у рэстаран, заключыўшы з наймальнікам кантракт тэрмінам на тры гады. Аднак некалькі дзён таму ён атрымаў больш выгадную прапанову адносна працаўладкавання. Вызначце, ці можа Сяргей скасаваць кантракт па ўласным жаданні.
4. У чым заключаюцца станоўчыя і адмоўныя аспекты працоўнага дагавора, заключанага на няпэўны тэрмін, і тэрміновага працоўнага дагавора (кантракта) для кожнага з бакоў — работніка і наймальніка? ■

Выканайце міні-праект «Сацыяльны адпачынак». Правядзіце даследаванне мэт і ўмоў прадастаўлення сацыяльнага адпачынку. Афарміце вынік у выглядзе плаката. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 16. Асновы адміністрацыйнага права

## Правапарушэннем можа стаць як дзеянне, так і бяздзеянне асобы?

### Адміністрацыйнае права

**Суб’екты адміністрацыйна-прававых адносін**

- Дзяржаўныя органы і арганізацыі
- Службовыя асобы, дзяржаўныя служачыя
- Грамадзяне, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства

**Сфера прымянення адміністрацыйнага права**



### Адміністрацыйнае правапарушэнне

**Грамадская шкоднасць**
**Вінаватасць**
**Адміністрацыйная супрацьпраўнасць**
**Адміністрацыйная каральнасць**

**Нязначнае (правіннасць)**

Напрыклад, пераход дарогі ў неналежным месцы







**Значнае**

Напрыклад, абраза

**Грубае**

Напрыклад, дробнае раскраданне

**Адміністрацыйная адказнасць**

**Адміністрацыйныя спагнанні**

**Асноўныя:**
- Штраф
- Грамадскія работы
- Адміністрацыйны арышт

**Дадатковыя:**
- Канфіскацыя
- Спагнанне кошту
- Забарона на наведванне фізкультурна-спартыўных збудаванняў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце адміністрацыйнага права.** У дзяржаве ажыццяўляюцца розныя віды дзейнасці, у тым ліку кіраўніцкая дзейнасць. Гэтая дзейнасць рэгулюецца асаблівай галіной права — адміністрацыйным правам.

**Адміністрацыйнае права** — гэта галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць грамадскія адносіны, якія ўзнікаюць у працэсе арганізацыі і ажыццяўлення дзяржаўнага кіравання. Таму адміністрацыйнае права часта называюць кіраўніцкім правам. І гэта не выпадкова, паколькі ў перакладзе з лацінскай *administratio* абазначае «кіраванне». Нормамі дадзенай галіны забяспечваецца зладжаная праца ўсіх дзяржаўных органаў і арганізацый.

Асаблівасцю адносін, якія рэгулююцца адміністрацыйным правам, з'яўляецца тое, што іх *абавязковым бокам* выступаюць органы дзяржаўнага кіравання ці іх прадстаўнікі. Значная частка гэтых органаў належыць да органаў выканаўчай улады (Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі). Іншыя дзяржаўныя органы (напрыклад, органы прадстаўнічай улады, судовыя органы) у адпаведнасці з нормамі адміністрацыйнага права арганізуюць працу ў сістэме падпарадкаваных арганізацый і ўнутры свайго органа.

З дапамогай норм адміністрацыйнага права ажыццяўляецца дзяржаўны менеджмент: вызначаюцца задачы органаў, размяркоўваюцца паўнамоцтвы, вызначаюцца і прымяняюцца на практыцы розныя формы працы, выбудоўваюцца і кантралююцца ўсе працэсы, ажыццяўляецца дзяржаўная служба.

Адміністрацыйнае права рэгулюе парадак кіравання ўсімі галінамі дзяржаўнай дзейнасці: эканоміка, прамысловасць, сельская гаспадарка, жыллёва-камунальная гаспадарка, транспарт і сувязь, гандаль, адукацыя, ахова здароўя, спорт і турызм, праца і сацыяльная ахова, абарона, фінансы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Адміністрацыйнае правапарушэнне.** Асаблівасцю органаў дзяржаўнага кіравання з'яўляецца наяўнасць у іх паўнамоцтваў на вядзенне адміністрацыйнага працэсу і прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці разам з судамі.

Адзіным законам аб адміністрацыйных правапарушэннях, які дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (КоАП). У адпаведнасці з ім **адміністрацыйным правапарушэннем** прызнаецца супрацьпраўнае вінаватае дзеянне (дзеянне або бяздзеянне) фізічнай асобы, а таксама супрацьпраўнае дзеянне юрыдычнай асобы, за якое ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасць.

**Прыметы адміністрацыйнага правапарушэння**

| | |
|---|---|
| Грамадская шкоднасць | Адміністрацыйная супрацьпраўнасць |
| Адміністрацыйная каральнасць | Вінаватасць |

Паводзіны чалавека могуць быць ацэнены як адміністрацыйнае правапарушэнне ў тым выпадку, калі яны ўяўляюць пэўную пагрозу грамадскім адносінам. Безумоўна, грамадская небяспека асобных учынкаў (напрыклад, безбілетнага праезду ў транспарце, выкідвання смецця ў неналежных месцах) не такая сур'ёзная, як небяспека злачынстваў. Аднак у сукупнасці нават нязначныя дзеянні ўплываюць на паводзіны іншых людзей і наносяць шкоду грамадству.

**КоАП. Артыкул 19.1. Дробнае хуліганства**

Зневажальнае чаплянне да грамадзян і іншыя наўмысныя дзеянні, якія парушаюць грамадскі парадак, дзейнасць арганізацый або спакой грамадзян і выражаюцца ў яўнай непавазе да грамадства, — цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзвюх да трыццаці базавых велічынь, або грамадскія работы, або адміністрацыйны арышт.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У 2016 г. у Мінску на вул. Кастрычніцкай у межах фестывалю Vulica Brasil бразільскім мастаком Рамонам Мартынсам створаны мурал, прысвечаны ахове жывёл.

У якім выпадку маляванне графіці будзе разглядацца як стварэнне арт-аб'ектаў, а ў якім — як здзяйсненне хуліганскіх дзеянняў? Хто будзе несці адказнасць за маляванне на сценах і хуліганскія графіці, зробленыя непаўналетнім?

Чаму ў «тэорыі разбітых шыбаў», прапанаванай амерыканскімі сацыёлагамі ў 1980-я гг., сцвярджаецца, што неабходна актыўна змагацца нават з дробнымі правапарушэннямі (выкідванне смецця ў неўстаноўленых месцах, безбілетны праезд у грамадскім транспарце, хуліганскія графіці), каб палепшыць абстаноўку ў грамадстве ў цэлым? Азнаёмцеся з асноўнымі ідэямі, выказанымі амерыканскімі сацыёлагамі, і сфармулюйце аргументы «за» і «супраць» дадзенай тэорыі.

**Адміністрацыйным правапарушэннем прызнаецца не любое грамадска шкоднае дзеянне (напрыклад, амаральная правіннасць), а толькі такое, на здзяйсненне якога ўстаноўлена забарона ў КоАП. Невыкананне гэтай забароны цягне за сабой прымяненне папярэджання ці адміністрацыйную адказнасць.**

**Адміністрацыйныя правапарушэнні не раўназначныя па сваёй прыродзе.**

**Ёсць нязначныя правапарушэнні — *правіннасці* (напрыклад, пераход дарогі ў неўстаноўленым месцы). За іх здзяйсненне спачатку прымяняецца папярэджанне. Яно заключаецца ў пісьмовым папярэджанні асобы аб недапушчальнасці здзяйснення новых правапарушэнняў. Калі, нягледзячы на папярэджанне, асоба паўторна на працягу года здзейсніць аналагічнае правапарушэнне, то яе ўжо прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці.**

**Існуюць *значныя* правапарушэнні (напрыклад, абраза). Пры іх здзяйсненні першы раз у залежнасці ад сітуацыі можа як**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прымяняцца папярэджанне, так і наступаць адміністрацыйная адказнасць.

Таксама ёсць *грубыя* правапарушэнні (напрыклад, дробнае раскраданне), за здзяйсненне якіх адразу наступае адміністрацыйная адказнасць.

Неабходна адрозніваць адміністрацыйныя правапарушэнні і дзеянні, што крымінальна караюцца (злачынствы). Яны бываюць падобныя. Аднак ключавое іх адрозненне заключаецца ў ступені грамадскай небяспекі (у злачынстваў яна намнога вышэйшая). Напрыклад, простая нецэнзурная лаянка ў грамадскім месцы з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем (дробнае хуліганства). У той самы час нецэнзурная лаянка, якая суправаджаецца пашкоджаннем маёмасці, гвалтам або пагрозай яго прымянення да грамадзян, ужо з'яўляецца злачынствам. Адміністрацыйныя правапарушэнні і злачынствы адрозніваюцца таксама па ступені суровасці мер адказнасці, якія прымяняюцца за іх здзяйсненне.

**Адміністрацыйная адказнасць.** За здзяйсненне адміністрацыйных правапарушэнняў прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. Пад *адміністрацыйнай адказнасцю* разумеецца такая разнавіднасць юрыдычнай адказнасці, якая выражаецца ў прымяненні дзяржаўнымі органамі (іх службовымі асобамі) да асоб, якія здзейснілі адміністрацыйныя правапарушэнні, асаблівых мер прымусу — адміністрацыйных спагнанняў. Пры гэтым фізічныя асобы нясуць адміністрацыйную адказнасць толькі за вінаватыя дзеянні (дзеянні і бяздзеянні).

У Рэспубліцы Беларусь адміністрацыйная адказнасць наступае па дасягненні асобай *16-гадовага ўзросту*. Аднак за шэраг правапарушэнняў, значэнне і супрацьпраўнасць якіх зразумелыя ў больш раннім узросце, адміністрацыйная адказнасць наступае па дасягненні асобай 14 гадоў.

За здзяйсненне адміністрацыйнага правапарушэння прадугледжаны розныя віды адміністрацыйных спагнанняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Віды адміністрацыйных спагнанняў

### Асноўныя спагнанні

- **Штраф**
  Грашовае спагнанне, памер якога вызначаецца ў беларускіх рублях з улікам памеру базавай велічыні, устаноўленай на дзень вынясення пастановы аб накладанні спагнання
- **Грамадскія работы**
  Выкананне фізічнай асобай у вольны ад асноўнай працы, службы або вучобы час бясплатных работ, накіраваных на дасягненне грамадска карысных мэт
- **Адміністрацыйны арышт**
  Утрыманне фізічнай асобы ва ўмовах ізаляцыі ў спецыяльных месцах на тэрмін да 15 сутак (за асобныя парушэнні — на тэрмін да 30 сутак)

### Дадатковыя спагнанні

- **Канфіскацыя**
  Прымусовае бязвыплатнае адабранне ва ўласнасць дзяржавы даходу, атрыманага ў выніку супрацьпраўнай дзейнасці, а таксама прадмета адміністрацыйнага правапарушэння, прылад і сродкаў яго здзяйснення
- **Спагнанне кошту**
  Прымусовае адабранне і перадача ва ўласнасць дзяржавы грашовай сумы, якая складае кошт прадмета адміністрацыйнага правапарушэння, прылад і сродкаў яго здзяйснення
- **Забарона на наведванне фізкультурна-спартыўных збудаванняў**
  Часовая забарона на наведванне фізкультурна-спартыўных збудаванняў у час правядзення спартыўна-масавых мерапрыемстваў

### Як асноўныя, так і дадатковыя спагнанні

- **Пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю**
  Прымяняецца за грубае парушэнне асобай парадку ажыццяўлення пэўнага віду дзейнасці (напрыклад, пазбаўленне права кіраваць транспартным сродкам за ваджэнне ў нецвярозым стане)
- **Дэпартацыя**
  Адміністрацыйнае выдварэнне за межы Рэспублікі Беларусь, якое прымяняецца ў адносінах да замежных грамадзян і асоб без грамадзянства

Не ўсе з пералічаных спагнанняў прымяняюцца да непаўналетніх. Так, асобам, якія не дасягнулі 18 гадоў, не можа быць прызначаны адміністрацыйны арышт або грамадскія работы, а памер штрафу, як правіла, не можа перавышаць дзвюх базавых велічынь.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У адносінах да непаўналетніх шырока прымяняюцца меры прафілактычнага (выхаваўчага) уздзеяння як альтэрнатыва адміністрацыйнай адказнасці.

## Меры выхаваўчага ўздзеяння



### Тлумачэнне заканадаўства

Тлумачэнне непаўналетняму супрацьпраўнага характару і грамадскай шкоднасці здзейсненага ім адміністрацыйнага правапарушэння, у тым ліку прычыненай гэтым правапарушэннем шкоды, а таксама негатыўных прававых наступстваў паўторнага здзяйснення ім новых правапарушэнняў

### Абавязак прынесці прабачэнні

Ускладанне на непаўналетняга абавязку прынесці прабачэнні пацярпеламу за здзейсненае адміністрацыйнае правапарушэнне ў публічнай ці іншай форме

### Абавязак загладзіць прычыненую шкоду

Фактычная кампенсацыя непаўналетнім шкоды, прычыненай адміністрацыйным правапарушэннем

### Абмежаванне вольнага часу

Ускладанне на непаўналетняга абавязку выканання на тэрмін да 30 сутак пэўнага парадку выкарыстання вольнага ад вучобы і (ці) працы часу. Яму можа быць забаронена знаходжанне ў пэўных месцах (на дыскатэках, канцэртах), выкарыстанне асобных форм вольнага часу, у тым ліку звязаных з кіраваннем транспартным сродкам (матацыклам або скутарам), а таксама абмежавана знаходжанне па-за месцам жыхарства ў пэўны час сутак (напрыклад, у начны ці вячэрні час)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Практыка пакарання хуліганаў за правапарушэнні на спартыўных арэнах існуе ў розных краінах.

У Беларусі магчымасць прымянення забароны на наведванне фізкультурна-спартыўных збудаванняў уступіла ў дзеянне ў 2018 г.

Знайдзіце ў Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях, з якім асноўным спагнаннем прымяняецца дадзеная забарона і на які тэрмін яна можа быць накладзена.

Адміністрацыйныя спагнанні і меры прафілактычнага (выхаваўчага) уздзеяння прымяняюцца шырокім колам дзяржаўных органаў (іх службовых асоб): судом, адміністрацыйнай камісіяй, камісіяй па справах непаўналетніх, органамі ўнутраных спраў, органамі дзяржаўнага пажарнага і санітарнага нагляду, Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, органамі пагранічнай і мытнай службы, іншымі ўпаўнаважанымі органамі.

Пры накладанні адміністрацыйнага спагнання і прымяненні мер прафілактычнага (выхаваўчага) уздзеяння ўлічваюцца характар здзейсненага правапарушэння, акалічнасці яго здзяйснення і асоба парушальніка, ступень яго віны, характар і памер прычыненай правапарушэннем шкоды, а таксама акалічнасці, якія змякчаюць або абцяжарваюць адміністрацыйную адказнасць.

У адносінах да непаўналетняга бяруцца пад увагу таксама ўмовы яго жыцця, узровень развіцця, уплыў на яго паводзіны бацькоў, членаў сям'і, старэйшых па ўзросце асоб і паводзіны самога непаўналетняга па месцы вучобы або працы (яго характарыстыка).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях

**Артыкул 18.20.**

1. Парушэнне правіл дарожнага руху пешаходам, асобай, якая кіруе веласіпедам, гужавым транспартным сродкам, ці асобай, якая ўдзельнічае ў дарожным руху і не кіруе транспартным сродкам, — цягне накладанне штрафу ў памеры ад адной да трох базавых велічынь.

2. Парушэнне правіл дарожнага руху асобамі, указанымі ў частцы 1 дадзенага артыкула, здзейсненае ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых дурманлівых рэчываў, а таксама адмаўленне ад праходжання ва ўстаноўленым парадку праверкі (агляду) на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення ці стану, выкліканага ўжываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых дурманлівых рэчываў, — цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад трох да пяці базавых велічынь.

3. Парушэнне правіл дарожнага руху асобамі, указанымі ў частках 1 і 2 дадзенага артыкула, якое прывяло да стварэння аварыйнай абстаноўкі, — цягне накладанне штрафу ў памеры ад трох да васьмі базавых велічынь.

4. Парушэнне правіл дарожнага руху асобамі, указанымі ў частках 1 і 2 дадзенага артыкула, якое прывяло да прычынення пацярпеламу лёгкага цялеснага пашкоджання, а таксама пакіданне імі месца дарожна-транспартнага здарэння, удзельнікамі якога яны з'яўляюцца, — цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад пяці да дваццаці базавых велічынь.

На аснове аналізу артыкула зрабіце высновы аб прымяненні мер адміністрацыйнага спагнання ў залежнасці ад канкрэтных акалічнасцей здзяйснення правапарушэння. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Якое значэнне для грамадства і дзяржавы маюць нормы адміністрацыйнага права?
2. Людзі хочуць жыць у дзяржаве, дзе наладжаны і спрошчаны ўсе кіраўніцкія працэсы, няма канфліктаў і спрэчак у сферы кіравання. Паразважайце, ці могуць інфармацыйныя тэхналогіі дапамагчы ў гэтым. Дзе неабходна іх укараніць? Якія кіраўніцкія працэсы ў дзяржаве яны могуць замяніць?
3. Як быць, калі правапарушэнне здзейсніў непаўналетні? Ці могуць яго прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці? Калі так, то якое спагнанне могуць накласці і якія органы?
4. 14-гадовы падлетак здзейсніў дробнае хуліганства ў выглядзе нецэнзурнай лаянкі ў публічным месцы. За дадзенае правапарушэнне прадугледжаны спагнанні ў выглядзе штрафу або адміністрацыйнага арышту. Аднак дадзеныя віды спагнанняў да яго непрымяняльныя. Якое спагнанне будзе накладзена на непаўналетняга? Падумайце, ці будуць адказваць у дадзеным выпадку бацькі. ■

Выканайце міні-праект «Перавышэнне хуткасці руху як правапарушэнне». Складзіце памятку «Перавышэнне хуткасці руху» (выкарыстайце тэкст артыкула 18.12 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама інфармацыю з адкрытых крыніц пра тое, што ўяўляюць сабой дакументы, якія аўтааматары называюць «лісты шчасця»). ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 17. Асновы крымінальнага права

## Няведанне закону не вызваляе ад адказнасці за злачынства?



**Крымінальны кодэкс**

**Прэзумпцыя невінаватасці — асноўны прынцып**

**Мэты крымінальнай адказнасці**

- Выпраўленне асобы, якая здзейсніла злачынства
- Папярэджанне здзяйснення асуджанымі новых злачынстваў
- Папярэджанне здзяйснення злачынстваў іншымі асобамі

**Прынцып справядлівасці**

1 **Вызначэнне ступені небяспекі дзеяння**

2 **Вызначэнне пакарання за дзеянні**

- Грамадскія работы
- Штраф
- Папраўчыя работы
- Арышт
- Абмежаванне волі
- Пазбаўленне волі на пэўны тэрмін
- Пажыццёвае заключэнне і інш.

3 **Непазбежнасць пакарання**





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце крымінальнага права.** У даўніну першыя помнікі права Беларусі аперыравалі тэрмінам «галоўніцтва». Напрыклад, у Статутах ВКЛ забойца лічыўся галоўнікам і зведваў пакаранне сваёй галавой (жыццём) або іншае вельмі суровае пакаранне. Галоўніцтва (галаўшчызна) як пакаранне часта прымянялася за здзейсненыя злачынствы ў выглядзе грашовых выплат, спагнанняў, кампенсацый. Так пачынала фарміравацца першая сістэма крымінальна-прававых норм на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

**Крымінальнае права** — гэта галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што вызначаюць найбольш небяспечныя для ўсталяванай сістэмы грамадскіх адносін учынкі — злачынствы і ўстанаўліваюць за іх пакаранні або іншыя меры крымінальнай адказнасці. Нормы крымінальнага права абараняюць ад злачынных замахаў мір і бяспеку грамадства, чалавека, яго правы і свабоды, уласнасць, правы юрыдычных асоб, прыроднае асяроддзе, грамадскія і дзяржаўныя інтарэсы, канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь, а таксама ўстаноўлены ў дзяржаве правапарадак.

Поўны пералік відаў злачынстваў і пакаранняў за іх утрымліваецца ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь (КК). Яго асноўнай функцыяй з'яўляецца *ахоўная*. КК выконвае і іншыя функцыі: *рэгулятыўную*, *папераджальную* і *выхаваўчую*.

**Функцыі крымінальнага права**

| Функцыя | Змест |
|---|---|
| **Ахоўная** | Ахова найбольш значных грамадскіх адносін ад злачынных замахаў |
| **Рэгулятыўная** | Рэгламентацыя прымянення мер крымінальнай адказнасці |
| **Папераджальная** | Папярэджанне здзяйснення злачынстваў у будучыні |
| **Выхаваўчая** | Фарміраванне матывацыі законапаслухмяных паводзінаў |

*Злачынства* з'яўляецца самым небяспечным правапарушэннем. Яно вызначаецца як здзейсненае вінавата (наўмысна



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ці па неасцярожнасці) і супрацьпраўна грамадска небяспечнае дзеянне (дзеянне ці бяздзеянне), якое забаронена законам пад пагрозай пакарання. Сукупнасць аб'ектыўных і суб'ектыўных прымет злачынства пэўнага віду называецца *саставам злачынства* (лац. — *corpus delicti*). Злачынствы падзяляюцца на злачынствы, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, менш цяжкія, цяжкія і асабліва цяжкія.

**Крымінальная адказнасць і пакаранне.** Крымінальная адказнасць з'яўляецца самым суровым відам юрыдычнай адказнасці. Яна наступае толькі ў выпадках здзяйснення злачынства.

Крымінальная адказнасць выражаецца ў асуджэнні ад імя Рэспублікі Беларусь па прыгаворы суда асобы, якая здзейсніла злачынства, і прымяненні на аснове асуджэння пакарання або іншых яе мер у адпаведнасці з КК. Да мер крымінальнай адказнасці закон адносіць: пакаранне, адтэрміноўку выканання прызначанага пакарання, умоўнае непрымяненне прызначанага пакарання, асуджэнне без прызначэння пакарання, прымяненне ў адносінах да непаўналетніх прымусовых мер выхаваўчага характару.

Прэзумпцыя невінаватасці — адзін з асноватворных прынцыпаў крымінальнага судаводства, які заключаецца ў тым, што асоба лічыцца невінаватай, пакуль яе віна ў здзейсненым злачынстве не будзе даказана ў парадку, прадугледжаным законам, і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу. Асноўны прынцып прэзумпцыі невінаватасці абвяшчае: «Цяжар доказу крымінальнай віны ляжыць на органе крымінальнага пераследавання».

Чаму прэзумпцыя невінаватасці вылучана ў якасці асобнага артыкула ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? ■

Крымінальная адказнасць мае тры мэты:

- выпраўленне асобы, якая здзейсніла злачынства;
- папярэджанне здзяйснення асуджаным новых злачынстваў;
- папярэджанне здзяйснення злачынстваў іншымі асобамі.

Крымінальная адказнасць садзейнічае аднаўленню сацыяльнай справядлівасці ў грамадстве.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пакаранне** з’яўляецца мерай крымінальнай адказнасці, якая прымяняецца па прыгаворы суда да асобы, асуджанай за злачынства. Пакаранне заключаецца ў прадугледжаным законам пазбаўленні або абмежаванні правоў і свабод асуджанага. Напрыклад, папраўчыя работы абмяжоўваюць працоўныя і эканамічныя правы асуджанага, пазбаўленне волі звязана з пазбаўленнем цэлага комплексу канстытуцыйных свабод і гарантый, абмежаваннем працоўных, сацыяльных, эканамічных і іншых правоў. Пакаранне носіць прымусовы характар, гэта значыць, прызначаецца вінаватай асобе незалежна ад яе меркавання і пажаданняў, і прымяняецца ад імя Рэспублікі Беларусь, а не ад імя асобных службовых асоб, напрыклад следчага, пракурора, суддзі.



Вызначце, для каго прызначаны розныя месцы ў зале суда. ■

Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь прадугледжаны цэлы шэраг пакаранняў. У якасці вышэйшай, выключнай меры пакарання дапускаецца прымяненне смяротнай кары — расстрэлу. Як альтэрнатыва смяротнай кары дапускаецца такая выключная мера пакарання, як пажыццёвае зняволенне. Гэтыя пакаранні прызначаюцца судом за некаторыя асабліва цяжкія



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

злачынствы, звязаныя з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека пры абцяжваючых абставінах.

## Пакаранні

| Асноўныя | Як асноўныя, так і дадатковыя |
|---|---|
| • Папраўчыя работы<br>• Абмежаванне па ваеннай службе<br>• Арышт<br>• Абмежаванне волі<br>• Пазбаўленне волі на пэўны тэрмін<br>• Пажыццёвае зняволенне<br>• Смяротнае пакаранне (да яго скасавання) | • Грамадскія работы<br>• Штраф<br>• Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю |

**Дадатковыя**

• Пазбаўленне воінскага або спецыяльнага звання

Вызначце на аснове аналізу палажэнняў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (тэкст змешчаны на сайце http://www.pravo.by) розніцу паміж наступнымі відамі пакаранняў:

- грамадскія работы і папраўчыя работы (п. 1 арт. 49, п. 1 арт. 52);
- абмежаванне волі і пазбаўленне волі (арт. 55, арт. 57).

У адпаведнасці з *прынцыпам справядлівасці* пакаранне павінна адпавядаць характару і ступені грамадскай небяспекі злачынства, абставінам яго здзяйснення і асобе вінаватага. Крымінальнай адказнасці падлягае асоба, якая дасягнула да часу здзяйснення злачынства *16-гадовага ўзросту*. За некаторыя злачынствы крымінальная адказнасць наступае з 14 гадоў, напрыклад за забойства, наўмыснае прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, згвалтаванне, выкраданне чалавека, крадзеж, грабеж, разбой, вымаганне, раскраданне шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі, хуліганства, заведама ілжывае паведамленне пра небяспеку, крадзеж і незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Злачынствы супраць уласнасці

| | |
|---|---|
| **Крадзеж** | **Артыкул 205.** Тайнае выкраданне маёмасці |
| **Грабеж** | **Артыкул 206.** Адкрытае выкраданне маёмасці |
| **Разбой** | **Артыкул 207.** Прымяненне (або пагроза прымянення) насілля, небяспечнага для жыцця або здароўя пацярпелага, з мэтай непасрэднага завалодання маёмасцю |
| **Вымаганне** | **Артыкул 208.** Патрабаванне перадачы маёмасці або права на маёмасць ці здзяйсненне якіх-небудзь дзеянняў маёмаснага характару пад пагрозай прымянення насілля да пацярпелага ці яго блізкіх, знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці, распаўсюджання паклёпніцкіх ці раскрыцця іншых звестак, якія яны жадаюць захаваць у тайне |
| **Махлярства** | **Артыкул 209.** Завалоданне маёмасцю або набыццё права на маёмасць шляхам падману ці злоўжывання даверам |

У чым заключаецца падабенства і адрозненне паміж названымі злачынствамі? ■

**Артыкул 339. Хуліганства**



1. Наўмысныя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак і выражаюць яўную непавагу да грамадства, суправаджаюцца прымяненнем насілля ці пагрозай яго прымянення або знішчэннем ці пашкоджаннем чужой маёмасці або вылучаюцца па сваім змесце выключным цынізмам (хуліганства), — караюцца грамадскімі работамі, або штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў...



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнайце азначэнні такіх правапарушэнняў, як «дробнае хуліганства» і «хуліганства», і вызначце іх адрозненне. ■

**Артыкул 340. Заведама лжывае паведамленне пра небяспеку**




1. Заведама лжывае паведамленне пра выбух, які рыхтуецца, падпал ці іншыя дзеянні, што ствараюць небяспеку для жыцця і здароўя людзей, або прычыненне шкоды ў буйным памеры, або наступленне іншых цяжкіх наступстваў, — караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў...

У чым заключаецца грамадская небяспека названых дзеянняў? Чаму ў вучэбным дапаможніку надаецца асаблівая ўвага гэтым злачынствам? ■

**Акалічнасці, якія выключаюць злачыннасць дзеяння і крымінальную адказнасць.** Пры пэўных умовах учынкі, падобныя па прыметах да злачынстваў, не цягнуць крымінальнай адказнасці. Гэтыя ўчынкі пазбаўлены грамадскай небяспекі і таму не прызнаюцца злачынствамі. Растлумачыць гэта можна акалічнасцямі, пры якіх яны былі здзейснены.

У Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь рэгламентаваны шэраг *акалічнасцей, якія выключаюць злачыннасць дзеяння.*

**Акалічнасці, якія выключаюць злачыннасць дзеяння**

- Неабходная абарона
- Прычыненне шкоды пры затрыманні асобы, якая здзейсніла злачынства
- Выкананне загаду ці распараджэння
- Знаходжанне сярод саўдзельнікаў злачынства па спецыяльным заданні
- Дзеянне, звязанае з рызыкай (напрыклад, эканамічнай)
- Крайняя неабходнасць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Неабходная абарона, напрыклад, дапускаецца пры абароне жыцця, здароўя, правоў асобы, якая абараняецца, ці іншай асобы, інтарэсаў грамадства ці дзяржавы ад грамадска небяспечнага замаху шляхам прычынення шкоды таму, хто робіць замах, калі пры гэтым не было дапушчана перавышэння межаў неабходнай абароны.

Разам з тым нельга абараняцца ад законных дзеянняў. Супрацьдзеянне асобам, якія ажыццяўляюць правамернае затрыманне правапарушальніка, яго дастаўку ў адпаведныя органы ўлады і да т. п., знаходзіцца па-за межамі неабходнай абароны. Таксама не мае права спасылацца на стан неабходнай абароны чалавек, які ўцягнуты ў бойку і тлумачыць свае дзеянні тым, што аднаму з удзельнікаў пагражала небяспека. Не можа быць прызнаны стан неабходнай абароны ў адносінах да чалавека, які справакаваў напад для таго, каб выкарыстаць яго як нагоду для здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў (расправы, помсты і інш.).



Які малюнак можна выкарыстаць для ілюстрацыі азначэння «неабходная абарона»? Чаму? ■

*Акалічнасцямі, якія выключаюць крымінальную адказнасць*, з'яўляюцца, напрыклад, бессвядомасць асобы, добраахвотнае адмаўленне ад злачынства, адсутнасць патрабавання пацярпелага



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

па справах прыватнага абвінавачання (наўмыснае прычыненне лёгкага цялеснага пашкоджання, катаванне, паклёп, абраза, раскрыццё камерцыйнай тайны і да т. п.).

Да *акалічнасцей, якія вызваляюць ад крымінальной адказнасці*, адносяцца: заканчэнне тэрмінаў даўніны крымінальнага пераследавання; страта дзеяннем грамадскай небяспекі; дзейнае раскаянне асобы; прымірэнне з пацярпелым; амністыя; заява ўдзельніка злачыннай арганізацыі ці банды пра яе існаванне і дапамогу ў яе выкрыцці; выпадкі, спецыяльна прадугледжаныя ў заўвагах да артыкулаў Асаблівай часткі КК (напрыклад, добраахвотная здача асобай агнястрэльнай зброі, наркотыкаў) і інш.

**Акалічнасці, якія змякчаюць і якія абцяжваюць крымінальную адказнасць.** *Акалічнасці, якія змякчаюць адказнасць,* — гэта тыя, якія сведчаць пра значнае зніжэнне ступені грамадскай небяспекі здзейсненага злачынства і асобы вінаватага (яўка з павіннай; чыстасардэчнае раскаянне ў здзейсненым злачынстве; актыўнае спрыянне выяўленню злачынства, выкрыццю іншых удзельнікаў злачынства; добраахвотнае пакрыццё шкоды і інш.).

*Акалічнасці, якія абцяжваюць адказнасць,* — гэта тыя, з якімі закон звязвае ўзмацненне меры каральнасці. Яны ўказваюць на павышаную ступень грамадскай небяспекі здзейсненага і асобы вінаватага. Напрыклад, здзяйсненне злачынства паўторна, групай асоб па папярэдняй змове, арганізаванай групай ці злачыннай арганізацыяй, агульнанебяспечным спосабам, з асаблівай жорсткасцю, што пацягнула цяжкія наступствы, у адносінах да малалетняй, састарэлай або іншай асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане, цяжарнай жанчыны, а таксама ў сувязі з ажыццяўленнем пацярпелым службовай дзейнасці або выкананнем грамадскага абавязку, з нізкіх пабуджэнняў (карыслівых, хуліганскіх і інш.), па матывах расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці або розні, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, з мэтай схаваць іншае злачынства. Адказнасць узмацняецца і ў выпадках здзяйснення злачынства асобай, якая парушыла тым самым прынятую ёй прысягу або прафесійную клятву. Асаблівая ўвага



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пры індывідуалізацыі меры адказнасці надаецца ацэнцы здзяйснення злачынства асобай, якая знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення або стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных ці іншых дурманлівых рэчываў.

1. Вызначце прыметы, якія характарызуюць злачынства.
2. Калі бяздзеянне можа быць расцэнена як злачынства?
3. Назавіце віды пакаранняў, прадугледжаныя Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь. Ці лічыце вы неабходным захаванне ў нашай дзяржаве смяротнай кары як вышэйшай меры пакарання? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
4. Сістэматызуйце даныя аб акалічнасцях крымінальнай адказнасці з дапамогай табліцы. ■

| | |
|---|---|
| **Акалічнасці, якія выключаюць злачыннасць дзеяння** | |
| **Акалічнасці, якія выключаюць крымінальную адказнасць** | |
| **Акалічнасці, якія вызваляюць ад крымінальнай адказнасці** | |
| **Акалічнасці, якія змякчаюць крымінальную адказнасць** | |
| **Акалічнасці, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць** | |

Выканайце міні-праект «Злачыннасць у лічбах». Выкарыстоўваючы актуальныя даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь (http://www.belstat.gov.by, укладка «Правасуддзе і правапарушэнні»), вызначце агульную дынаміку ўзроўню злачыннасці ў Рэспубліцы Беларусь за апошнія 10 гадоў, а таксама найбольш распаўсюджаныя злачынствы ў нашай краіне. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 18. Органы забеспячэння законнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь

## Органы забеспячэння законнасці і правапарадку Рэспублікі Беларусь







### Папярэдняе расследаванне

**Органы аператыўна-вышуковай дзейнасці**
**(органы ўнутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі, дзяржаўнага кантролю)**
Працуюць на ўмовах канспірацыі, выяўляюць і спыняюць злачынствы, адшукваюць тых, хто хаваецца ад пераследавання

**Органы дазнання**
**(міліцыя, мытныя органы, пажарны нагляд)**
Узбуджаюць справу, праводзяць неадкладныя следчыя дзеянні

**Органы папярэдняга следства**
**(Следчы камітэт, Камітэт дзяржаўнай бяспекі)**
Расследуюць справу і перадаюць для пракурорскай праверкі

### Пракурорскі нагляд

**Пракуратура**
- Каардынуе правааховую дзейнасць
- Ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў усімі дзяржаўнымі органамі, службовымі асобамі і грамадскімі аб'яднаннямі, праводзіць пракурорскую праверку
- Пракуроры ўдзельнічаюць у судзе на баку дзяржаўнага абвінавачання

### Адвакатура

### Суд

**Суды агульнай юрысдыкцыі**
Разглядаюць юрыдычныя справы і выносяць па іх законныя і абгрунтаваныя рашэнні пры садзейнічанні ўсіх органаў правапарадку

**Канстытуцыйны Суд**
Выконвае функцыю канстытуцыйнага кантролю

### Органы юстыцыі

**Міністэрства юстыцыі**
**Упраўленні юстыцыі**
**Аддзелы запісу актаў грамадзянскага стану**
**Органы прымусовага выканання судовых рашэнняў**

### Натарыят



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сістэма органаў забеспячэння законнасці і правапарадку.** Важнай умовай стабільнага функцыянавання дзяржавы з'яўляецца забеспячэнне законнасці і правапарадку. Законнасць мае на ўвазе дакладнае і няўхільнае ажыццяўленне прававых прадпісанняў усімі суб'ектамі права ў краіне. *Правапарадак* — гэта такі стан грамадскіх адносін, пры якім яны адпавядаюць прававым прадпісанням.

Да органаў, што забяспечваюць законнасць і правапарадак у Рэспубліцы Беларусь, належаць суды, пракуратура, органы юстыцыі (ад лац. *justitia* — справядлівасць, законнасць), унутраных спраў (міліцыя), дзяржаўнага кантролю, дзяржаўнай бяспекі, мытныя органы. Найважнейшая роля ў выкананні праваахоўнай функцыі ў дзяржаве належыць таксама падраздзяленням Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, Аператыўна-аналітычнаму цэнтру пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Аказанне юрыдычнай дапамогі насельніцтву ўскладаецца на адвакатуру, натарыят і іншыя органы юстыцыі.

**Судовая сістэма.** Сістэма судоў у Рэспубліцы Беларусь будуецца на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі. Яна складаецца з Канстытуцыйнага Суда і судоў агульнай юрысдыкцыі.

*Канстытуцыйны Суд* Рэспублікі Беларусь складаецца з 12 суддзяў (шэсць назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, шэсць абіраюцца Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу; старшыня назначаецца Прэзідэнтам са згоды Савета Рэспублікі). Яго асноўная задача — ажыццяўляць кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве. Канстытуцыйны Суд дае заключэнне аб адпаведнасці розных нарматыўных прававых актаў Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь. Калі нарматыўныя акты ці іх асобныя палажэнні прызнаны неканстытуцыйнымі, яны страчваюць сілу.

Сістэма судоў *агульнай юрысдыкцыі* ўключае: Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь; абласныя (Мінскі гарадскі) суды; эканамічныя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**суды абласцей (горада Мінска); раённыя (гарадскія) суды. Яны ажыццяўляюць правасуддзе шляхам грамадзянскага, крымінальнага, адміністрацыйнага судаводства і судаводства па эканамічных справах.**

Выкарыстоўваючы інфармацыю афіцыйнага сайта Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (http://court.gov.by), вызначце, які раённы (гарадскі) суд будзе з'яўляцца судом першай інстанцыі для мясцовасці, дзе вы жывяце. ■




У будынках судоў часта размяшчаецца скульптурная выява багіні правасуддзя — Феміды (у старажытнагрэчаскай міфалогіі), або Юстыцыі (у старажытнарымскай міфалогіі).

Яе атрыбутамі з'яўляюцца шалі, меч і павязка на вачах.

Шалі — сімвал меры і справядлівасці. На шалях правасуддзя ўзважваюцца дабро і зло, віна і невінаватасць. Строгасць і справядлівасць правасуддзя маюць на ўвазе і дакладнае ўзважванне дзеянняў.

Меч — сімвал адплаты.

Павязка на вачах — сімвал непрадузятасці. Правасуддзе не бачыць адрозненняў паміж людзьмі, яно сляпое ў тым сэнсе, што карае толькі ў адпаведнасці з правам.

Растлумачце сэнс лацінскага выразу Dura lex sed lex — «Закон суровы, але гэта закон». ■



**У раздзеле IV Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь зафіксаваны асноўныя палажэнні ў адносінах да ажыццяўлення правасуддзя ў нашай краіне.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 60.** Кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны.

З мэтай абароны правоў, свабод, гонару і годнасці грамадзяне ў адпаведнасці з законам маюць права спагнаць у судовым парадку як маёмасную шкоду, так і матэрыяльнае кампенсаванне маральнай шкоды.

**Артыкул 110.** Суддзі пры ажыццяўленні правасуддзя незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону.

Якое-небудзь умяшанне ў дзейнасць суддзяў па выкананні правасуддзя недапушчальнае і цягне адказнасць па законе.

**Артыкул 113.** Справы ў судах разглядаюцца калегіяльна, а ў прадугледжаных законам выпадках — аднаасобна суддзямі.

**Артыкул 114.** Разбор спраў ва ўсіх судах адкрыты.

Слуханне спраў у закрытым судовым пасяджэнні дапускаецца толькі ў выпадках, вызначаных законам, з выкананнем усіх правіл судаводства.

**Артыкул 115.** Правасуддзе ажыццяўляецца на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў у працэсе.

Судовыя пастановы з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх грамадзян і службовых асоб.

Бакі і асобы, якія ўдзельнічаюць у працэсе, маюць права на абскарджанне рашэнняў, прыгавораў і іншых судовых пастаноў.

У судовых разборах па якіх справах бакі будуць называцца «ісцец» і «адказчык», а па якіх — «абвінаваўца» і «абвінавачаны»? Як вы думаеце, у чым заключаецца розніца паміж рашэннем суда і прыгаворам суда? ■

**Праваахоўныя органы.** Кожны з праваахоўных органаў у дзяржаве выконвае свае спецыфічныя функцыі.

*Пракуратура* ўяўляе сабой адзіную і цэнтралізаваную сістэму органаў, якія ажыццяўляюць нагляд за дакладным і аднастайным выкананнем нарматыўных прававых актаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Таксама пракуратура ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў пры расследаванні злачынстваў, адпаведнасцю закону судовых рашэнняў па грамадзянскіх, эканамічных, крымінальных справах і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, у выпадках, прадугледжаных законам, праводзіць папярэдняе следства. Пракуратура падтрымлівае дзяржаўнае абвінавачанне ў судах пры разглядзе крымінальных спраў. Узначальвае сістэму органаў пракуратуры Генеральны пракурор, які назначаецца Прэзідэнтам са згоды Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Ніжэйшыя пракуроры назначаюцца Генеральным пракурорам. У ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў пракуроры незалежныя і кіруюцца заканадаўствам.**




Адным з напрамкаў дзейнасці пракуратуры з'яўляецца барацьба з карупцыяй. У 2018—2019 гг. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь выступіла адным з арганізатараў Міжнароднага маладзёжнага конкурсу сацыяльнай антыкарупцыйнай рэкламы «Разам супраць карупцыі». Канкурсантам ва ўзросце ад 14 да 35 гадоў было прапанавана падрыхтаваць тэматычную сацыяльную рэкламу ў намінацыях «Лепшы плакат», «Лепшы відэаролік». Дадзены праект закліканы прыцягнуць увагу моладзі да праблемы карупцыі, садзейнічаць стварэнню нецярпімых адносін у грамадстве да яе праяў.

Азнаёмцеся з работамі, прадстаўленымі на конкурс у папярэднія гады. Правядзіце аналагічны конкурс у сваім класе. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Органы ўнутраных спраў* — дзяржаўныя праваахоўныя органы, якія ажыццяўляюць барацьбу са злачыннасцю, ахову грамадскага парадку і гарантуюць грамадскую бяспеку.

Асноўнымі іх задачамі з'яўляюцца абарона грамадзян, грамадства і дзяржавы ад злачынных і іншых супрацьпраўных замахаў; прафілактыка, выяўленне, спыненне злачынстваў і адміністрацыйных правапарушэнняў; ажыццяўленне дазнання па крымінальных справах, вядзенне адміністрацыйнага працэсу і інш.




## Сістэма органаў унутраных спраў

| Арганізацыйна | Функцыянальна |
| --- | --- |
| • Міністэрства ўнутраных спраў<br>• Тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў — упраўленні і аддзелы (Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, абласных выканаўчых камітэтаў, гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый)<br>• Органы ўнутраных спраў на транспарце<br>• Установы адукацыі і арганізацыі аховы здароўя, створаныя для забеспячэння выканання задач, ускладзеных на органы ўнутраных спраў | • Міліцыя<br>• Падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі<br>• Падраздзяленні аховы<br>• Падраздзяленні фінансаў і тылу<br>• Органы і ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы |

*Міліцыя* ўяўляе сабой сістэму падраздзяленняў органаў унутраных спраў, якая заклікана абараняць жыццё, здароўе, гонар, годнасць, правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, правы і законныя інтарэсы арганізацый, інтарэсы грамадства і дзяржавы ад злачынных і іншых супрацьпраўных замахаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Структура міліцыі

**Міліцыя грамадскай бяспекі**

**Ахова і падтрыманне грамадскага парадку**

- Аператыўна-дзяжурныя службы
- Служба ўчастковых інспектараў міліцыі
- Крымінальна-выканаўчая інспекцыя
- Інспекцыя па справах непаўналетніх (ІСН)
- Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя (ДАІ)
- Дарожна-патрульная служба (ДПС)

**Крымінальная міліцыя**

**Барацьба з небяспечнымі злачынствамі**

- Крымінальны вышук
- Падраздзяленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі
- Падраздзяленне па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі
- Падраздзяленне па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю

У чым заключаецца розніца паміж Камісіяй па справах непаўналетніх і Інспекцыяй па справах непаўналетніх? У структуры якіх органаў яны ствараюцца? ■




Сістэму *органаў дзяржаўнай бяспекі* ўтвараюць Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і яго ўпраўленні па Мінску і абласцях, іншыя тэрытарыяльныя органы, а таксама ўпраўленне ваеннай контрразведкі КДБ. Асноўнымі іх задачамі з'яўляюцца:

- абарона незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь;
- гарантаванне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;
- папярэджанне і выяўленне тэрарыстычнай і экстрэмісцкай дзейнасці, арганізаванай злачыннасці і карупцыі, незаконнай міграцыі, незаконнага абароту наркатычных сродкаў, зброі і боепрыпасаў, кантрабанды.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Камітэт дзяржаўнага кантролю* і яго тэрытарыяльныя органы ажыццяўляюць кантроль:

- за выкананнем рэспубліканскага бюджэту;
- за выкарыстаннем дзяржаўнай уласнасці;
- за выкананнем актаў Прэзідэнта, Парламента, Урада і іншых дзяржаўных органаў, што рэгулююць адносіны дзяржаўнай уласнасці, гаспадарчыя, фінансавыя і падатковыя адносіны.






**Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь**

Ажыццяўляе папярэдняе следства і паўнамоцтвы ў сферы дасудовай крымінальнай вытворчасці



**Дзяржаўны пагранічны камітэт**

Ажыццяўляе правядзенне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і гарантаванне пагранічнай бяспекі




**Дзяржаўны мытны камітэт**

Ажыццяўляе правядзенне дзяржаўнай мытнай палітыкі, барацьбу з кантрабандай



**Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз**

Вядзе судова-экспертную дзейнасць

Якія элементы з’яўляюцца агульнымі для эмблем праваахоўных органаў? Што яны сімвалізуюць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Чым, на ваш погляд, абумоўлена канстытуцыйная норма, якая забараняе суддзям, пракурорскім работнікам, супрацоўнікам органаў унутраных спраў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, органаў бяспекі, ваеннаслужачым быць членамі палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць палітычныя мэты? ■

**Органы юстыцыі.** У сістэму органаў юстыцыі ўваходзяць: Міністэрства юстыцыі, галоўныя ўпраўленні юстыцыі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, аддзелы запісу актаў грамадзянскага стану (ЗАГС), органы прымусовага выканання судовых рашэнняў.




Міністэрства юстыцыі рашае наступныя асноўныя задачы:

- рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў сферы юстыцыі, у тым ліку дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў сферы архіўнай справы і справаводства;
- рэгуляванне натарыяльнай дзейнасці і кіраўніцтва натарыятам у Рэспубліцы Беларусь;
- кіраўніцтва рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану;
- дзяржаўная рэгістрацыя палітычных партый, рэспубліканскіх прафесійных саюзаў, міжнародных і рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў;
- вядзенне Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;
- арганізацыя і развіццё сістэмы юрыдычных паслуг, ліцэнзаванне адвакацкай дзейнасці, дзяржаўная рэгістрацыя арганізацый, што забяспечваюць правядзенне медыяцыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Юрыдычная дапамога.** Права грамадзян на атрыманне юрыдычнай дапамогі зафіксавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 62.** Кожны мае права на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод, у тым ліку права карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў у судзе, іншых дзяржаўных органах, органах мясцовага кіравання, на прадпрыемствах, ва ўстановах, у арганізацыях, грамадскіх аб'яднаннях і ў адносінах са службовымі асобамі і грамадзянамі. У выпадках, прадугледжаных законам, юрыдычная дапамога аказваецца за кошт дзяржаўных сродкаў.

Процідзеянне аказанню прававой дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь забараняецца.

*Натарыят* (ад лац. *notarius* — перапісчык) — гэта прававы інстытут, які займаецца засведчваннем здзелак і наданнем юрыдычнай сілы розным дакументам (дагаворы, завяшчанні, даверанасці і г. д.). Натарыят з'яўляецца органам, надзеленым паўнамоцтвамі ажыццяўляць бяспрэчную юрысдыкцыю, г. зн. рашаць толькі тыя пытанні, па якіх у бакоў не ўзнікае спрэчак. Гранічная колькасць натарыусаў устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Усе натарыусы з'яўляюцца членамі прафесійнага аб'яднання «Беларуская натарыяльная палата».

**Натарыус здзяйсняе наступныя віды натарыяльных дзеянняў:**

- засведчвае здзелкі (у тым ліку завяшчанні);
- засведчвае пагадненні, даверанасці;
- выдае пасведчанні аб праве на спадчыну;
- выдае пасведчанні аб праве ўласнасці на долю ў маёмасці, нажытай сямейнай парай у перыяд шлюбу;
- засведчвае дакладнасць копій дакументаў і выпісак з дакументаў;
- засведчвае сапраўднасць подпісу на дакументах;
- засведчвае правільнасць перакладу дакументаў з адной мовы на другую;



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- прымае ў дэпазіт натарыуса грашовыя сродкі і (ці) каштоўныя паперы;
- прымае на захоўванне дакументы;
- іншыя натарыяльныя дзеянні, прадугледжаныя заканадаўствам.

Прывядзіце прыклады, калі членам вашай сям'і даводзілася звяртацца па натарыяльныя паслугі. ■

**_Адвакатура_ (ад лац. _advocatus_ — заклікаus) — гэта прававы інстытут, заклікаusы аказваць на прафесійнай аснове юрыдычную дапамогу з мэтай ажыццяўлення і абароны правоў, свабод і інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб.**

**Адвакат здзяйсняе наступныя дзеянні:**

- кансультуе і дае тлумачэнні, вусныя і пісьмовыя даведкі па юрыдычных пытаннях;
- складае заявы, скаргі і іншыя дакументы прававога характару;
- ажыццяўляе прадстаўніцтва ў судах, арганізацыях па грамадзянскіх справах і справах аб адміністрацыйных парушэннях;
- ажыццяўляе прававое абслугоўванне камерцыйных аперацый, заключэнне кантрактаў, распрацоўку статутаў, дакументаў;
- удзельнічае ў крымінальным судаводстве ў якасці абаронцы, прадстаўніка пацярпелага. ■

У нашай краіне дзейнічае Беларуская рэспубліканская калегія адвакатаў, якая прадстаўляе інтарэсы адвакатаў ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, каардынуе дзейнасць тэрытарыяльных калегій адвакатаў, ажыццяўляе меры, накіраваныя на павышэнне даступнасці і якасці аказання юрыдычнай дапамогі.

Параўнальна новай з'явай у сферы юрыдычнай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца медыяцыя. Закон аб медыяцыі быў прыняты ў 2013 г. *Медыяцыя* — гэта перагаворы бакоў з удзелам нейтральнай асобы з мэтай урэгулявання спрэчкі шляхам выпрацоўкі ўзаемапрымальнага для ўдзельнікаў пагаднення.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У працэсе такіх перамоў можна без звароту ў суд знайсці ўзаемавыгаднае рашэнне ў многіх канфліктах. Медыяцыя прымяняецца пры вырашэнні спрэчак, што ўзнікаюць з грамадзянскіх праваадносін, у тым ліку ў сувязі з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, а таксама спрэчак, што ўзнікаюць з працоўных і сямейных праваадносін; з 2021 г. можа прымяняцца ў рамках крымінальнага працэсу.

1. Якія асноўныя задачы органаў забеспячэння законнасці і правапарадку?
2. Якім органам выдадзены ваш пашпарт? Якое месца гэты орган займае ў сістэме органаў унутраных спраў?
3. Якія дзеянні будуць выконваць розныя органы ў сітуацыі кватэрнага крадзяжу?
4. Якімі відамі юрыдычнай дапамогі можа скарыстацца чалавек?
5. Што належыць да спрэчных і бясспрэчных сітуацый і ў чым іх адрозненне з пункту гледжання атрымання юрыдычнай дапамогі? ■

Выканайце міні-праект. Напішыце тэкст-памятку «Як вам дапаможа медыяцыя» . ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь»

1. Дайце азначэнне наступным паняццям: *адміністрацыйнае права, адміністрацыйнае правапарушэнне, грамадзянскае права, грамадзянская дзеяздольнасць, грамадзянская праваздольнасць, канстытуцыйнае права, крымінальнае права, пакаранне, працоўнае права, працоўны дагавор, сямейнае права.*
2. Прывядзіце прыклады ўплыву матываў на ацэнку прававых паводзінаў. Чаму ў прыведзеных вамі прыкладах права лічыць важным ацаніць матыў прававых паводзінаў?
3. Растлумачце сцвярджэнне, што Канстытуцыя з’яўляецца прававым падмуркам, змяшчае зыходныя нормы-прынцыпы розных галін права. Нормы якіх артыкулаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь будуць канкрэтызаваны ў Выбарчым кодэксе, Працоўным кодэксе, Кодэксе аб шлюбе і сям’і? Прывядзіце прыклады.
4. Сістэматызуйце свае веды аб галінах права. Запоўніце табліцу.

| Галіны права | Сфера прымянення | Суб’екты прававых адносін | Асаблівасці рэгулявання адносін з удзелам непаўналетніх |
|---|---|---|---|
| Грамадзянскае | | | |
| Сямейнае | | | |
| Працоўнае | | | |
| Адміністрацыйнае | | | |
| Крымінальнае | | | |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Прасачыце пашырэнне правоў, абавязкаў і адказнасці ў розных галінах права па меры дасягнення чалавекам узросту: 14 гадоў, 16 гадоў, 18 гадоў.
6. Вызначце, нормы якой галіны права парушаны ў наступных выпадках: парушэнне правіл пажарнай бяспекі, выкраданне аўтамабіля, прагул на працы, пераход дарогі ў неналежным месцы, пратэрміноўка вырабу шафы майстрам-мэбельшчыкам.
7. Прывядзіце прыклады грамадзянска-прававых дагавораў. Назавіце агульныя і адметныя рысы грамадзянска-прававога дагавора, працоўнага дагавора, шлюбнага дагавора.
8. Грунтуючыся на дадзенай аб'яве, растлумачце, як вы разумееце паняцце «публічная аферта». Азнаёмцеся з палажэннямі аднаго з кодэксаў Рэспублікі Беларусь:




**Артыкул 405.** Аферта

1. Афертай прызнаецца адрасаваная аднаму або некалькім канкрэтным асобам прапанова, што з'яўляецца дастаткова канкрэтнай і выказвае намер асобы, якая зрабіла прапанову, лічыць, што яна заключыла дагавор з адрасатам, якім будзе прынята прапанова.

**Артыкул 407.** Запрашэнне рабіць аферты

1. Рэклама і іншыя прапановы, адрасаваныя няпэўнаму колу асоб, разглядаюцца як запрашэнне рабіць аферты, калі іншае прама не паказана ў прапанове.

2. Публічнай афертай прызнаецца прапанова, якая змяшчае ўсе істотныя ўмовы дагавора і з якой бачыцца воля асобы, што робіць прапанову, заключыць дагавор на названых у прапанове ўмовах з любым, хто адгукнецца.

Вызначыце на падставе сваіх ведаў аб асноўных галінах права, у якім кодэксе ўтрымліваюцца дадзеныя нормы. У якіх сітуацыях вы кожны дзень сутыкаецеся з публічнай афертай? Калі вашы правы як спажыўца будуць парушаны, якім чынам



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вы можаце іх абараніць? (Выкарыстоўвайце Закон аб абароне правоў спажыўцоў.)

9. Ахарактарызуйце прававы механізм заключэння і скасавання шлюбу ў нашай краіне. Ці могуць сямейныя адносіны, якія ўзніклі ў Рэспубліцы Беларусь, рэгулявацца міжнароднымі дамоўленасцямі?
10. Напішыце эсэ на адну з прапанаваных тэм:
    - «Дабром трэба адказваць на дабро, а на зло трэба адказваць справядлівасцю» *(Канфуцый)*;
    - «Закон і ўсталёўваецца затым, каб моцны-багаты не ўсё, што яму пажадаецца, рабіў» *(Леў Сапега)*.
11. Параўнайце наступныя нормы адміністрацыйнага і крымінальнага права. Якім чынам яны ўзаемазвязаны?

| Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях | Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь |
|---|---|
| Артыкул 11.1. Дробнае раскраданне | Артыкул 205. Крадзеж |
| Артыкул 11.4. Прысваенне знойдзенай маёмасці | Артыкул 215. Прысваенне знойдзенай маёмасці |
| Артыкул 19.1. Дробнае хуліганства | Артыкул 339. Хуліганства |
| Артыкул 19.6. Заведама лжывае паведамленне | Артыкул 340. Заведама лжывае паведамленне пра небяспеку |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# IV Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы

## 1 Што такое?

- Інавацыі
- Дэмаграфічная бяспека
- Рэгіянальная палітыка

## 2 Як развіваецца?

- Навуковы патэнцыял
- IT-сфера
- Сацыяльная сфера

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Аграгарадок і аграсядзіба
- Інавацыі і навацыі

## 4 Як узаемазвязаны?

- Дэмаграфічная бяспека і гендарная палітыка
- Устойлівасць развіцця і інавацыі
- Сацыяльныя палітыка і абарона

## 5 Якія вылучаюцца?

- Напрамкі палітыкі
- Дзяржаўныя праграмы

**Не спыняцца на дасягнутым!**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 19—20. Дынаміка складу насельніцтва і сацыяльная палітыка дзяржавы

## Дынаміка сацыяльнай структуры беларускага грамадства адпавядае тэндэнцыям развітых краін?

### Структура насельніцтва
(паводле даных перапісу насельніцтва 2019 г.)

**9413,4 тыс. чалавек**




**Узрост**

| | Узрост | |
|---|---|---|
| 85 382 | >80 | 281 234 |
| 67 798 | 75—79 | 160 061 |
| 123 837 | 70—74 | 219 468 |
| 202 835 | 65—69 | 310 845 |
| 292 835 | 60—64 | 387 326 |
| 319 173 | 55—59 | 385 127 |
| 289 385 | 50—54 | 333 961 |
| 302 148 | 45—49 | 337 685 |
| 325 233 | 40—44 | 345 140 |
| 367 695 | 35—39 | 381 356 |
| 388 316 | 30—34 | 392 937 |
| 305 775 | 25—29 | 310 546 |
| 228 635 | 20—24 | 219 413 |
| 234 423 | 15—19 | 221 344 |
| 259 437 | 10—14 | 246 882 |
| 288 068 | 5—9 | 273 160 |
| 270 610 | 0—4 | 255 488 |
| 46,2 % | | 53,8 % |

**Месца пражывання**

| Гарадское | Сельскае |
|---|---|
| 77,5 % | 22,5 % |

**Працаздольнасць**

| Маладзейшыя | Працаздольны ўзрост | Старэйшыя |
|---|---|---|
| 17,9 % | 57,6 % | 24,5 % |




| Беларусы | Рускія |
|---|---|
| 84,9 % | 7,5 % |
| 7990,7 тыс. | 707,0 тыс. |




| Палякі | Украінцы |
|---|---|
| 3 % | 1,7 % |
| 287,7 тыс. | 159,7 тыс. |

**Іншыя**
2,9 % 268,3 тыс.

**Родная мова**
Беларуская
5 094 928 чалавек
Руская
3 983 765 чалавек

**Мова, на якой размаўляюць дома**
Беларуская
2 447 764 чалавек
Руская
6 718 557 чалавек



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сацыяльны склад насельніцтва.** Апісаць канкрэтнае грамадства, зразумець асаблівасці яго развіцця, вызначыць, якія ў ім ёсць супольнасці і групы, дазваляюць такія навукі, як сацыялогія і статыстыка. Галоўнай крыніцай інфармацыі з'яўляецца спецыяльная справаздачнасць, якую вядуць практычна ўсе арганізацыі краіны — як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя. У межах статыстычнай справаздачнасці апісваецца сацыяльны склад краіны. Паняцце *сацыяльны склад* насельніцтва краіны па сваім змесце блізкае паняццю «сацыяльная структура грамадства». Але яно адлюстроўвае не проста наяўнасць тых ці іншых груп у грамадстве, але і іх колькасць, і тыя змены, якія ў іх адбываюцца (дынаміку). Сацыяльны склад апісваецца па такіх крытэрыях, як агульная колькасць насельніцтва, полаўзроставы склад, тэрытарыяльная канцэнтрацыя і шчыльнасць, суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва, этнічны і рэлігійны склад, узровень адукацыі і характар занятасці і г. д.

Вельмі важную ролю адыгрываюць перапісы насельніцтва. Перапісы ў краіне праводзяцца з пэўнымі інтэрваламі.

**Дынаміка колькасці насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь паводле даных перапісаў 1959—2019 гг. (тыс. чалавек)**






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У нашай краіне было праведзена 9 перапісаў (1926, 1937, 1959, 1970, 1979, 1989, 1999, 2009, 2019 гг.). Якія тэндэнцыі ў колькасці насельніцтва выявілі перапісы 2009 і 2019 гг.? Назавіце магчымыя прычыны прыросту гарадскога і скарачэння сельскага насельніцтва. ■

У нашай краіне пражывае каля 9,5 млн чалавек. Прыкладна 78 % насельніцтва Беларусі жыве ў гарадах, адпаведна 22 % — гэта сельскае насельніцтва. Па ўзроўні адукацыі насельніцтва наша краіна дасягнула значных поспехаў. Узровень пісьменнасці складае 99,7 %, колькасць людзей, якія маюць вышэйшую, сярэднюю і базавую адукацыю, складае 90 % насельніцтва. Доля людзей ва ўзросце ад 25 да 64 гадоў, якія маюць вышэйшую адукацыю, складае амаль 25 %.

Дынаміка сацыяльнай структуры сучаснага беларускага грамадства адпавядае тым тэндэнцыям, якія характэрны для развітых прамысловых дзяржаў: узрастанне долі гарадскога насельніцтва, рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, узрастанне долі работнікаў кваліфікаванай працы.

**Дэмаграфічная палітыка.** Дэмаграфічная палітыка цесна звязана з дэмаграфіяй, якая вывучае колькасць, узрост, здароўе, смяротнасць і нараджальнасць, міграцыю насельніцтва, рассяленне гарадскога і сельскага насельніцтва, узнікненне сем'яў і іх распад, асноўныя тэндэнцыі ў развіцці народанасельніцтва і г. д. Дэмаграфія апісвае дэмаграфічныя працэсы і выяўляе адпаведныя праблемы ў жыцці грамадства.

Разуменне дынамікі сацыяльнага складу насельніцтва закладваецца ў аснову дэмаграфічнай палітыкі дзяржавы. **Дэмаграфічная палітыка** — гэта сістэма мер, якія ажыццяўляюцца дзяржавай у адносінах да пэўных груп грамадства з мэтай фарміравання дэмаграфічнай структуры ў адпаведнасці з яе нацыянальнымі дэмаграфічнымі інтарэсамі і гарантавання дэмаграфічнай бяспекі краіны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Дэмаграфічная бяспека** — гэта стан абароненасці грамадства і дзяржавы ад дэмаграфічных пагроз. *Дэмаграфічнымі пагрозамі* называюцца тыя дэмаграфічныя з'явы і тэндэнцыі, сацыяльна-эканамічныя наступствы якіх аказваюць адмоўнае ўздзеянне на развіццё краіны. З мэтай пераадолення негатыўных дэмаграфічных тэндэнцый у краіне кожныя пяць гадоў распрацоўваецца канцэпцыя дэмаграфічнай бяспекі і вызначаюцца прыярытэтныя напрамкі дэмаграфічнай палітыкі.



| Устойлівы рост колькасці беларускай нацыі | Павелічэнне працягласці жыцця насельніцтва | Умацаванне інстытута сям'і | Аптымізацыя міграцыйных патокаў |
|---|---|---|---|

**Асноўныя нацыянальныя інтарэсы ў дэмаграфічнай сферы**

Ажыццяўленне комплексу мер, прадугледжаных дзяржаўнымі праграмамі дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, прывялі да пэўнага паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў нашай краіне. Напрыклад, па інтэгральным паказчыку дзіцячай і мацярынскай смяротнасці наша краіна зараз знаходзіцца на чацвёртым месцы ў свеце, па ўзроўні даступнасці медыцыны — на трэцім. Па Індэксе мацярынства, які штогод складаецца міжнароднай арганізацыяй Save the Children, Беларусь уваходзіць у 25 (са 179) краін, спрыяльных для нараджэння дзіцяці, і лідзіруе сярод краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Галоўная дэмаграфічная задача сёння — паступовае павелічэнне колькасці насельніцтва.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Адной з найважнейшых задач дэмаграфічнай палітыкі з'яўляецца зніжэнне ўзроўню смяротнасці, у тым ліку за кошт змяншэння колькасці ахвяр дарожна-транспартных здарэнняў.

Стварыце сацыяльную рэкламу, прысвечаную адной з наступных праблем: выкарыстанне рамянёў бяспекі, выкарыстанне святлоадбівальных элементаў, перавышэнне вадзіцелямі хуткасці, абгон на дарогах, выкарыстанне спецыяльных крэслаў для перавозкі дзяцей, выкананне правіл дарожнага руху пешаходамі, веласіпедыстамі, матацыклістамі. ■

**Гендарная палітыка.** Змены, якія адбываюцца ў сацыяльнай структуры сучаснага беларускага грамадства, датычацца таксама і гендарных праблем. Паняцце «гендар» ужываецца для таго, каб падкрэсліць, што ў грамадстве значэнне маюць не толькі біялагічныя або фізічныя адрозненні паміж мужчынамі і жанчынамі, але і тое культурнае і сацыяльнае значэнне, якое грамадства надае гэтым адрозненням. Быць у грамадстве мужчынам ці жанчынай — значыць не проста валодаць тымі ці іншымі анатамічнымі асаблівасцямі, але і выконваць тыя ці іншыя прадпісаныя грамадствам *гендарныя ролі*. Так, традыцыйна жанчыну разглядалі як маці і захавальніцу дамашняга ачага, мужчыну — як здабытчыка, абаронцу сям'і.

Прыгадайце, што такое стэрэатып. Якія прыклады гендарных стэрэатыпаў вы можаце прывесці? ■

Гендарныя ролі істотна адрозніваюцца ў розных грамадствах, у асобных з іх разглядаюцца як нераўнацэнныя. Становішча, калі групы мужчын і жанчын маюць розныя магчымасці ў грамадстве, апісваецца паняццем *гендарная няроўнасць*.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Па ўзроўні пераадолення гендарнай няроўнасці краіны адрозніваюцца адна ад адной. Так, у некаторых мусульманскіх краінах жанчыны да гэтага часу пазбаўлены права голасу і таму не могуць удзельнічаць у выбарах. Сярэдняя колькасць жанчын у парламентах ва ўсім свеце сёння ледзь перавышае 23 % (у Беларусі — 35 %).**

Згодна з Індэксам гендарнай роўнасці (The Gender Equity Index) Беларусь знаходзіцца на 31-м месцы (звесткі за 2019 г.) у рэйтынгу, які вядзе Праграма развіцця ААН (ПРААН).

Выкарыстоўваючы рэсурс ААН, вызначце месцы ў дадзеным рэйтынгу былых савецкіх рэспублік. Па якіх асноўных паказчыках Індэкс вымярае дасягненні краіны ў галіне раўнапраўнасці палоў?



**Гендарная палітыка — гэта палітыка, накіраваная на дасягненне роўнасці мужчын і жанчын, устанаўленне гендарнага балансу ва ўсіх сферах жыцця грамадства. У Беларусі сярод усіх працоўных доля жанчын складае 49,5 %, мужчын — 50,5 %.**

Чым можна растлумачыць перавагу жанчын у гандлі і грамадскім харчаванні, ва ўстановах культуры, у адукацыі, ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні?

**Да гендарных праблем у нашай краіне, як правіла, адносяць перагружанасць жанчыны дамашняй працай, яе большую ў параўнанні з мужчынамі занятасць выхаваннем дзяцей, меншую ў параўнанні з мужчынамі колькасць жанчын-кіраўнікоў і інш. Задачай гендарнай палітыкі ў нашай краіне з'яўляецца ўстанаўленне гендарнага балансу ва ўсіх сферах жыцця грамадства.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Маладзёжная палітыка.** У Рэспубліцы Беларусь распрацаваны прыярытэты маладзёжнай палітыкі, вызначаны яе мэты, задачы, формы рэалізацыі. **Маладзёжная палітыка** — сістэма сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных, прававых і іншых мер, якія накіраваны на падтрымку маладых грамадзян і ажыццяўляюцца дзяржавай з мэтай сацыяльнага станаўлення і развіцця моладзі, найбольш поўнай рэалізацыі яе патэнцыялу ў інтарэсах усяго грамадства.

У прынятай у 2021 г. Стратэгіі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2030 г. вызначаюцца мэты, прыярытэты і інструменты дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, а таксама параметры інвестыцый у маладзёжныя праграмы, праекты, маладзёжныя грамадскія аб'яднанні і інфраструктуру маладзёжнай палітыкі.

Прыярытэтнымі напрамкамі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі з'яўляюцца прафарыентацыя, адукацыя і працаўладкаванне моладзі; сацыяльна-эканамічная падтрымка маладой сям'і; развіццё творчага патэнцыялу таленавітай моладзі; фарміраванне стандартаў здаровага ладу жыцця, экалагічнай культуры і беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя.

У цяперашні час у краіне дзейнічае больш за 300 маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў. Яны рэалізуюць розныя грамадскія праекты, займаюцца вывучэннем гісторыі і культуры Беларусі, актыўна ўключаюцца ў валанцёрскую, экалагічную, інавацыйную дзейнасць.

У 2011 г. па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі стартаваў праект «100 ідэй для Беларусі» на лепшую інавацыйную ідэю ў розных сферах сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны. За ўсю гісторыю «100 ідэй» арганізатарам паступіла больш за 15 тыс. заявак. Больш за 3 тыс. з іх рэалізаваныя.




Даведайцеся, якія праекты сталі пераможцамі ў бягучым годзе. Якія намінацыі праекта вам найбольш цікавыя? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Важным напрамкам маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы з'яўляецца падтрымка таленавітай і адоранай моладзі. Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў і спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ажыццяўляюць выплату стыпендый і розных прэмій, аказваюць аднаразовую матэрыяльную дапамогу. Сродкі фондаў выкарыстоўваюцца для правядзення нацыянальных і міжнародных студэнцкіх навуковых канферэнцый, конкурсаў, семінараў, алімпіяд і г. д.

**Нацыянальная палітыка.** Нацыянальны склад насельніцтва любой краіны мае важнае значэнне для яе сацыяльна-эканамічнага развіцця. Наша краіна належыць да тыпу краін з высокай этнічнай аднароднасцю. Больш за 80 % насельніцтва адносяць сябе да беларусаў, пры гэтым у краіне пражываюць прадстаўнікі 130 нацыянальнасцей. Кожны чалавек адносіць сябе да той ці іншай этнічнай групы, але ўсе разам мы — беларускі народ, беларуская нацыя, грамадзяне адной краіны.

Нацыянальная палітыка звязана з вырашэннем праблем міграцыі, дэмаграфічнай сітуацыі, сувязей з замежнымі суайчыннікамі. Любая праблема (культурная, рэлігійная, моўная, эканамічная) можа набыць нацыянальны характар, калі закранае інтарэсы якой-небудзь этнічнай супольнасці. **Нацыянальная палітыка** — гэта мэтанакіраваная дзейнасць дзяржаўных структур па рэгуляванні ўзаемаадносін паміж нацыямі, этнічнымі групамі.

У Рэспубліцы Беларусь створаны грамадскія аб'яднанні, якія прадстаўляюць грамадзян многіх нацыянальнасцей. Іх дзейнасць звязана з вывучэннем гісторыі і культуры сваіх народаў. Большасць нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў выдаюць газеты, бюлетэні, часопісы. Ствараюцца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

культурна-асветніцкія цэнтры, калектывы народнай творчасці. Пачынаючы з 1996 г. у Гродне раз на два гады ладзяцца рэспубліканскія фестывалі нацыянальных культур. Пры Міністэрстве культуры дзейнічае Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур.



Якія ідэі закладзены ў мастацкім афармленні сайта Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур? Па фатаграфіях у галерэі сайта апішыце мерапрыемствы, якія зацікавілі вас. ■

Грамадзяне маюць права выбіраць мову выхавання і навучання, карыстацца роднай мовай. У Рэспубліцы Беларусь асноўнымі мовамі навучання з'яўляюцца дзяржаўныя мовы — беларуская і руская. У той жа час ва ўстановах адукацыі могуць ствараццa групы, класы, у якіх навучанне ажыццяўляецца на мове нацыянальнай меншасці. У школах выхаднога дня вывучаюцца армянская, азербайджанская, грузінская, грэчаская, карэйская, латышская, літоўская, малдаўская, нямецкая, татарская, украінская, польская, яўрэйская мовы.

Беларуская дзяржава супрацоўнічае з беларускімі арганізацыямі ў розных краінах свету, падтрымлівае кантакты з беларусамі замежжа, якіх налічваецца больш за 3 млн чалавек. Наша краіна зацікаўлена ў тым, каб развіваць адносіны з людзьмі, якія любяць сваю гістарычную радзіму, вызначаюць сябе беларусамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У 2017 г. у час III Фестывалю мастацтваў беларусаў свету ў Мінску адкрылі памятны знак «Беларусам замежжа».

Як вы лічыце, чаму асновай для кампазіцыі стала кола? Выкарыстайце памятку для аналізу фатаграфіі помніка, мемарыяла. ■

**Усе грамадзяне Рэспублікі Беларусь зацікаўлены ў тым, каб у краіне былі згода, узаемапавага паміж людзьмі розных нацыянальнасцей. Мірныя міжэтнічныя адносіны ў Беларусі маюць глыбокія гістарычныя карані. Захаванне агульнай згоды, культуры міжнацыянальных зносін з’яўляецца адным з найважнейшых дасягненняў Беларусі.**

**Канфесійная палітыка. У сучасным беларускім грамадстве рэлігія ўспрымаецца як значная частка нацыянальнай культуры і асабістага жыцця чалавека. Рэлігійнымі людзьмі лічаць сябе больш за 60 % беларусаў. Інфармацыю аб размеркаванні вернікаў па канфесіях даюць вынікі сацыялагічных апытанняў.**

Знайдзіце вынікі некалькіх сацыялагічных апытанняў аб канфесійнай прыналежнасці вернікаў у Беларусі. Чаму іх вынікі адрозніваюцца адзін ад аднаго? Як вы думаеце, чаму пытання аб канфесійнай прыналежнасці няма ў перапісе насельніцтва? ■

**Рэспубліка Беларусь — поліканфесійная краіна. У Беларусі налічваецца 26 рэлігійных канфесій і больш за 3,4 тыс. рэлігійных абшчын, больш за дзве сотні рэлігійных арганізацый.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Канфесійная палітыка** — гэта мэтанакіраваная дзейнасць дзяржаўных структур, якая мае на мэце ўсталяванне адносін цярпімасці і павагі паміж грамадзянамі, рэлігійнымі арганізацыямі розных веравызнанняў.

Асноўныя прынцыпы канфесійнай палітыкі замацаваны ў Канстытуцыі нашай краіны і Законе «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях».

Прыгадайце, што такое свабода сумлення і свабода веравызнання. ■

Якія палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь датычацца свабоды сумлення, а якія — свабоды веравызнання? ■

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» (2002 г.) рэгулюе праваадносіны ў галіне правоў чалавека і грамадзяніна на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый зыходзячы з:

- права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад адносін да рэлігіі;
- роўнасці рэлігій перад законам;
- прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа;
- духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі;
- неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангелісцка-лютэранскай царквы, іўдаізму і ісламу;
- неабходнасці садзейнічання дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Даведайцеся, чаму горад Іўе ў Гродзенскай вобласці часта называюць «беларускім Ерусалімам» ці Іўе-дэ-Жанэйра. Якія незвычайныя помнікі ўсталяваны на вуліцах Іўя? Чаму помнік на цэнтральнай плошчы называецца «Чатыры канфесіі»?

Ці можна сказаць, што гэты невялікі гарадок стаў сімвалам беларускай рэлігійнай талерантнасці? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Выкарыстайце памятку для аналізу фатаграфіі помніка, мемарыяла.



Дзяржава гарантуе грамадзянам права на свабоду аб'яднання ў рэлігійныя арганізацыі — добраахвотныя аб'яднанні грамадзян Рэспублікі Беларусь для задавальнення рэлігійных патрэб. Да рэлігійных арганізацый таксама належаць кляштары і манаскія абшчыны, рэлігійныя брацтвы і сястрынствы, рэлігійныя місіі, духоўныя навучальныя ўстановы. Кіраўніком рэлігійнай арганізацыі можа быць толькі грамадзянін Рэспублікі Беларусь. Дзяржава вызначае прававыя нормы, у адпаведнасці з якімі рэлігійныя арганізацыі ажыццяўляюць сваю дзейнасць, папярэджвае дзейнасць розных рэлігійных дэструкцыйных сект.

Рэспубліка Беларусь — шматэтнічная і шматканфесійная краіна. Галоўная мэта нацыянальнай і канфесійнай палітыкі — рабіць усё для таго, каб Беларусь была агульным домам для ўсіх нацыянальнасцей і канфесій.

Для ажыццяўлення палітыкі ў сферы міжнацыянальных і міжканфесійных адносін створаны дзяржаўны орган — Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Пры ім створаны Кансультацыйны міжканфесійны савет і Кансультацыйны міжэтнічны савет. На пасяджэннях Саветаў абмяркоўваюцца ўсе пытанні ўзаемадзеяння дзяржаўных структур і рэлігійных, нацыянальных арганізацый.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. З дапамогай уводнай інфаграфікі ахарактарызуйце сацыяльны склад насельніцтва Беларусі.
2. Адзін з артыкулаў у друку, прысвечаных гендарнай палітыцы ў Беларусі, меў наступны загаловак: «Гендарная палітыка ў Беларусі разбівае “шкляную столь” у грамадскай свядомасці». У ім гаварылася, што «*самае галоўнае — прадастаўленне роўных магчымасцей, а кожны чалавек, мужчына ён або жанчына, сам будуе свой лёс. Непасрэдна ад кожнага з нас залежыць, якія ў грамадстве фарміруюцца каштоўнасныя арыенціры, бо менавіта яны забяспечваюць свабоду выбару жыццёвага шляху і разбіваюць “шкляныя столі”*». Як вы думаеце, чаму нябачны і фармальна ніяк не абазначаны бар’ер у кар’еры параўноўваецца са «шкляной столлю»?
3. Канкрэтызуйце прыкладамі прыярытэтныя напрамкі маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы.
4. У чым вытокі поліэтнічнага і поліканфесійнага складу насельніцтва Беларусі? Аргументуйце свой пункт погляду, прывядзіце гістарычныя факты.
5. Ахарактарызуйце дэмаграфічную, гендарную, маладзёжную, нацыянальную і канфесійную палітыку беларускай дзяржавы. Запоўніце табліцу. ■

| Палітыка | Мэта | Дзяржаўны орган, які каардынуе дасягненне мэты |
|---|---|---|
| **Дэмаграфічная** | | |
| **Гендарная** | | |
| **Маладзёжная** | | |
| **Нацыянальная** | | |
| **Канфесійная** | | |

Выканайце міні-праект «Храмы розных канфесій на адной плошчы». Стварыце фотагалерэю культавых збудаванняў розных канфесій, якія знаходзяцца на адной плошчы, вуліцы вашага населенага пункта. Падрыхтуйце экскурсію. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 21. Інавацыйнае развіццё краіны

## Навуковыя распрацоўкі вызначаюць узровень інавацыйнага развіцця краіны?

**Навука**



- Атрыманне новых ведаў пра чалавека, грамадства, прыроду, штучна створаныя аб'екты
- Стварэнне і ўкараненне новых тэхналогій і абсталявання
- Развіццё галін эканомікі і сацыяльнай сферы
- Рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў і ахова навакольнага асяроддзя
- Даследаванне і выкарыстанне касмічнай прасторы з мірнымі мэтамі

### Прыярытэтныя напрамкі навуковых даследаванняў

- **Энергетыка**
- **Хімічны сінтэз**
- **Біялагічныя сістэмы**
- **Медыцына**
- **Інфарматыка і касмічныя даследаванні**
- **Электроніка і фатоніка**
- **Сістэмы і комплексы машын**
- **Шматфункцыянальныя матэрыялы**
- **Аграпрамысловы комплекс**
- **Экалогія**
- **Грамадства і эканоміка**
- **Міждысцыплінарныя даследаванні**
- **Бяспека**

### Дасягненні беларускай навукі



**Спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі**



**Суперкамп'ютар «СКІФ-ГЕА-ЦАД РБ»**



**Лазеры новага пакалення**



**Новыя гатункі сельскагаспадарчых раслін**



**Новыя лекі**



**Лінейка электратранспартных сродкаў**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце інавацыйнага шляху развіцця. Інавацыі** (ад лац. *innovatio* — абнаўленне) — гэта любыя новыя ідэі, рэалізаваныя на практыцы; новаўвядзенні, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці чалавечай дзейнасці. Да іх належаць не толькі глабальныя тэхналагічныя прарывы (атамная энергетыка, камп'ютар і г. д.), але і разнастайныя ўдасканаленні. Так, інавацыямі ў свой час былі і аловак з прымацаваным да яго ласцікам, і самаклейныя аркушы для нататак, і цукар-рафінад, і чай у пакецiках.

Значныя поспехі былі дасягнуты шэрагам кампаній дзякуючы інавацыям у сістэме арганізацыі вытворчасці, прымяненні новых метадаў кіравання і прынцыпаў кантролю за якасцю выпушчанай прадукцыі.

У чым падабенства і адрозненне паняццяў «інавацыя» і «вынаходства», «інавацыя» і «навацыя», «новаўвядзенне»? ■







Дэвіз інавацыі — «новае і іншае» — характарызуе разнастайнасць гэтага паняцця. Прывядзіце прыклад інавацыі: які-небудзь новы прадукт ці новую паслугу, якімі вы нядаўна карысталіся. Як вы думаеце, чаму ў якасці сімвала інавацыі вельмі часта выкарыстоўваецца лямпачка? Што значыць фраза «Думай па-за межамі кардонкі»? ■

Стварыце свой дызайн лямпачкі, прысвечанай інавацыям. ■

Вылучаюць два тыпы інавацый: *паляпшальныя* і *радыкальныя*. Першыя накіраваны на ўдасканаленне, паляпшэнне асобных характарыстык выпушчанай прадукцыі, тэхналогій, метадаў працы,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**што выкарыстоўваюцца. Радыкальныя інавацыі змяняюць спосаб вытворчай дзейнасці — яго тэхнічныя, тэхналагічныя, арганізацыйныя асновы.**

Першае падрабязнае апісанне інавацый было зроблена Ёзэфам Шумпетэрам у працы «Тэорыя эканамічнага развіцця» (1911). Вучоны разглядаў інавацыі як сродак пераадолення эканамічных крызісаў. Ён адзначаў, што з дапамогай новаўвядзенняў прадпрыемства можа выкарыстоўваць новыя канкурэнтныя прыёмы, адрозныя ад ранейшых цэнавых форм канкурэнцыі. Гэтыя прыёмы ён назваў эфектыўнай канкурэнцыяй.

Ё. Шумпетэр сфармуляваў пяць асноўных новаўвядзенняў:
- увядзенне новага прадукту ці вядомага прадукту з новымі якасцямі;
- выкарыстанне новай тэхнікі, тэхналагічных працэсаў, стварэнне новага метаду вытворчасці;
- адкрыццё новага рынку збыту;
- выкарыстанне новых відаў сыравіны;
- змяненні арганізацыйных асноў вытворчасці.

Шумпетэр лічыў, што новаўвядзенні з'яўляюцца не раўнамерна, а групамі (кластарамі). Стымулам да зараджэння новых кластараў інавацый служаць новыя навуковыя адкрыцці. Такім чынам была сфармулявана ідэя аб нераўнамернасці інавацыйнай актыўнасці.

**Інавацыі забяспечваюць перш за ўсё развіццё чалавечага патэнцыялу, а таксама доўгачасовы ўстойлівы рост эфектыўнасці эканомікі. Стварэнне інавацыйнай эканомікі немагчыма без апоры на нацыянальныя навуковыя школы і апераджальную адукацыю. Асноўным фактарам росту эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці эканомікі з'яўляецца навуковая, навукова-тэхнічная і ўкараняльная дзейнасць.**

**Навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. У Рэспубліцы Беларусь сфарміравана сістэма навуковай дзейнасці, асноўнымі кампанентамі якой з'яўляюцца *ўстановы адукацыі* (ад студэнцкай лавы да падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кваліфікацыі) і *навуковыя ўстановы* (арганізацыі, якія ажыццяўляюць даследчую і навукова-тэхнічную дзейнасць). Навуковыя даследаванні і распрацоўкі выконваюць больш за 300 арганізацый (уключаючы ўстановы вышэйшай адукацыі). Вядучай навуковай арганізацыяй у краіне з'яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.

Прыгадайце, у якім годзе адбылося адкрыццё Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Хто быў першым прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук? ■

У сучасных умовах толькі тыя дзяржавы, якія актыўна ўкараняюць навуковыя дасягненні ў розныя сферы жыццядзейнасці грамадства, здольны забяспечыць высокі ўзровень сацыяльнага дабрабыту і заняць годнае месца на сусветнай арэне.

**Навука — найважнейшы фактар прагрэсу і інавацыйнага развіцця?**



Паводле ацэнак міжнародных экспертаў, Рэспубліка Беларусь належыць да ліку краін з высокім узроўнем навуковага патэнцыялу. У рэйтынгу «добрых краін» (GoodCountry Index-2019) Беларусь заняла 61-е месца сярод 153 краін, пры гэтым найбольш высокую пазіцыю (23-е месца) — па паказчыку «навука і тэхналогіі».

Даведайцеся, па якіх крытэрыях ацэньваецца «добрая краіна» ў дадзеным рэйтынгу. Якія пазіцыі займае наша краіна па выніках апошняга даследавання? ■

Беларуская навука займае трывалыя пазіцыі ў такіх галінах, як інфарматызацыя і праграмнае забеспячэнне, нанатэхналогіі і новыя матэрыялы, энергаэфектыўныя, лазерныя тэхналогіі, генетыка і біятэхналогіі, экалагічная ўстойлівасць і інш. З мэтай захавання і развіцця навуковага патэнцыялу прызначаюцца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

спецыяльныя стыпендыі і ўстанаўліваюцца надбаўкі дзеячам навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры, а таксама таленавітым маладым вучоным.

Актыўна развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва беларускіх вучоных. Гэта абумоўлена інтэрнацыянальным характарам навуковай дзейнасці. Немагчыма плённа даследаваць многія важныя з'явы, напрыклад стан навакольнага асяроддзя, інфекцыйныя захворванні, міграцыю насельніцтва або эканамічныя праблемы, толькі з нацыянальнага пункту погляду. Для правядзення найбольш перспектыўных і складаных навуковых даследаванняў патрабуюцца аб'яднаныя намаганні шэрагу краін.



Беларускія вучоныя і інжынеры паспяхова ўдзельнічалі ў стварэнні складаных сістэм эксперыментальных установак Вялікага адроннага калайдара ў Еўрапейскай арганізацыі ядзерных даследаванняў (CERN), размешчанай на мяжы Швейцарыі і Францыі.

Даведайцеся, што рабілі на Вялікім адронным калайдары настаўнікі фізікі з Беларусі. Праверце дакладнасць гэтай інфармацыі. Выкарыстайце памятку для праверкі навуковай інфармацыі ў інтэрнэце.

**Навуковае забеспячэнне інавацыйнага развіцця.** Галоўным механізмам пераходу Беларусі на інавацыйны шлях развіцця з'яўляецца нацыянальная інавацыйная сістэма (НІС), якая ўяўляе сабой сукупнасць дзяржаўных органаў і арганізацый, што рэгулююць у межах сваёй кампетэнцыі адносіны ў сферы інавацыйнай дзейнасці, і юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць і (ці) забяспечваюць інавацыйную дзейнасць.

**Задачы нацыянальнай інавацыйнай сістэмы**

- Атрыманне новых ведаў
- Практычнае ўвасабленне інавацый у новай прадукцыі, паслугах, тэхналогіях
- Кіраванне інавацыйнымі працэсамі і іх рэгуляванне
- Рэсурснае забеспячэнне інавацый
- Стымуляванне інавацый праз падатковыя льготы і развіццё прадпрымальніцтва
- Атрыманне прыбытку ад навуковых распрацовак

**Інавацыйная палітыка** — гэта сукупнасць метадаў уздзеяння дзяржавы на вытворчасць з мэтай выпуску новых відаў прадукцыі і тэхналогій, а таксама пашырэння рынкаў збыту айчынных тавараў. Па выніках шматлікіх даследаванняў, эканамічная аддача ад інвестыцый у інавацыі значна перавышае акупальнасць у любых іншых сферах прымянення фінансавых рэсурсаў.

Перад беларускімі вучонымі і канструктарамі пастаўлена задача — забяспечваць атрыманне новых навуковых вынікаў (на ўзроўні адкрыццяў і вынаходстваў), праектна-канструктарскіх распрацовак (на ўзроўні патэнтаў, у тым ліку замежных), інавацыйнай прадукцыі (на ўзроўні, не ніжэйшым за сусветныя аналагі і стандарты).

Укараненне вынікаў навуковых даследаванняў у нашай краіне за апошнія гады забяспечыла значныя эканамічныя дасягненні ў галіне аўтамабіле- і трактарабудавання, мікраэлектронікі, стварэння новых матэрыялаў, гарадскога транспарту, медыцынскага абсталявання, лекавых прэпаратаў і інш. Прадукцыя многіх



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**беларускіх прадпрыемстваў шырока прадстаўлена на сусветным рынку.**




Вытворчае аб'яднанне «БелАЗ» займае трэцюю частку сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў. На аснове навуковых распрацовак паспяхова мадэрнізуецца вытворчая база, што дазваляе істотна павышаць канкурэнтаздольнасць прадукцыі, што выпускаецца.

Знайдзіце актуальную інфармацыю пра інавацыйныя беларускія тавары і паслугі, якія атрымалі прызнанне ў свеце. Падрыхтуйце інфармацыйны плакат. ■

**У сучасных канкурэнтных эканамічных умовах прамысловыя прадпрыемствы Беларусі пераходзяць ад укаранення новых навуковых распрацовак да заказу на канкрэтныя распрацоўкі, што забяспечваюць павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Штогод беларускія арганізацыі ўдзельнічаюць у рэалізацыі больш як 500 міжнародных навукова-тэхнічных праектаў з фінансаваннем з нацыянальных і замежных крыніц.**

**Як грамадства можа інвеставаць у сваю будучыню?**



Стартап, або стартап-кампанія (ад англ. *start-up* — запускаць), — гэта тып бізнесу, накіраваны на атрыманне прыбытку шляхам рэалізацыі прынцыпова новай ідэі. Аб гэтых паспяховых праектах ведаюць амаль усе беларусы, у якіх ёсць смартфон: Maps.me, Viber, Flo, MSQRD, Weather Live. Яны выраслі са стартапаў.

Даведайцеся пра тое, як працуюць інкубатары і біржы стартапаў у нашай краіне. Ёсць ідэя? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Высокія тэхналогіі і энергазберажэнне.** *Высокімі тэхналогіямі* называюць працэсы, заснаваныя на выкарыстанні перадавых дасягненняў навукі. Асаблівую ролю тут адыгрывае інфарматызацыя, важным этапам якой стала прыняцце Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб развіцці лічбавай эканомікі» (2017 г.), накіраванага на далейшае развіццё інавацыйнай сферы і пабудову ў Беларусі сучаснай лічбавай эканомікі.

**«ТІБО» — найважнейшая для краіны падзея ў сферы тэхналогій і інавацый, якая ўжо паспела стаць традыцыйнай.**

Міжнародны форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБО» у Мінску — унікальная пляцоўка для абмену перадавым міжнародным вопытам, абмеркавання дзяржаўнай палітыкі ў інфармацыйнай сферы, генерацыі інавацыйных ведаў і абмеркавання механізмаў укаранення самых новых тэхналагічных трэндаў у розныя сферы эканомікі, бізнесу і жыцця сучаснага грамадства.

У форуме традыцыйна бяруць удзел найбуйнейшыя айчынныя і замежныя вытворцы тэлекамунікацыйнага абсталявання, кампаніі-аператары мабільнай і фіксаванай сувязі, распрацоўшчыкі і пастаўшчыкі высокатэхналагічных прадуктаў, сістэм бяспекі, інтэлектуальных рашэнняў і сэрвісаў для бізнесу.

Асноўнымі мэтамі форуму «ТІБО» з’яўляюцца:

- абмеркаванне ў шырокім коле спецыялістаў праблем і перспектыў эфектыўнага прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій ва ўсіх сферах жыцця беларускага грамадства;
- дэманстрацыя ў дзеянні самых сучасных тэхналагічных рашэнняў;
- садзейнічанне развіццю ўласнай інфармацыйнай індустрыі і рынку тэлекамунікацыйных і інфармацыйных паслуг;
- падвядзенне вынікаў штогадовага конкурсу «Інтэрнэт-прэмія “ТІБО”», праведзенага ў рамках форуму.

Даведайцеся, хто атрымаў прэмію «ТІБО» у бягучым годзе. Якія тэхналогіі, рашэнні і прадукты знаходзяцца ў фокусе ўвагі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Беларусь дасягнула значных вынікаў у стварэнні суперкамп'ютараў — сістэм звышвысокай вытворчасці, незаменных для выканання сучасных навуковых даследаванняў, асваення новых складаных тэхналогій. У межах праграм Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі вучонымі дзвюх краін створаны мадэльны шэраг суперкамп'ютараў, якія знаходзяць прымяненне не толькі ў навуцы, але і ў прамысловасці, медыцыне, гідраметэаралогіі і г. д.

Таксама ў межах навуковых праграм беларускімі арганізацыямі сумесна з расійскімі партнёрамі распрацаваны і ўкаранёны сродкі і тэхналогіі атрымання, апрацоўкі і адлюстравання касмічнай інфармацыі, створаны элементы адзінай сістэмы забеспячэння касмічнай інфармацыяй спажыўцоў Расіі і Беларусі.



22 ліпеня 2012 г. з касмадрома Байканур на каляземную арбіту быў выведзены Беларускі касмічны апарат (БКА, БелКА). Асноўнымі заказчыкамі здымкаў з беларускага спадарожніка з'яўляюцца розныя арганізацыі (міністэрствы: па надзвычайных сітуацыях, абароны, лясной гаспадаркі, сельскай гаспадаркі і харчавання, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя; Дзяржаўны камітэт па маёмасці і г. д.).

Знайдзіце інфармацыю пра тое, якія актуальныя для беларускай эканомікі задачы паспяхова рашаюцца з дапамогай БКА. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адным з фактараў эканамічнай бяспекі дзяржавы з'яўляецца выкарыстанне самых сучасных навукова-тэхнічных рашэнняў, у прыватнасці, замяшчэння імпартуемых паліўна-энергетычных рэсурсаў мясцовымі і аднаўляльнымі крыніцамі энергіі, напрыклад будаўніцтва атамнай электрастанцыі.




Колькі працэнтаў электраэнергіі выкарыстоўваецца марна, калі зараднае ўстройства для мабільнага тэлефона пакідаць уключаным у сетку?

Назавіце самы эканамічны клас электрабытавых прыбораў.

Энергазберажэнне павінна стаць клопатам кожнага чалавека. Не павінна быць марна ўключаных лямпачак, выкарыстоўваць трэба толькі сучаснае неэнергаёмістае асвятляльнае абсталяванне, дамы павінны будавацца на аснове сучасных тэхналогій энергазберажэння і г. д.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што такое інавацыі? Як вы разумееце, што такое інавацыйнае развіццё?
2. Назавіце і ахарактарызуйце задачы і элементы Нацыянальнай інавацыйнай сістэмы.
3. Прааналізуйце наступныя загалоўкі ў СМІ (2016 г.).
   - Беларус стварыў для бацькі пратэз рукі і выклаў у Сеціва
   - Каму руку? Мінскі праграміст стварае бясплатныя пратэзы для тых, каму яны патрэбны
   - Як мінскі праграміст Intetics распрацаваў біянічны пратэз
   - Беларус уласнаручна распрацаваў пратэз для свайго бацькі і выклаў эскізы ў Сеціва
   - Мінчанін распрацаваў звыштанны біянічны пратэз і выклаў чарцяжы ў свабодны доступ у інтэрнэце
   - Мінскі праграміст стварыў бюджэтны біянічны пратэз рукі для свайго бацькі

   Што агульнае маюць і чым адрозніваюцца загалоўкі публікацый? Ці можна вызначыць па загалоўках, ці з'яўляецца дадзеная навінка інавацыяй? ■

Выканайце міні-праект «Хопіць гуляць, давай ствараць!» Прапануйце навінку для паляпшэння дзейнасці вашай навучальнай установы. Гэта можа быць камп'ютарная праграма, парадак стварэння раскладу заняткаў, арганізацыя практычных заняткаў, стварэнне базы даных і г. д. Абгрунтуйце мэтазгоднасць навінкі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 22. Развіццё рэгіёнаў

## Дабрабыт рэгіёнаў — росквіт краіны?

### Брэсцкая вобласць

1348,1 тыс. чал.
32,8 тыс. км²
16 раёнаў



### Віцебская вобласць

1135,7 тыс. чал.
40,1 тыс. км²
21 раён



### Гомельская вобласць

1388,5 тыс. чал.
40,4 тыс. км²
21 раён



### Мінск

2018,3 тыс. чал.
353 км²
9 раёнаў



ВІТЭКС®
ATLANT
1М малочный




### Гродзенская вобласць

1026,8 тыс. чал.
25,1 тыс. км²
17 раёнаў



### Мінская вобласць

1471,0 тыс. чал.
39,8 тыс. км²
22 раёны



### Магілёўская вобласць

1024,8 тыс. чал.
29,1 тыс. км²
21 раён





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Рэгіёны Рэспублікі Беларусь.** *Рэгіён* — гэта частка краіны, якая адрозніваецца ад іншых сукупнасцю натуральных і (ці) гістарычна складзеных, параўнальна ўстойлівых эканоміка-геаграфічных і іншых асаблівасцей.

У Рэспубліцы Беларусь вылучаюцца адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі і тэрытарыяльныя адзінкі.

Прыгадайце, што такое мясцовае кіраванне і самакіраванне. Як называюцца органы мясцовага самакіравання? Да якіх органаў належаць мясцовы выканаўчы камітэт і мясцовая адміністрацыя — да органаў кіравання ці самакіравання? ■

| Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка | Тэрытарыяльная адзінка |
|---|---|
| Частка тэрыторыі, у межах якой ствараюцца і дзейнічаюць мясцовы Савет дэпутатаў і выканаўчы і распарадчы орган<br>• Вобласць<br>• Раён<br>• Сельсавет<br>• Горад<br>• Пасёлкі гарадскога тыпу | Населены пункт, у якім не ствараюцца мясцовы Савет дэпутатаў і выканаўчы і распарадчы орган<br>• Раён у горадзе<br>• Тэрыторыя спецыяльнага рэжыму выкарыстання (запаведнік, нацыянальны парк, заказнік, тэрыторыя помніка прыроды, біясферны рэзерват, землі гісторыка-культурнага прызначэння, землі абароны, свабодная эканамічная зона) |

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь падзелена на адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі першага, другога (базавага) і трэцяга (першаснага) узроўняў.

Першы ўзровень складаюць шэсць абласцей (Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская) і горад Мінск, які мае асаблівы статус сталіцы Рэспублікі Беларусь.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел знаходзіць адлюстраванне ў тым ліку на рэгістрацыйных знаках транспартных сродкаў фізічных і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь. На іх размяшчаецца: выява Дзяржаўнага сцяга, знак адрознення BY, спалучэнне літар (агульных для беларускага і лацінскага алфавітаў) і арабскіх лічбаў. Лічба, што стаіць асобна, азначае код рэгіёна.

Рэгістрацыйныя знакі якіх рэгіёнаў прадстаўлены на выяве? Якая лічба вылучае транспартныя сродкі вашага рэгіёна? ■




**Базавы ўзровень адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу складаюць раёны (у Беларусі іх 118) і гарады абласнога падпарадкавання (10 гарадоў); першасны ўзровень — гарады раённага падпарадкавання, пасёлкі гарадскога тыпу, сельсаветы.**






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на шэсць абласцей і сталіцу існуе ў нязменным выглядзе з 1961 г. У Рэспубліцы Беларусь у якасці рэгіёнаў выступаюць вобласці і г. Мінск, якія істотна адрозніваюцца як па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця, так і па структуры гаспадаркі.**

Перыядычна ў навуковых і кіраўнічых колах узнімаецца пытанне аб рэфармаванні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час абмяркоўваюцца два варыянты. Адзін з іх прадугледжвае пераход ад 6 абласцей да 18 акруг, а другі — далучэнне раёнаў, у якіх пражывае менш за 20 тыс. чалавек, да прылеглых, больш буйных.



Знайдзіце актуальную дадатковую інфармацыю аб прапановах па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформе і сфармулюйце аргументы «за» і «супраць» яе ажыццяўлення.

**Рэгіянальная палітыка.** **Асноўнымі задачамі развіцця рэгіёнаў з'яўляюцца забеспячэнне ўстойлівага развіцця іх тэрыторый, паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва на аснове забеспячэння эфектыўнай працы гаспадарчага комплексу, інавацыйнага развіцця і павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі.**

**Галоўнай мэтай рэгіянальнай палітыкі з'яўляецца раўнамернае развіццё тэрыторый для жыццезабеспячэння кожнага канкрэтнага чалавека незалежна ад месца яго пражывання. Рэгіянальная палітыка мае на ўвазе выраўноўванне ўзроўню жыцця насельніцтва і згладжванне найбольш вострых сацыяльных і эканамічных дыспрапорцый паміж асобнымі рэгіёнамі краіны. Яна ахоплівае ўсе найважнейшыя галіны вытворчасці, занятасць насельніцтва, сферу абслугоўвання, сацыяльнае забеспячэнне і інш.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Рэгіянальная палітыка** — дзейнасць органаў дзяржаўнай улады па забеспячэнні аптымальнага развіцця рэгіёнаў.

Вялікая адказнасць за развіццё рэгіёна нароўні з выканаўчымі органамі ўлады ляжыць і на дэпутатах усіх узроўняў, бо яны зацвярджаюць планы сацыяльна-эканамічнага развіцця сваіх тэрыторый, фарміруюць мясцовы бюджэт.




Вывучыце змест рубрык афіцыйнага сайта раённага выканаўчага камітэта вашага раёна. Якія рубрыкі дапамагаюць зразумець рэальны стан спраў у раёне? Якіх мерапрыемстваў не хапае? Зрабіце прапановы па напаўненні сайта. ■

Знайдзіце інфармацыю аб рэгіянальным развіцці ў асноўных палажэннях Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гг. Якія задачы развіцця рэгіёнаў з'яўляюцца прыярытэтнымі для вашага населенага пункта? ■

**Перспектывы развіцця рэгіёнаў.** Паспяховае развіццё рэгіёнаў прадугледжвае стварэнне спрыяльных умоў для жыцця ў малых і сярэдніх гарадскіх пасёлках і сельскіх населеных пунктах, стабілізацыю сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту.

Плануецца захаваць існуючыя прадпрыемствы і стварыць умовы для размяшчэння новых вытворчасцей, арыентаваных, перш за ўсё, на мясцовыя рэсурсы, традыцыі мясцовых жыхароў і патрэбы рэгіёна; стымуляваць прадпрымальніцкую дзейнасць грамадзян, адраджаць традыцыйныя рамёствы і промыслы; шырока прыцягваць інвестыцыі, у тым ліку замежныя.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Актуальнай з'яўляецца задача па развіцці інфраструктуры гарадоў (энергетыкі, будаўніцтва, транспарту, сувязі, гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання) і сацыяльнай сферы (адукацыі, аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнага забеспячэння, турызму).

## Як палепшыць умовы жыцця насельніцтва ў рэгіёне?

### Развіццё адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і населеных пунктаў

- Развіццё гарадоў-спадарожнікаў Мінска і прыгарадных зон абласных цэнтраў
- Удасканаленне сацыяльнай інфраструктуры (бытавое абслугоўванне, грамадскае харчаванне і інш.)
- Фарміраванне турысцка-рэкрэацыйных тэрыторый
- Стварэнне безбар'ернага асяроддзя для ўсіх катэгорый насельніцтва і інш.

### Развіццё транспартнай і інжынернай інфраструктуры

- Прыярытэтнае развіццё чыгуначнага транспарту, гарадскога электрычнага транспарту, метрапалітэна
- Будаўніцтва аўтамабільных стаянак і парковак у жылых раёнах гарадоў
- Удасканаленне сістэмы веладарожак і інш.

### Захаванне і рацыянальнае выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны

- Павышэнне функцыянальнай прывабнасці аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны з улікам захавання і аднаўлення іх адметнасцей
- Стварэнне сучасных ландшафтаў шляхам спалучэння гісторыка-культурнай спадчыны, традыцыйнай і сучаснай культур і інш.

### Гарантаванне экалагічнай бяспекі населеных пунктаў

- Развіццё сістэмы асобнага збору смецця
- Будаўніцтва рэгіянальных смеццеперапрацоўчых комплексаў
- Укараненне інтэлектуальнай сістэмы кіравання жыццезабеспячэннем горада на аснове інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і інш.

Ацаніце ўмовы жыцця ў вашым населеным пункце па кожнай пазіцыі (дастаткова, недастаткова). Стварыце візітную картку свайго населенага пункта па дадзеных пазіцыях. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Адным з перспектыўных напрамкаў эканамічнага росту і развіцця рэгіёнаў з'яўляецца *аграэкатурызм*. Пад аграэкатурызмам разумеецца экалагічны від турызму, накіраваны на выкарыстанне прыродных, культурна-гістарычных і іншых рэсурсаў сельскай мясцовасці з мэтай стварэння комплекснага турыстычнага прадукту.**

У 2016 і 2018 гг. Беларусь была прызнана лепшай краінай для агратурызму ў конкурсе часопіса National Geographic Traveler (Расія). У краіне налічваецца больш за дзве тысячы аграсядзіб.



Якія аграсядзібы знаходзяцца ў вашай мясцовасці? Чаму ў падручніку не падпісана, якую канкрэтна сядзібу прадстаўляе дадзеная фатаграфія? ■

**Аграэкатурызм у сельскай мясцовасці падтрымлівае моладзь, якая актыўна дапамагае станаўленню і развіццю аграэкасядзіб. Сёння маладыя людзі хочуць развіваць сваю сямейную справу, бачачы ў ёй прыклад вядзення паспяховага бізнесу.**

1. Што значыць паняцце «рэгіянальная палітыка дзяржавы»? Якія яе складнікі?
2. На якія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі падзяляецца Рэспубліка Беларусь? Якую ролю выконвае адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел краіны?
3. Вызначце катэгорыі населеных пунктаў, у якіх пражываюць ваша сям'я і сваякі, вучацца і працуюць вашы блізкія. Выкарыстоўвайце даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь. ■

Выканайце міні-праект: складзіце візітную картку вашага рэгіёна. Адлюструйце асаблівасці вашага рэгіёна, яго гісторыю, выкарыстоўваючы інфармацыю з сайта Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 23. Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі

## Інвестыцыі ў здароўе і культуру — лепшы ўклад у будучыню!

### Здароўе




| Бальніцы | Паліклінікі і амбулаторыі | Станцыі хуткай медыцынскай дапамогі | Аптэкі |
|---|---|---|---|
| 609 | 2288 | 140 | 3621 |

### Спорт і турызм



| Фізкультурна-спартыўныя збудаванні | Міжнародныя мерапрыемствы | Заняткі фізкультурай і спортам | Турыстычныя арганізацыі | Аграэка-турызм |
|---|---|---|---|---|
| 23 000 | каля 80 | кожны 4-ы жыхар | 1348 | 2936 |

### Культура



| Музеі | Тэатры | Фестывалі | Дамы рамёстваў |
|---|---|---|---|
| 150 | 28 | больш за 60 | 100 |

Сусветная спадчына ЮНЕСКА:
- Нацыянальны парк «Белавежская пушча»
- Замкавы комплекс «Мір»
- Комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы
- Пункты геадэзічнай Дугі Струвэ



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Палітыка дзяржавы ў галіне культуры.** У сучасным свеце права на доступ да дасягненняў культуры, культурныя правы разглядаюцца як найважнейшыя правы чалавека, не менш важныя, чым палітычныя ці эканамічныя правы. Яны гарантаваны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым абавязкам кожнага чалавека з'яўляюцца беражлівыя адносіны да гісторыка-культурнай спадчыны.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 51.** Кожны мае права на ўдзел у культурным жыцці. Гэта права забяспечваецца агульнадаступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі культурна-асветных устаноў.

Свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання гарантуецца.

Інтэлектуальная ўласнасць ахоўваецца законам.

Дзяржава садзейнічае развіццю культуры, навуковых і тэхнічных даследаванняў на карысць агульных інтарэсаў.

**Артыкул 54.** Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці.

*Нацыянальная культура* ўяўляе сабой сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей грамадства і ўключае мову, гісторыка-культурную спадчыну, традыцыі, фальклор, народныя промыслы і рамёствы, прафесійнае і самадзейнае мастацтва, мастацкую адукацыю, установы і кадры культуры, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя культурныя сувязі. Нацыянальная культура таксама з'яўляецца гарантыяй захавання і прагрэсу, духоўнага здароўя і дабрабыту народа, яго згуртавання вакол стваральных каштоўнасцей. У нашай краіне права на развіццё сваёй культуры і мовы, на стварэнне нацыянальнай школы, прадпрыемстваў і ўстаноў культуры (тэатраў, музеяў, выдавецтваў і г. д.) гарантуецца таксама і грамадзянам іншых



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

нацыянальнасцей і этнічных груп, што пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўным органам дзяржаўнага кіравання культурай у нашай краіне з'яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Яно праводзіць дзяржаўную палітыку ў сферы культуры і каардынуе яе развіццё.

У Беларусі ў сферы культуры працуюць каля 60 тыс. чалавек, дзейнічаюць 6 тыс. дзяржаўных устаноў культуры і мастацтва. У сістэме Міністэрства культуры функцыянуюць 150 музеяў рознай накіраванасці. Найбуйнейшымі ў краіне зборамі твораў жывапісу валодаюць Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Віцебскі мастацкі музей, Магілёўскі абласны мастацкі музей, Полацкая мастацкая галерэя.










«Ноч музеяў» — міжнародная акцыя, прымеркаваная да Міжнароднага дня музеяў (адзначаецца 18 мая). У гэтую ноч многія музеі адчынены для наведвальнікаў пасля заходу сонца і амаль да раніцы. Асноўная мэта акцыі — паказаць магчымасці сучасных музеяў, прыцягнуць у музеі моладзь. Упершыню «Ноч музеяў» была праведзена ў Берліне ў 1997 г. Беларусь далучылася да гэтай міжнароднай акцыі ў 2004 г. З той пары колькасць музеяў, што ўдзельнічаюць у акцыі, пастаянна павялічваецца.

Якія музеі Беларусі далучыліся да «Ночы музеяў»? Ці наведвалі вы калі-небудзь гэта мерапрыемства?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**У Беларусі дзейнічаюць 28 прафесійных тэатраў, у тым ліку 8 тэатраў рэспубліканскага падпарадкавання. Па наведванні тэатраў на 1000 чалавек наша краіна займае на постсавецкай прасторы другое месца, саступаючы толькі Расіі.**




Якая роля фестываляў у актывізацыі цікавасці да тэатраў? ■

**Прымаюцца меры па развіцці беларускай кінематаграфіі. Асаблівую нішу айчынныя кінематаграфісты занялі ў дакументальным кіно і анімацыйных фільмах.**

Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» — найбуйнейшы кінафорум нашай краіны. Яго адметнасць у тым, што ў праграме значацца толькі стужкі-прызёры міжнародных кінафестываляў з краін СНД, Балтыі, Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Акрамя таго, у Магілёве штогод праходзіць міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка», у Мінску — фестываль лічбавага мастацтва Terra Nova (праграма якога ўключае мастацкую выставу, а таксама відэапрагляды і канцэрты электроннай музыкі) і інш.

Майстэрства айчынных кінематаграфістаў у розны час высока ацэньвалася на міжнародных фестывалях. Складзіце топ-5 фільмаў, створаных у Беларусі, якія былі ўзнагароджаны на розных кінафестывалях. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У нашай краіне дзейнічаюць больш за 70 аркестраў і ансамбляў, ладзяцца разнастайныя фестывалі і конкурсы. Усяго ў Беларусі на працягу года праводзіцца больш за 60 міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных фестываляў.


*Фестываль «Музычныя вечары ў Мірскім замку»*


*Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»*


*Фестываль Viva Braslav Open Air*


*Фестываль «Александрыя збірае сяброў»*

Вызначце дэвізы фестываляў, на якіх былі зроблены дадзеныя фатаграфіі. Як вы іх разумееце? Які з фестываляў выклікае ў вас большую цікавасць? Складзіце уласны топ-5 беларускіх фестываляў.

Актуальнай задачай з’яўляецца развіццё мастацкай аматарскай і прафесійнай творчасці, адраджэнне народных промыслаў і рамёстваў. У Беларусі створана каля ста Дамоў рамёстваў.

Значныя намаганні накіраваны на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, ажыццяўляюцца рэстаўрацыя і ўвядзенне ў культурнае абыходжанне помнікаў гісторыі і культуры, гістарычных комплексаў, запаведных тэрыторый, мемарыяльных паркаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Вялікая ўвага надаецца пытанням развіцця бібліятэчнай справы. Асаблівай з'явай культурнага і сацыяльна-палітычнага жыцця краіны стала завяршэнне будаўніцтва ў 2006 г. Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Яна аснашчана самым сучасным абсталяваннем для захоўвання і перадачы інфармацыі. Сёння гэта інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр краіны. Будынак бібліятэкі з'яўляецца своеасаблівым архітэктурным сімвалам нашай сталіцы.**

Сусветная спадчына ЮНЕСКА — прыродныя або створаныя чалавекам аб'екты, у дачыненні да якіх прыярытэтнымі задачамі з'яўляюцца іх захаванне і папулярызацыя дзякуючы асаблівай культурнай, гістарычнай ці экалагічнай значнасці.

У Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны чатыры аб'екты, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны:

- нацыянальны парк «Белавежская пушча»;
- замкавы комплекс «Мір»;
- архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы;
- пункты геадэзічнай Дугі Струвэ.

У Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ад Беларусі ўключаны чатыры элементы:

- Будслаўскі фэст — традыцыйнае шэсце ў гонар Будслаўскага абраза Маці Божай у аграгарадку Будслаў (Мядзельскі р-н Мінскай вобл.);
- Калядныя цары — традыцыйнае народнае свята ў вёсцы Семежава (Капыльскі р-н Мінскай вобл.);
- культура бортніцтва Беларусі і Польшчы — старажытны промысел, заснаваны на развядзенні і ўтрыманні лясных пчол у штучных дуплах, якія вырабляюцца і размяшчаюцца высока на дрэвах у лесе;
- Юр'еўскі карагод — традыцыйнае народнае свята ў вёсцы Пагост (Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл.). ■

Якія аб'екты культурнай спадчыны адлюстраваны на беларускіх банкнотах рознага наміналу? ■





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Палітыка ў галіне аховы здароўя.** Адной з асноўных задач дзяржавы з'яўляецца захаванне здароўя сваіх грамадзян.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 45.** Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на ахову здароўя, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя.

Дзяржава стварае ўмовы даступнага для ўсіх грамадзян медыцынскага абслугоўвання.

Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на ахову здароўя забяспечваецца таксама развіццём фізічнай культуры і спорту, мерамі па аздараўленні навакольнага асяроддзя, магчымасцю карыстання аздараўленчымі ўстановамі, удасканаленнем аховы працы.

*Ахова здароўя* — гэта сістэма дзяржаўных, грамадскіх і медыцынскіх мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне і ўмацаванне здароўя людзей, прафілактыку і лячэнне захворванняў, а таксама сістэма спецыяльных установаў і арганізацый, якія іх ажыццяўляюць.

Асновай сістэмы аховы здароўя Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца дзяржаўныя медыцынскія ўстановы, якія функцыянуюць на бясплатнай аснове. Аднак у краіне таксама дзейнічае сістэма недзяржаўных устаноў аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу на платнай аснове. Пэўныя платныя паслугі аказваюць таксама і дзяржаўныя медыцынскія ўстановы.

Палітыка ў галіне аховы здароўя насельніцтва мае на мэце стварэнне ўмоў, што дазваляюць кожнаму чалавеку рэалізоўваць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сваё права на ахову здароўя на ўсіх этапах жыцця, для чаго прынцыпова важна захаваць бясплатнасць, даступнасць медыцынскай дапамогі і павышэнне яе якасці.

**Пытаннем аховы здароўя насельніцтва займаюцца не толькі медыцынскія ўстановы і арганізацыі?**

Здароўе чалавека — гэта стан поўнага фізічнага, духоўнага і псіхічнага дабрабыту, а не толькі адсутнасць хвароб і фізічных недахопаў (азначэнне Сусветнай арганізацыі аховы здароўя). Пытанне аховы здароўя насельніцтва з'яўляецца комплексным, і яго рашэннем займаюцца не толькі медыцынскія ўстановы і арганізацыі.

Якім чынам забяспечваецца Канстытуцыйнае права грамадзян на ахову здароўя ў вашым рэгіёне?

Падрыхтуйце медыятэкст для электроннага партала (блога) пра развіццё аховы здароўя ў вашым рэгіёне.

**Фактары, якія ўплываюць на здароўе**




У краіне рэалізаваны і рэалізуюцца многія дзяржаўныя праграмы, у тым ліку такія як «Здароўе народа», праграма развіцця першаснай медыка-санітарнай дапамогі, праграма развіцця спецыялізаванай медыцынскай дапамогі, праграмы «Цукровы дыябет», «Туберкулёз». Сёння сярод першачарговых мер — прадухіленне распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі, мінімізацыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

наступстваў у тых, хто хварэў, іх рэабілітацыя, прафілактыка далейшых заражэнняў.

У Беларусі паслядоўна рашаецца задача вываду медыцынскага абслугоўвання на еўрапейскі ўзровень развіцця. Для гэтага ў краіне актыўна развіваецца высокатэхналагічная медыцынская дапамога: клетачныя і біямедыцынскія тэхналогіі, трансплантаалогія, анкалогія, кардыяхірургія. Беларускімі ўрачамі праводзяцца аперацыі па перасадцы печані і сэрца, унікальныя аперацыі на сасудах.

Падрыхтуйце паведамленне пра ўнікальныя аперацыі, якія праводзяцца беларускімі ўрачамі. ■

Шырокую вядомасць сёння набыло выказванне пра тое, што хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць. Таму кожны чалавек павінен берагчы і ўмацоўваць сваё здароўе. Адзін з асноўных шляхоў — далучэнне да фізічнай культуры, актыўнага, здаровага ладу жыцця.

**Фізічная культура і спорт.** Удасканаленне аховы здароўя ў нашай краіне непарыўна звязана з палітыкай у галіне фізічнай культуры, спорту і турызму.

**Дзяржаўная палітыка ў галіне фізічнай культуры, спорту і турызму**

| Заняткі фізічнымі практыкаваннямі і спортам у сферы масавай фізічнай культуры | Інтэнсіўная падрыхтоўка ў сферы спорту найвышэйшых дасягненняў | Фізічнае выхаванне дзяцей і падлеткаў, вучнёўскай моладзі |
|---|---|---|



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адзначаныя напрамкі цесна ўзаемазвязаны і ў сукупнасці ўтвараюць складзеную нацыянальную сістэму фізічнага выхавання. Рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне фізічнай культуры і спорту ўскладзена ў Рэспубліцы Беларусь на Міністэрства спорту і турызму.

Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне фізічнай культуры і спорту адлюстраваны ў законах Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце», «Аб турызме», у Дзяржаўнай праграме развіцця фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь, у праграме па фарміраванні здаровага ладу жыцця насельніцтва і іншых дзяржаўных праграмах.

Развіццё паслуг фізічнай культуры і спорту нацэлена на далучэнне насельніцтва да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам, захаванне ўстойлівай пазіцыі Беларусі ў ліку наймацнейшых спартыўных дзяржаў.

Расце папулярнасць заняткаў спортам, узведзены сучасныя спартыўныя аб’екты, якія з’яўляюцца даступнымі для грамадзян, дазваляюць ім бавіць свой вольны час цікава, з карысцю для здароўя. У краіне функцыянуюць Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімніх відах спорту «Раўбічы», Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі «Стайкі», Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы, вяслярныя каналы ў Брэсце і Заслаўі, гарналыжны комплекс-курорт «Лагойск», Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы», дамашняя пляцоўка беларускага футбольнага клуба БАТЭ і нацыянальнай зборнай па футболе — «Барысаў-Арэна», Нацыянальны алімпійскі стадыён «Дынама», які пасля рэканструкцыі атрымаў вышэйшую катэгорыю па класіфікацыі УЕФА.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



«Барысаў-Арэна» ўвайшла ў дзясятку лепшых стадыёнаў свету, уведзеных у строй у 2014 г.

У краіне ладзіцца шмат спартыўных мерапрыемстваў: спаборніцтвы па хакеі «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па футболе — «Скураны мяч», масавыя рэспубліканскія спаборніцтвы «Спорт для ўсіх», зімняе спартыўнае свята «Мінская лыжня», фестывалі бегу і інш.

Штогод у Рэспубліцы Беларусь ладзіцца каля 80 міжнародных спартыўных мерапрыемстваў. Самымі значнымі з іх сталі чэмпіянат свету па хакеі 2014 г., юніёрскі чэмпіянат свету па біятлоне 2015 г., этапы Кубка свету па фрыстайле і мастацкай гімнастыцы, чэмпіянат свету па канькабежным спорце 2018 г., чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні 2019 г., II Еўрапейскія гульні 2019 г.

Правядзенне такога маштабнага турніру, як II Еўрапейскія гульні, стала першай падобнай спробай у гісторыі суверэннай Беларусі. Па працягласці турнір ахапіў практычна два тыдні (спецыяльна для ўдзельнікаў і гасцей спартыўнага форуму было ўведзена бязвізавае знаходжанне). Замежныя турысты змаглі не толькі падтрымаць спартсменаў сваіх стран, але і наведаць знакавыя месцы Беларусі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Беларусь можна назваць спартыўнай краінай?**

Якія віды спорту найбольш папулярныя ў Беларусі? У якіх відах спорту ў нашай краіны найлепшыя дасягненні на міжнародных спаборніцтвах? ■

Дзейнасць па развіцці фізічнай культуры і спорту, ахове здароўя, павышэнні культуры грамадства спрыяе фарміраванню здаровага ладу жыцця кожнага чалавека. *Здаровы лад жыцця* — гэта лад жыцця, у аснове якога ляжаць свядомыя адносіны чалавека да свайго здароўя як да каштоўнасці. Ён прадугледжвае высокую культуру харчавання, адмаўленне ад курэння і іншых шкодных звычак, рэгулярныя заняткі спортам, імкненне напоўніць свой вольны час цікавым зместам.

У нашай краіне вялікая ўвага надаецца развіццю *турызму*.

Адным з пазнавальных сімвалаў Беларусі для турыстаў з'яўляецца кветка васілька. Якія яшчэ сімвалы нашай краіны вы можаце назваць (архітэктурныя аб'екты, звяры і птушкі, расліны, арнаменты, стравы нацыянальнай кухні)? Стварыце эскізы сувенірных магнітаў, прысвечаных Беларусі ў цэлым і вашаму рэгіёну (або канкрэтнаму населенаму пункту). ■






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рэспубліка Беларусь — краіна, адметная непаўторнымі па прыгажосці рэкамі і азёрамі, дзіўнымі ландшафтамі, многімі цікавымі помнікамі гісторыі. Шырока развіваецца агра- і экатурызм, які забяспечвае добры адпачынак жыхарам краіны і яе гасцям.




На афіцыйным сайце Рэспублікі Беларусь (https://www.belarus.by) названы 5 асноўных славутых месцаў Беларусі і 5 галоўных прычын наведаць нашу краіну. Дадайце яшчэ 5 пазіцый у кожны спіс і стварыце топ-10 славутых месцаў і прычын наведаць Беларусь. ■

1. Якія дасягненні ў развіцці беларускай культуры, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту вы лічыце найбольш значнымі?
2. Прывядзіце прыклады, якія даказваюць, што нацыянальная культура з'яўляецца падмуркам дзяржаўнага суверэнітэту.
3. Якія меры, на ваш погляд, будуць спрыяць зацвярджэнню здаровага ладу жыцця сярод моладзі? ■

Выканайце міні-праект «Беларусь спартыўная» з фатаграфій значных спартыўных аб'ектаў нашай краіны. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы»

1. Дайце азначэнні наступным паняццям: *гендарная палітыка, дэмаграфічная бяспека, дэмаграфічная палітыка, інавацыя, канфесійная палітыка, маладзёжная палітыка, нацыянальная палітыка, рэгіён, рэгіянальная палітыка*.
2. Параўнайце задачы і вызначце ўзаемасувязі:
   - інавацыйнай і маладзёжнай палітыкі;
   - дэмаграфічнай і гендарнай палітыкі;
   - палітыкі ў галіне аховы здароўя і спорту.
3. У міжнародным дакуменце «Кіраўніцтва Осла — Рэкамендацыі па зборы і аналізе даных па інавацыях», прысвечаным інавацыям, адзначаецца: «Інавацыйныя працэсы моцна адрозніваюцца ад галіны да галіны зместам распрацовак, хуткасцю тэхналагічных змен, структурай узаемасувязей і доступам да ведаў, а таксама арганізацыйнымі структурамі і інстытуцыянальнымі фактарамі. Для адных галін характэрны хуткія змены і радыкальныя інавацыі, для другіх — меншыя, паэтапныя змены». У якіх галінах эканомікі Рэспублікі Беларусь у найбольшай ступені рэалізуюцца інавацыі?
4. Назавіце асноўныя фактары, якія вызначаюць дынаміку колькасці насельніцтва Беларусі. Якія асаблівасці сучаснай полаўзроставай структуры насельніцтва нашай краіны? Чаму веды пра полаўзроставую структуру насельніцтва маюць значэнне для развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы?
5. Канкрэтызуйце прыкладамі мерапрыемствы дзяржаўнай палітыкі, якія праводзяцца для забеспячэння дзеяння пэўных артыкулаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 14.** Дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў.

**Артыкул 15.** Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

**Артыкул 16.** Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам.

Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Забараняецца дзейнасць рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды ці звязана з парушэннем правоў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або прычыняе шкоду іх здароўю і маральнасці.

**Артыкул 31.** Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам.

**Артыкул 32.** Жанчынам забяспечваецца прадастаўленне роўных з мужчынамі магчымасцей у атрыманні адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы, у працы і вылучэнні па службе (рабоце), у грамадска-палітычнай, культурнай і іншых сферах дзейнасці, а таксама стварэнне ўмоў для аховы іх працы і здароўя.

Моладзі гарантуецца права на яе духоўнае, маральнае і фізічнае развіццё.

Дзяржава стварае неабходныя ўмовы для свабоднага і эфектыўнага ўдзелу моладзі ў палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным развіцці.

**Артыкул 50.** Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, таксама як ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання нацыянальнай прыналежнасці.

Знявага нацыянальнай годнасці караецца згодна з законам.

Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Валанцёрства (ад лац. *voluntarius* — добраахвотны) — гэта дзейнасць, якая ажыццяўляецца добраахвотна без разліку на грашовае ўзнагароджанне і накіравана на карысць людзей і грамадства.

   Назавіце найбольш буйныя арганізацыі, якія займаюцца валанцёрствам у Рэспубліцы Беларусь. Каму і ў чым гэтыя арганізацыі могуць дапамагчы? Прывядзіце прыклады валанцёрскіх праектаў рознай тэматыкі.
7. У адным з музеяў нашай краіны знаходзіцца найбуйнейшы ў краіне збор беларускага і замежнага мастацтва. У экспазіцыі, філіялах і фондасховішчах знаходзіцца больш за 30 тыс. твораў, якія фарміруюць 20 разнастайных калекцый і складаюць два галоўныя музейныя зборы: збор нацыянальнага мастацтва і збор помнікаў мастацтва краін і народаў свету. Афіцыйная гісторыя музея пачынаецца 24 студзеня 1939 г. Сёння ён з’яўляецца адным з найбагацейшых музеяў Усходняй Еўропы. Пра які музей ідзе размова? Стварыце карту музеяў вашага рэгіёна.
8. Стварыце воблака паняццяў «Унутраная палітыка беларускай дзяржавы».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Выніковае абагульненне

1. Канкрэтызуйце прыкладамі:
   - Мэты ўстойлівага развіцця па пяці асноўных напрамках (5P — людзі (people), росквіт (prosperity), мір (peace), партнёрства (partnership), планета (planet));
   - сувязь інавацыйнага развіцця з пабудовай лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства ў Беларусі;
   - узаемасувязь паміж удзелам Беларусі ў інтэграцыйных аб'яднаннях і нацыянальнымі інтарэсамі беларускай дзяржавы;
   - узаемаўплыў эканамічных, экалагічных, геапалітычных, сацыяльных і тэхналагічных выклікаў і пагроз у сучасным свеце.
2. Запоўніце табліцу «Палітыка беларускай дзяржавы і перспектывы ўстойлівага развіцця грамадства». З дапамогай інфармацыйных рэсурсаў вызначце актуальныя задачы дзяржаўнай палітыкі ў дасягненні пэўнай мэты нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця.

| Дзяржаўная палітыка | Дасягненне Мэт устойлівага развіцця |
|---|---|
| Дэмаграфічная | |
| Гендарная | |
| Маладзёжная | |
| Рэгіянальная | |
| Інавацыйная | |
| Нацыянальная | |
| Канфесійная | |
| Сацыяльная | |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Прааналізуйце вынікі сацыялагічнага апытання насельніцтва нашай краіны пра базавыя каштоўнасці (2018 г.). Якія тры базавыя каштоўнасці з'яўляюцца вельмі важнымі для большасці насельніцтва нашай краіны, якія тры — найменш важнымі? Чым, на вашу думку, можна растлумачыць дадзеныя вынікі?

**Табліца «Базавыя каштоўнасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь»**

| Зменная | Вельмі важна | Хутчэй важна | Хутчэй няважна | Зусім няважна | Цяжка сказаць канкрэтна |
|---|---|---|---|---|---|
| Праца | 68,3 | 19,8 | 6,6 | 3,7 | 1,6 |
| Сям'я | 90,8 | 8,1 | 0,3 | 0,3 | 0,5 |
| Сябры і знаёмыя | 51,2 | 37,8 | 8,1 | 2,1 | 0,8 |
| Вольны час | 41,8 | 38,6 | 15,5 | 2,0 | 2,1 |
| Здароўе | 85,5 | 13,0 | 0,6 | 0,4 | 0,5 |
| Палітыка | 11,6 | 28,9 | 23,7 | 12,7 | 3,5 |
| Рэлігія | 32,7 | 30,3 | 21,5 | 12,9 | 2,6 |

4. Ці згодныя вы з наступнымі меркаваннямі? Аргументуйце ўласны пункт погляду:
   - міжнародная міграцыя станоўча ўплывае на дэмаграфічную бяспеку беларускай дзяржавы;
   - глабалізацыя «размывае» нацыянальную ідэнтычнасць;
   - немагчыма адначасова падтрымліваць дзяржаўны суверэнітэт і эканамічную глабалізацыю.
5. Прааналізуйце пазіцыі, якія займае наша краіна ў разнастайных міжнародных рэйтынгах. На аснове дадзенай інфармацыі складзіце інфаграфіку «Беларусь у лічбах», пазначыўшы 5 пазіцый, па якіх наша краіна знаходзіцца сярод лідараў сусветнага супольніцтва, і 5 пазіцый, па якіх неабходна палепшыць становішча.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Заключэнне

Вучэбны прадмет «Грамадазнаўства», вывучэнне якога вы завяршылі, быў прысвечаны найбольш важным пытанням развіцця сучаснага беларускага грамадства і дзяржавы. На ўроках вы разважалі аб прагрэсіўных і рэгрэсіўных тэндэнцыях у жыцці грамадства, аб неабходнасці захавання каштоўнасцей і гуманістычных арыенціраў, аб працэсах глабалізацыі і перспектывах Беларусі ў свеце, які глабалізуецца, аб Мэтах ўстойлівага развіцця.

Спадзяёмся, што засвоеныя веды стануць добрым падмуркам для самарэалізацыі вас як грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Разам з тым жыццё ў сучасным свеце, які хутка змяняецца, патрабуе ад чалавека пастаяннага навучання, удасканалення сваіх ведаў, уменняў, навыкаў, кампетэнцый. Каб быць паспяховым, трэба шмат вучыцца. І тут вам спатрэбяцца навыкі, якім вы вучыліся на ўроках грамадазнаўства: шукаць і знаходзіць новую інфармацыю, крытычна яе ацэньваць і выкарыстоўваць для рашэння пастаўленай задачы.

Перад вамі стаіць няпростая задача выбару далейшага жыццёвага шляху. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для атрымання якаснай адукацыі, працаўладкавання, стварэння сям'і, найбольш поўнай рэалізацыі свайго патэнцыялу, сваіх планаў. Ва ўсіх ёсць роўныя, спрыяльныя стартавыя ўмовы для таго, каб стаць паспяховым і змяняць жыццё ў Беларусі да лепшага.

На парозе самастойнага, дарослага жыцця, узіраючыся ў будучыню, задумайцеся аб тым, як вашы асабістыя планы і задачы суадносяцца з задачамі, якія сёння рашаюцца ўсёй нашай краінай, усім беларускім народам. Сучаснае маладое пакаленне лічыцца больш прагматычным, чым папярэднія, але здаровыя амбіцыі, цвярозы погляд на жыццё, свабода ад ілюзій і пачуццё адказнасці за сваю сучаснасць і будучыню могуць быць добрымі памочнікамі ў самарэалізацыі і працы на карысць сваёй краіны. Поспехаў вам!



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Асноўныя паняцці

**Адміністрацыйнае права** — галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць грамадскія адносіны, якія ўзнікаюць у працэсе арганізацыі і ажыццяўлення дзяржаўнага кіравання.

**Адміністрацыйнае правапарушэнне** — супрацьпраўнае вінаватае дзеянне (дзеянне або бяздзеянне) фізічнай асобы, а таксама супрацьпраўнае дзеянне юрыдычнай асобы, за якое ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасць.

**Геапалітыка** — тэорыя, якая сцвярджае залежнасць палітыкі дзяржавы ад геаграфічных фактараў (клімат, прыродныя рэсурсы, тэрыторыя, насельніцтва і інш.), або вучэнне аб геаграфічнай абумоўленасці палітычных з'яў.

**Гендарная палітыка** — палітыка, накіраваная на дасягненне роўнасці мужчын і жанчын, устанаўленне гендарнага балансу ва ўсіх сферах жыцця грамадства.

**Глабалізацыя** — працэс усебаковага збліжэнія розных краін і станаўлення адзінай сістэмы тэхналагічных, фінансавых, эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных сувязей на аснове найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

**Грамадзянскае права** — галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць адносіны паміж грамадзянамі і арганізацыямі (юрыдычнымі асобамі), накіраваныя на задавальненне іх уласных (асабістых) патрэб і інтарэсаў.

**Грамадзянская дзеяздольнасць** — здольнасць сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць грамадзянскія правы, ствараць для сябе грамадзянскія абавязкі і выконваць іх.

**Грамадзянская праваздольнасць** — здольнасць мець грамадзянскія правы і абавязкі, у тым ліку здольнасць мець маёмасць па праву ўласнасці, атрымліваць маёмасць у спадчыну, займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, заключаць дагаворы і г. д.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Гуманізм** — сістэма поглядаў, згодна з якой прызнаецца каштоўнасць чалавека як асобы, яго права на свабоду, шчасце і развіццё.

**Дэмаграфічная бяспека** — стан абароненасці грамадства і дзяржавы ад дэмаграфічных пагроз.

**Дэмаграфічная палітыка** — сістэма мер, якія ажыццяўляюцца дзяржавай у адносінах да пэўных груп грамадства з мэтай фарміравання дэмаграфічнай структуры ў адпаведнасці з яе нацыянальнымі дэмаграфічнымі інтарэсамі і гарантавання дэмаграфічнай бяспекі краіны.

**Інавацыі** — любыя новыя ідэі, рэалізаваныя на практыцы; новаўвядзенні, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці чалавечай дзейнасці.

**Інавацыйная палітыка** — сукупнасць метадаў уздзеяння дзяржавы на вытворчасць з мэтай выпуску новых відаў прадукцыі і тэхналогій, а таксама пашырэння рынкаў збыту айчынных тавараў.

**Інфармацыйнае грамадства** — грамадства, у якім вытворчасць і спажыванне інфармацыі з'яўляюцца найважнейшым відам дзейнасці і найбольш значным рэсурсам грамадскага развіцця.

**Інфармацыйная бяспека** — стан абароненасці інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы.

**Канстытуцыйнае права** — галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць найважнейшыя грамадскія адносіны.

**Канфесійная палітыка** — мэтанакіраваная дзейнасць дзяржаўных структур, якая мае на мэце ўсталяванне адносін цярпімасці і павагі паміж грамадзянамі, рэлігійнымі арганізацыямі розных веравызнанняў.

**Крымінальнае права** — галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што вызначаюць найбольш небяспечныя для ўсталяванай сістэмы грамадскіх адносін учынкі — злачынствы і ўстанаўліваюць за іх пакаранні або іншыя меры крымінальнай адказнасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Маладзёжная палітыка** — сістэма сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных, прававых і іншых мер, якія накіраваны на падтрымку маладых грамадзян і ажыццяўляюцца дзяржавай з мэтай сацыяльнага станаўлення і развіцця моладзі, найбольш поўнай рэалізацыі яе патэнцыялу ў інтарэсах усяго грамадства.

**Міграцыйная мабільнасць** — перамяшчэнне індывідаў і сацыяльных груп у працэсе змены імі месца жыхарства.

**Міжнароднае гуманітарнае права** — сукупнасць прынцыпаў і прававых норм, што прымяняюцца ва ўзброеных канфліктах.

**Міжнародныя адносіны** — сукупнасць палітычных, эканамічных, прававых, дыпламатычных, ваенных, культурных і іншых сувязей паміж суб'ектамі, што дзейнічаюць на сусветнай арэне.

**Навукова-тэхнічны прагрэс (НТП)** — працэс пастyпальнага ўзаемазвязанага развіцця навукі, тэхнікі, вытворчасці і сферы спажывання.

**Нацыянальная бяспека** — стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз.

**Нацыянальная палітыка** — мэтанакіраваная дзейнасць дзяржаўных структур па рэгуляванні ўзаемаадносін паміж нацыямі, этнічнымі групамі.

**Пакаранне** — мера крымінальнай адказнасці, якая прымяняецца па прыгаворы суда да асобы, асуджанай за злачынства.

**Прагрэс** — пастyпальны рух да лепшага, больш складанага, дасканалага, ад ніжэйшых ступеняў да вышэйшых.

**Працоўнае права** — галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць працоўныя і звязаныя з імі адносіны, устанаўліваюць і абараняюць узаемныя правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў.

**Працоўны дагавор** — пагадненне паміж работнікам і наймальнікам, у адпаведнасці з якім работнік абавязваецца выконваць пэўную працоўную функцыю і правілы ўнутранага распарадку, а наймальнік абавязваецца забяспечваць работніка абумоўленай працоўным дагаворам працай, гарантаваць належныя ўмовы працы і своечасова выплачваць заработную плату.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Рэгіянальная палітыка** — дзейнасць органаў дзяржаўнай улады па забеспячэнні аптымальнага развіцця рэгіёнаў.

**Рэгрэс** — пераход ад больш высокіх форм развіцця да ніжэйшых, рух назад, дэградацыя, змены да горшага.

**Сямейнае права** — галіна права, якая ўяўляе сабой сукупнасць прававых норм, што рэгулююць асабістыя немаёмасныя і звязаныя з імі маёмасныя адносіны, якія ўзнікаюць паміж грамадзянамі (фізічнымі асобамі) на аснове шлюбу, сваяцтва, усынаўлення (удачарэння) і іншых форм уладкавання дзяцей на выхаванне ў сям'ю.

**Устойлівае развіццё грамадства** — задавальненне патрэб сучаснага пакалення без нанясення шкоды будучым пакаленням людзей.

**Цывілізацыі** — устойлівыя цэласныя культурна-гістарычныя супольнасці, якія вылучаюцца агульнасцю духоўных каштоўнасцей і культурных традыцый, падабенствам сацыяльна-палітычнага і матэрыяльна-вытворчага развіцця, асаблівасцямі ладу жыцця і пэўным тыпам асобы, агульнымі этнічнымі прыметамі і пэўнымі геаграфічнымі рамкамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Памяткі

## Памятка па бяспецы ў Сеціве

### 1 Пароль

**Звярніце ўвагу на паролі да сваіх акаўнтаў (сэрвісы электроннай пошты, сацыяльныя сеткі, інтэрнэт-банкінг і інш.).**

- **Выкарыстоўвайце складаныя паролі (камбінацыя лічбаў, вялікіх і маленькіх літар, знакаў).**
- **Выкарыстоўвайце двухфактарную аўтэнтыфікацыю для больш эфектыўнай абароны акаўнта ад нежаданага пранікнення.**
- **Рэгулярна абнаўляйце паролі пры выкарыстанні акаўнтаў.**

### 2 Асабістая інфармацыя

**Звярніце ўвагу на тое, якая інфармацыя пра вас з’яўляецца агульнадаступнай і як абаронены вашы персанальныя даныя.**

- **Праверце інфармацыю пра вас, якая даступна незнаёмым людзям (дата нараджэння, месца жыхарства, тэлефон, адрас электроннай пошты, месца працы, даходы вашай сям’і і інш.).**
- **Праверце інфармацыю пра вашу актыўнасць у Сеціве (далучэнне да груп без вашай згоды і інш.).**
- **Праверце інфармацыю аб дадатках, якія маюць доступ да вашых персанальных даных (праходжанне тэстаў, апытанняў і інш.).**

**Пасля праверкі выдаліце неактуальныя дадаткі, унясіце неабходныя карэктывы ў настройкі свайго акаўнта.**

### 3 Доступ

**Звярніце ўвагу на выкарыстанне сетак Wi-Fi і чужых устройстваў.**

- **Складзіце забарону на выкарыстанне грамадскіх сетак Wi-Fi пры інтэрнэт-пакупках з увядзеннем пароляў.**
- **Абавязкова выходзьце са сваіх акаўнтаў у сацыяльных сетках і сэрвісах элетроннай пошты пры выкарыстанні чужога камп’ютара ці смартфона.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



# Памятка для праверкі фатаграфіі ў Сеціве

## 1 Навошта правяраем?

- Вызначаем дакладнасць фатаграфіі.
- Абараняем сябе ад фэйкаў.

## 2 Што правяраем?

- Дату апублікавання аўтэнтычнай фатаграфіі (ці адлюстроўвае фота падзею, для ілюстравання якой яно выкарыстана).
- Месца, адлюстраванае на фатаграфіі (ці дакладна фота адлюстроўвае месца, пазначанае ў тэксце або апісанні).
- Асоб на фатаграфіі (ці рэальныя гэта людзі, ці маглі гэтыя людзі знаходзіцца ў дадзены час у дадзеным месцы).
- Змяненні фатаграфіі (ці зведала фатаграфія апрацоўку і карэкцыю з дапамогай камп'ютарных праграм або вэб-сэрвісаў).

## 3 Як правяраем?

- Правяраем метаданыя выявы (вывучаем уласцівасці файла, якія звычайна ўтрымліваюць інфармацыю пра дату і месцы здымак, дату рэдагавання фота).
- Выкарыстоўваем вэб-сэрвісы для праверкі фатаграфій (пошук па выявах у сістэмах Google і Яндэкс, спецыялізаваныя сэрвісы для праверкі TinEye, Wikimapia і інш.).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



## Памятка для працы з рэйтынгамі ў медыя

1. Знайдзіце і параўнайце загалоўкі розных медыяпаведамленняў, у якіх публікуюцца вынікі міжнароднага рэйтынгу ў пэўнай галіне.
2. Вызначце, як у розных медыя прадстаўлена інфармацыя аб міжнародным рэйтынгу (нейтральна, станоўча, адмоўна).
3. Праверце, ці ёсць у публікацыі спасылкі на крыніцу інфармацыі.
4. Знайдзіце афіцыйную крыніцу — вэб-сайт, на якім публікуюцца даныя гэтага рэйтынгу.
5. Праверце дакладнасць інфармацыі і актуальнасць рэйтынгу. Зрабіце высновы пра якасць інфармацыі ў публікацыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Памятка па пошуку і праверцы інфармацыі ў інтэрнэце

## 1 Што шукаем?

Пазначайце фармат файла, у якім можа захоўвацца інфармацыя (html-старонка, дакумент pdf, аўдыя ў фармаце mp3, відэа ў фармаце avi і інш.).

## 2 Дзе шукаем?

Удакладняйце: у блогах, у навінах, у слоўніках, у кнігах, у Вікіпедыі, у архівах інтэрнэту і інш.

## 3 Як шукаем?

Змяняйце: пошукавыя сістэмы (Google, Яндэкс, Yahoo!, Bing і інш.).

## 4 Пра што сведчыць адрас сайта?

- Канчаткі .by, .ua, .ru, .kz, .pl, .lt указваюць на прыналежнасць дамена краіне.
- Канчатак .gov даецца сайтам дзяржаўных органаў і ўстаноў.
- Канчаткі ўказваюць на пэўную тэматыку сайта (.mil — ваенная, .edu — адукацыйная, .shop — гандлёвая).
- Канчатак назвы сайта .com указвае на прыналежнасць да камерцыйнай арганізацыі, канчатак .org — да некамерцыйнай.

## 5 На што звярнуць увагу?

- Максімальна канкрэтызуйце запыт, пазбягайце памылак у запыце, выкарыстоўвайце розныя камбінацыі слоў у запыце, словы-сінонімы.
- Правярайце дату стварэння сайта і абнаўлення кантэнту на ім. Выкарыстоўвайце рэсурс http://archive.org.
- Выкарыстоўвайце сэрвісы для праверкі ўнікальнасці тэксту (антыплагіят).
- Крытычна стаўцеся да знойдзенай інфармацыі, правярайце яе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Змест

**Уводзіны** ... 3
Устойлівае развіццё — ідэал прагрэсу XXI стагоддзя ... 3

**I. Станаўленне інфармацыйнай цывілізацыі** ... 8
§ 1. Прагрэс і рэгрэс у сацыяльным развіцці ... 9
§ 2. Ступені грамадскага развіцця ... 21
§ 3. Цывілізацыя як культурна-гістарычны працэс ... 30
§ 4. Гарызонты інфармацыйнага грамадства ... 39
§ 5. Глабалізацыя ... 49
Абагульненне па раздзеле
«Станаўленне інфармацыйнай цывілізацыі» ... 58

**II. Беларусь у сусветным супольніцтве** ... 62
§ 6. Сусветнае супольніцтва ў XXI стагоддзі ... 63
§ 7. Устойлівае развіццё — мадэль развіцця XXI стагоддзя ... 71
§ 8. Прававыя асновы міжнародных адносін ... 81
§ 9. Геапалітычнае становішча і нацыянальныя інтарэсы
Рэспублікі Беларусь ... 91
§ 10. Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін ... 101
Абагульненне па раздзеле
«Беларусь у сусветным супольніцтве» ... 113

**III. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь** ... 116
§ 11—12. Канстытуцыйнае і выбарчае права ... 117
§ 13. Асновы грамадзянскага права ... 129
§ 14. Асновы сямейнага права ... 138
§ 15. Асновы працоўнага права ... 147
§ 16. Асновы адміністрацыйнага права ... 159
§ 17. Асновы крымінальнага права ... 169
§ 18. Органы забеспячэння законнасці і правапарадку
ў Рэспубліцы Беларусь ... 179
Абагульненне па раздзеле
«Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь» ... 191

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**IV. Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы** ........ 194
§ 19—20. Дынаміка складу насельніцтва і сацыяльная палітыка дзяржавы ........ 195
§ 21. Інавацыйнае развіццё краіны ........ 208
§ 22. Развіццё рэгіёнаў ........ 219
§ 23. Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі ........ 226
Абагульненне па раздзеле «Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы» ........ 239

**Выніковае абагульненне** ........ 242

**Заключэнне** ........ 244

**Асноўныя паняцці** ........ 245

**Памяткі** ........ 249
- Памятка па бяспецы ў Сеціве ........ 249
- Памятка для праверкі фатаграфіі ў Сеціве ........ 250
- Памятка для працы з рэйтынгамі ў медыя ........ 251
- Памятка па пошуку і праверцы інфармацыі ў інтэрнэце ........ 252

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вучэбнае выданне

**Чупрыс** Вольга Іванаўна,
**Балашэнка** Сяргей Аляксандравіч,
**Дзенісюк** Ніна Паўлаўна і інш.

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам
для павышанага ўзроўню)

Выкарастаны:
ілюстрацыі У. Варэцы і Л. Варэцы, Л. Маспанавай,
МІА «Расія сёння», фотабанка shutterstock.com;
фотаматэрыялы В. Ахрымені, Д. Бахіры, БелТА, П. Гарадцова, ГАУС г. Наваполацка,
В. Дняпроўскага, выдавецкага дома «Беларусь сёння», выдавецтва АСТ, А. Клешчука,
Л. Маспанавай, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага банка
Рэспублікі Беларусь, А. Вогневай (aif.by), С. Плыткевіча, фотабанка shutterstock.com;
belarus.by/ru, hatka.by, kepoin-dong.blogspot.com, klikabol.mirtesen.ru; Logograph,
Mmkpa/wikimedia.org; MyShared.ru, nationalcultures.by, sdgs.by, worldvaluessurvey.org

Лагатыпы і таварныя знакі, выявы, гандлёвыя маркі, фірмовыя найменні
і іншыя сродкі ідэнтыфікацыі трэціх асоб, прадстаўленыя на старонках 36, 43, 45, 46, 219,
прызначаны для выкарыстання выключна з адукацыйнымі і інфармацыйнымі мэтамі,
не з’яўляюцца рэкламай і з’яўляюцца ўласнасцю іх праваўладальнікаў

Рэдактары *С. В. Зелянко, І. А. Стральчук*
Дызайн і вёрстка *Л. А. Маспанавай*
Карэктар *Т. В. Басалыга*

Падпісана да друку 25.08.2021. Фармат 70 × 90 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 18,72. Ул.-выд. арк. 14,0 + 27,1 электрон. дадат. Тыраж 10 500 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск. Тэл. 360-43-65, тэл./факс 360-37-70.
www.pshop.by; e-mail: aiv@aiv.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне